Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

№ 17 (4408) 27 красавіка 2007 г.

У нумары:

Змагары з агульным болем

Размова з Уладзімірам Чэрнікавым — кіраўніком Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС

Стар. 4

Аднойчы летам...

Пра тое, як чарнобыльская трагедыя азвалася ў сэрцы паэта Паўла Вераб'ёва

Стар. 5

«Крыж ігуменні»

Кінасцэнарый фільма пра Еўфрасінню Полацкую

Стар. 12

Мова дрыбінскіх катрушнікаў

На Беларусі ёсць мова, зразумелая толькі вузкаму колу людзей. Ці не беларускае «эсперанта» гэта?!

Стар. 14

Ad disputandum

Радыкальна новая лімаўская рубрыка. Сёння — гаворка пра беларускае кіно: ёсць яно ці яго няма?

Стар. 15

ПАДПІСАЦЦА НА ШТОТЫДНЁВІК «ЛіМ» МОЖНА З ЛЮБОГА МЕСЯЦА

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 4500 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 5800 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Льготная падпіска: 1 месяц — 4700 руб.
Падпісны індэкс — 63880

Нашчадкі знакамітых літаратараў

Нядаўна ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася беларуска-ўкраінская літаратурная вечарына "Нашчадкі славутых людзей", у якой разам з Міхасём Міцкевічам (сынам народнага песняра Беларусі Якуба Коласа), прынялі ўдзел родзічы знакамітых украінскіх майстроў мастацкага слова. Сярод іх — Тарас Лысенка (прапраўнук Тараса Шаўчэнкі), Максім (унук Максіма Рыльскага), Таццяна Сасноўская (пляменніца Паўло Тычыны). Сустрэча праходзіла ў межах святкавання 125-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа.

Жыццёвыя шляхі-пуцявіны звялі разам нашчадкаў вялікіх песняроў усходнеславянскіх народаў: сваяк Шаўчэнкі — студэнт Кіеўскага педуніверсітэта, вывучае гісторыю і права, унук Рыльскага — журналіст, сын Коласа — вядомы навукоўца... Ды ўсе яны помняць пра тое, што менавіта ім дасталася пачэсная місія — несці светач памяці пра сваіх славутых продкаў у асяродак сучаснікаў.

Па словах Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Ігара Ліхавога, "народныя пісьменнікі і паэты з'яўляюцца сэрцам народа і яго прарокамі. Такіх першапраходцаў Бог дасылае людзям у драматычныя і трагічныя часы, каб прарокі, якія дасягнулі вяршынь духоўнасці, змаглі б павесці за сабою нацыю."

Сімвалічным на сустрэчы стаўся падарунак украінскай дэлегацыі. Нашчадкі ўкраінскіх класікаў прывезлі ў Беларусь вечназялёны барвенак з Тарасавай гары, што пад Каневым (Чаркаская вобласць), дзе ля Дняпра знаходзіцца магіла Тараса Шаўчэнкі. Цяпер расліна будзе квітнець у дворыку музея Якуба Коласа. Менавіта барвенак, па словах Ігара Ліхавога, найчасцей узгадваецца ў народнай і літаратурнай творчасці ўкраінцаў...

Для многіх такія літаратурныя сустрэчы — сапраўды новая з'ява. Як зазначыў у размове Міхась Міцкевіч, дагэтуль сяброўства з нашчадкамі вядомых паэтаў і пісьменнікаў у яго не было, а міжнародныя сувязі датычыліся, у асноўным, навуковага асяроддзя. Таксама ён падкрэсліў, што ў Коласа засталася вялікая колькасць родзічаў...

Мерапрыемства было аздоблена спевамі на беларускай і ўкраінскай мовах, якія выканалі калектывы мастацкай самадзейнасці аддзела культуры Стаўбцоўскага раёна і цэнтра ўкраінскай культуры "Січ" г.Мінска. Шмат гучала ўспамінаў пра жыццё і творчасць класікаў двух народаў. Да ўрачыстай сустрэчы музейшчыкі-коласаўцы разам з прадстаўнікамі Кіеўскага літаратурна-мемарыяльнага музея Максіма Рыльскага ды Кіеўскага літаратурна-мемарыяльнага музея Паўло Тычыны падрыхтавалі выставу "Дружба, пранесеная праз гады", дзе ў лістах, тэлеграмах, кнігах з дарчымі надпісамі, рэдкіх фотаздымках паказаны цёплыя сяброўскія адносіны беларускага класіка з украінскімі братамі па пяры. Шчырымі словамі пазначана перапіска Коласа і Рыльскага, у якой адчуваецца непадробнае сяброўства паэтаў. Найбольш цікавы экспанат выставы "Дружба, пранесеная праз гады" — кажух. Як высветлілася, гэта менавіта той кажух, які накідваў Якуб Колас на Максіма Рыльскага падчас яго пасляабедзеннага адпачынку — тады, калі ўкраінскі пясняр гасцяваў тут, у Якуба Коласа. Увогуле ж выстава была задумана так, каб паказаць не толькі сувязь літаратараў, але і людскую еднасць двух славянскіх народаў.

Звычайна вялікія людзі пакідалі нашчадкам свой слушны запавет. Па словах Міхася Міцкевіча, запаветам Якуба Коласа сваім нашчадкам з'яўляюцца словы: "Быць грамадзянінам!"

Уладзімір ШУГАВЕЕЎ

Фота К.Дробава

***НА ЗДЫМКУ:** дырэктар музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская, унук Максіма Рыльскага Максім Рыльскі, дырэктар Літаратурна-мемарыяльнага музея Паўло Тычыны, сваячка паэта Таццяна Сасноўская, Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Ігар Ліхавы, народная артыстка Украіны Раіса Недашкоўская, дырэктар Літаратурна-мемарыяльнага музея Максіма Рыльскага Вікторыя Калеснік, прапрапраўнук Тараса Шаўчэнкі Тарас Лысенка, сын Якуба Коласа Міхась Міцкевіч.*

Творчы ўрок

Адбылася чарговая сустрэча супрацоўнікаў рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва" са сваімі чытачамі. Гэтым разам намеснік галоўнага рэдактара газеты "Літаратура і мастацтва" Мікалай Станкевіч, загадчык аддзела крытыкі ўзгаданага выдання Леанід Галубовіч і загадчык аддзела паэзіі часопіса "Маладосць" Віка Трэнас наведаліся ў СШ № 72 горада Мінска. На мерапрыемстве прысутнічалі дырэктар школы Аляксей Гарадовіч, настаўнікі і вучні старэйшых класаў.

Да слова, пасля адкрыцця ў 1961 годзе школа на той час стала першай у сталіцы, якая атрымала статус навучальнай установы з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы. А дваццаць два гады таму — першай у Партызанскім раёне з беларускай мовай навучання. Акрамя гэтага, яна з мастацкім ухілам. А яшчэ — выпрацоўваецца дапрофільнае навучанне, бо ў Дражні шмат сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў ды тэхнікумаў, з якімі школа заключыла дамову аб супрацоўніцтве.

Выступаючы перад вучнямі, Мікалай Станкевіч узгадаў свае школьныя гады, распавёў пра 75-гадовую гісторыю існавання "ЛіМа", азнаёміў з рубрыкамі газеты, публікацыямі. А яшчэ Мікалай Пятровіч паведаміў пра агульнарэспубліканскі конкурс сачыненняў "Мая Беларусь" сярод школьнікаў, студэнтаў і моладзі краіны, які праводзіцца штотыднёвікам. "Я ўпэўнены, вы ведаеце, любіце і шануеце родную мову, а газета — узор гэтай мовы", — падкрэсліў М. Станкевіч.

Леанід Галубовіч у сваім выступленні спыніўся на пытанні паўсядзённага ўжывання навучэнцамі роднай мовы, расказаў пра працу аддзела крытыкі і падарыў кнігі Васіля Гадулькі. У сваю чаргу Віка Трэнас азнаёміла прысутных з рубрыкамі, раздзеламі і аўтарамі часопіса "Маладосць" і запрасіла старшакласнікаў да супрацоўніцтва.

Таксама Віка Трэнас ды Леанід Галубовіч чыталі ўласныя вершы, якія ўсім вельмі спадабаліся.

В. К.

Фота аўтара



У «Вясёлкі» — дзесяць пяцёрак

Уручэннем узнагарод у канферэнц-зале Міністэрства інфармацыі Беларусі распачалося святкаванне паўвекавога юбілею часопіса «Вясёлка» на дзяржаўным узроўні. Міністр інфармацыі краіны Уладзімір Русакевіч на сустрэчы з аўтарамі і сябрамі выдання зачытаў прывітальнае пісьмо Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі калектыву рэдакцыі, зазначыўшы, што пяцідзесяцігоддзе любімага самымі маленькімі чытачамі часопіса прыпадае якраз на Год дзіцяці.

Выданне стала надзейным памочнікам і дарадчыкам для настаўнікаў краіны, сапраўднай крыніцай творчых ідэй, у тым ліку і для многіх выхавацеляў дзіцячых устаноў. Прысутны на ўрачыстасці старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец падкрэсліў: вясёлкаўцы хоць і пішуць пра дзяцей, але робяць справу дзяржаўную — вучаць іх любіць краіну, паважаць дарослых, ведаць мову.

Падчас імпрэзы адбылося ўручэнне шматлікіх узнагарод: граматамі міністэрстваў інфармацыі, культуры, адукацыі былі адзначаны таленавітыя творцы, штатныя і пазаштатныя аўтары выдання, работнікі дзіцячых устаноў — так што ніхто з прысутных не застаўся незаўважаным. Нагрудным знакам «Выдатнік друку» ўганараваныя галоўны рэдактар выдання Уладзімір Ліпскі, рэдактар аддзела Уладзімір Мазго, пісьменнік, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Нёман» Міхась Пазнякоў.

Сярод узнагароджаных і яшчэ два супрацоўнікі РВУ «Літаратура і Мастацтва» Алесь Бадак ды Мікола Мятліцкі.

Апрача згаданых грамат дзяржаўных устаноў, пісьменнікам і журналістам, чыноўнікам уручаліся кнігі — нядаўна выдадзены пяты том выбранага «Вясёлкі». А ганаровым уладальнікам распрацаванай у часопісе ўзнагароды — медаля Васіля Віткі — стаўся міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч.

Напярэдадні святочных дзён у рэдакцыі разгледзелі прапанаваны супрацоўнікам праект скульптуры Васі Вясёлкіна — галоўнага героя выдання. Мяркуецца, што скульптуру установяць перад новым будынкам, куды хутка пераедзе рэдакцыя дзіцячага часопіса. Цяпер шукаюцца сродкі на ажыццяўленне задумы.

Ірына ТУЛУПАВА

На здымку: галоўны рэдактар часопіса "Вясёлка" У. Ліпскі і міністр інфармацыі Беларусі У. Русакевіч.

Фота К. Дробава

Традыцыйна 18 красавіка кожнага года грамадства звяртаецца да праблем захавання значных архітэктурных краявідаў. Нагода — Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясцін. Напярэдадні свята на пытанні журналістаў адказаў начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Васіль АБЛАМСКІ.

Не забываць пра помнікі

У мінулыя часы ў Беларусі, як і ў іншых рэспубліках СНД, было ўстаноўлена шмат помнікаў лідэрам савецкай эпохі (Леніну, Сталіну і інш.) Але пасля развалу СССР помнікаў стала значна менш. Як зазначыў Васіль Яўгенавіч, наша краіна пазбегла іх масавага знішчэння, засталіся тыя, што маюць культурную каштоўнасць. Як, напрыклад, на плошчы Незалежнасці ля Дома ўрада. Многія з іншых ленінскіх манументальных выяў каштоўнасці не мелі, бо вырабляліся паточным спосабам...

Не адзін год запар напярэдадні Дня помнікаў уздымаецца праблема адказнасці за нядбайнае правядзенне будаўнічых і рэканструкцыйных работ паблізу гісторыка-культурных аб'ектаў. Васіль Абламскі падкрэсліў: па многіх фактах праводзяцца аператыўна-следчыя мерапрыемствы, а Міністэрства культуры выносіць прадпісанні арганізацыям за нанесеную шкоду.

Анатоль ВАСІЛЬЧАНКА

Фота аўтара

Ушанавалі класікаў

У дзень памінання спачылых — Радаўніцы — група творцаў Саюза пісьменнікаў Беларусі наведала ваенныя могілкі Мінска, каб пакланіцца нашым славутым землякам Янку Купалу ды Якубу Коласу, схіліць галовы перад класікамі, якія сваім словам будзілі розум і свядомасць беларусаў.

Ускласці кветкі да помнікаў таленавітым песнярам прыйшлі сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі Г. Марчук, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ М. Пазнякоў, а таксама В. Лукша, Л. Лукша, А. Савіцкі, Н. Гальпяровіч, Я. Каршукоў, І. Качаткова ды інш.

Цёплым сонечным днём ля помнікаў чыталіся вершы, гучалі шчырыя словы ўдзячнасці нашым знаным майстрам слова, у творах якіх шчодра адлюстраваныя беларускія традыцыі. Пра тое, што Янка Купала ды Якуб Колас і цяпер з'яўляюцца ўзорам служэння свайму народу, літаратуры, яшчэ раз падкрэсліў ва ўступным слове В. Лукша. На своеадметнасці і дасціпнасці беларускага слова —вуснага ды пісьмовага, мастацкага і паэтычнага — акцэнтавалі ўвагу Н. Гальпяровіч, Г. Марчук, М. Пазнякоў, згадаўшы, што лепшыя традыцыі айчыннага пісьменства працягваюць і сучасныя аўтары. Між іншым, толькі Мінская гарадская арганізацыя налічвае сёння 180 літаратараў.

Ул. інф.

Фота К. Дробава

Сустрэнемся на выставе

Вядучыя журналісты нашай краіны, кіраўнікі творчых калектываў, электронных ды друкаваных сродкаў масавай інфармацыі рыхтуюцца да выставы «СМІ ў Беларусі». Гэты штогадовы міжнародны спецыялізаваны форум збірае айчынных і замежных творцаў, хто неабыякавы да сучасных падзей, становіцца іх непасрэдным сведкам і ўдзельнікам. Традыцыйна выстава прымяркоўваецца да Дня друку, і сёлета пройдзе з 2 па 5 мая ў Нацыянальным выставачным цэнтры БелЭКСПА.

Стэнд РВУ «Літаратура і Мастацтва» агульнай плошчай 6 кв.м размесціцца за галоўнай сцэнай справа, на ім нават здалёк лёгка распазнаюцца 5 шыльдаў — адмыслова кожнага з выданняў: часопісаў «Нёман», «Полымя», «Всемирная литература», «Маладосць» і газеты «ЛіМ». Там жа гледачы змогуць азнаёміцца з выставай шаржаў А. Карповіча.

У першы дзень, 2 мая пасля ўрачыстай цырымоніі адкрыцця форуму ў 16-00 адбудзецца прэзентацыя рэдакцыйна-выдавецкай установы (складаецца праграма, адным з удзельнікаў якой стане спявак Якаў Навуменка), пасля чаго сваімі планамі падзеляцца лімаўцы. А. Зэкаў і М. Шабовіч прадставяць жанр літаратурнай пародыі.

3 мая ў 13-30 павядуць рэй аўтары і супрацоўнікі часопісаў «Нёман» і «Всемирная литература». Пісьменнікі ды літаратары, сярод якіх будуць А.Савіцкі, А.Кажадуб, рускі паэт А.Казанцаў, збяруцца на галоўнай сцэне выставы. Там жа ў 10 раніцы наступнага дня, 4 мая можна будзе пазнаёміцца, параіцца і паспрачацца з творцамі, хто сёння шчыруе ў часопісах «Полымя» і «Маладосць».

Прыходзьце на выставу і не прамініце стэнд літаратурных выданняў РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Ярына РЫТАМІНСКАЯ

Папаўняюцца бібліятэчныя фонды

У Нацыянальную бібліятэку Беларусі паступілі дзесяць калекцый кніг, найперш —лепшыя класічныя творы рускай літаратуры і краін Садружнасці, навучальная літаратура, кнігі, якія адлюстроўваюць апошнія тэндэнцыі ў гістарычнай, сацыялагічнай, філалагічнай ды іншых гуманітарных навуках, а таксама сучасная літаратура. Кнігі перададзеныя фондасховішчам краіны, выканаўчым камітэтам СНД.

Плануецца, што часткова выданні будуць накіраваны ў Гомельскую абласную універсальную бібліятэку імя У.І. Леніна, сельскую бібліятэку аграгарадка "Александрыя", Гродзенскую бібліятэку імя Я.Ф. Карскага, Брэсцкую абласную бібліятэку імя А.М. Горкага і іншыя.

Праект, у рамках якога адбылася акцыя, мае назву "Гуманітарная прастора краін СНД" і рэалізуецца за кошт пазабюджэтных сродкаў.

Марыя ГУЦАЛА

Усё пачалося з невялікага паведамлення ў Інтэрнеце: напрыканцы 2006 года ў Вільнюсе выйшла кніга «Напалеон Орда. Літоўскі архітэктурны пейзаж». Аўтар Вітаўтас Левандаўскас — вядомы гісторык.



У Брэсце — літоўскі фаліянт

А пасля дырэкцыя Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М.Горкага звязалася з пасольствам Беларусі ў Літве, і дарадчык пасольства па культуры пагадзілася адшукаць неабходны экземпляр. Далей былі тэхнічныя складанасці — каб набыць у суседняй дзяржаве за яе валюту кнігу, давялося зрабіць дадатковыя крокі.

Дагэтуль такая кніга ў нашай краіне была прадстаўленая толькі на навуковых чытаннях, прысвечаных юбілею Напалеона Орды ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Цяпер акрамя галоўнага кнігасховішча краіны такі ж асобнік мае і Брэсцкая абласная бібліятэка. Выданне цікавае найперш гісторыкам, вучоным, краязнаўцам.

Аўтар запэўнівае: многія з ілюстрацый і звестак, змешчаных у кнізе, публікуюцца ўпершыню. Як вядома, Н. Орда пакінуў больш за тысячу акварэляў і графічных прац, дзе адлюстраваны архітэктурныя ансамблі і сядзібы вядомых людзей Беларусі, Украіны, Літвы, Польшчы, Алжыра, Германіі, Францыі, Іспаніі, Партугаліі ды іншых краін Еўропы.

Брэстаўчан жа больш зацікавілі тыя накіды Орды, якія ён рабіў на тэрыторыі вобласці. Сярод многіх знаёмых ілюстрацый тут знайшліся і сапраўды дагэтуль невядомыя: да прыкладу, Кобрынскі астрог і камера, у якой знаходзіўся мастак.

— Мы збіраем пра Напалеона Орду ўсё — ад невялічкіх інфармацый у газетах да такіх фаліянтаў, як гэты, — зазначыла карэспандэнту «ЛіМа» намеснік дырэктара бібліятэкі Ала Мяснянкіна. — Сярод тых, хто працуе па гэтай тэме — таксама Леанід Несцярчук, аўтар шматлікіх кніг па гісторыі архітэктуры і ахове помнікаў ў Брэсце, і Віталь Клімчук, у якога была кніга пра Напалеона Орду, разлічаная найперш на моладзь. На жаль, да двухсотгоддзя мастака і кампазітара новай кнігі ў нас не з'явілася, хаця даследаванні вядуцца. А вось літоўскія калегі падрыхтавалі навінку своечасова.

Дарэчы, арганізуючы юбілейную выставу, прысвечаную Н.Орду, тут прэзентавалі ўсе архіўныя матэрыялы, у тым ліку і прадастаўленыя ды падораныя бібліятэцы польскімі калегамі.

Вытокі ж гісторыі краю тут вывучаюць у школах па адмысловым прадмеце — Брэстазнаўства.

Ірына ТУЛУПАВА

Фота В. Кавалёва

Чароўныя гукі

“Абуджэнне ў чалавеку духоўнага пачатку дапамагае яму ва ўсведамленні сябе асобай непаўторнай, выхаванню ў ім пачуцця дабрыні да сябе падобных — гэта справа першаступеннай важнасці. Будзе ў людской душы мір і парадак — будзе добрапрыстойна і ў нашым грамадстве.”

Уладыка Філарэт

У перыяд з 15 па 22 красавіка з бласлаўлення Уладыкі Філарэта прайшоў IX Міжнародны фестываль Праваслаўных Песняспеваў. У арганізацыі значнай культурнай падзеі вясны прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства культуры, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства адукацыі, вядомыя дзеячы культуры і мастацтва.

Хоць гэта мерапрыемства царкоўнае, у яго межах дэманструюць свае здольнасці і свецкія выканаўцы. Гэта павінна дапамагчы ім спасцігнуць асаблівасці царкоўных спеваў, павысіць узровень прафесійнага майстэрства.

Фестываль сабраў больш як 30 харавых калектываў, вучоных і музыкаў з Беларусі, Славакіі, Украіны, Балгарыі і іншых краін. Усе яны, акрамя асноўных конкурсных выступленняў, змаглі наведаць мастацкія выставы, вечарыны духоўнай паэзіі і аўтарскай песні, кінапаказы фільмаў праваслаўнай тэматыкі, а таксама прыняць удзел у навуковай канферэнцыі, прысвечанай вопыту мастакоў-рэстаўратараў.

Як зазначыў намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерый Гедройц, фестываль паспрыяў вырашэнню задач духоўна-маральнага выхавання, якія вельмі актуальныя ў сучасным грамадстве. Гэтак жа як і многія іншыя культурна-духоўныя мерапрыемствы, што праводзяцца пры актыўным удзеле прадстаўнікоў Міністэрства культуры і Беларускай праваслаўнай царквы. А гэта акрамя фестывалю Дзень беларускага пісьменства і традыцыйныя экспедыцыі “Дарога да святыняў”, штогадовыя цырымоніі ўручэння прэмій “За духоўнае адраджэнне”, аднаўленне храмаў і інш.

Уладзімір ШУГАВЕЕЎ

Невымоўнае — у жывапісе

Сімвалічнай хвілінай маўчання распачалася цырымонія адкрыцця персанальнай выстаўкі беларускага мастака Сяргея Давідовіча ў Вільні, у палацы Літоўскага парламента.

Работы, прадстаўленыя ў экспазіцыі, адлюстроўваюць пачуцці, перажыванні, пакуты людзей, якія зведалі наступствы чарнобыльскага выбуху. І жалобнай хвілінай прысутныя на вернісажы ўшанавалі памяць ліквідатараў-чарнобыльцаў, усіх ахвяр трагедыі. У адкрыцці выстаўкі, арганізаванай па ініцыятыве пасольства нашай краіны ў Літоўскай Рэспубліцы, бралі ўдзел надзвычайны і паўнамоцны пасол Беларусі ў Літве Уладзімір Дражын, старшыня літоўскага сейма Віктарас Мунцянас, кіраўнікі дыпламатычных місій, парламентарыі, прадстаўнікі творчай грамадскасці Вільні, беларускай абшчыны ў Літве. У выступленнях адзначалася роля творчасці даравітага мастака ў грамадскім усведамленні чарнобыльскай трагедыі. Гаварылася пра неабходнасць рабіць высновы з мінулага і засвойваць урокі, садзейнічаць міжнароднаму супрацоўніцтву і скіроўваць высілкі на папярэджванне ўсялякіх катастроф.

Я. КАРЛІМА

На здымку: карціна С. Давідовіча “Чарнобыльская пастка”.
Фота К. Дробава

Калі ўзыходзіць «Маладзік»...

На пачатку красавіка пры бібліятэцы № 20 адбылося ўрачыстае адкрыццё літаратурнай студыі Кастрычніцкага раёна г. Мінска «Маладзік». Яе заснавальнікам з'яўляецца Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі, а кіраўніком — вядомы паэт Міхась Башлакоў, які, дарэчы, і вёў імпрэзу разам з маладой паэтэсай Ганнай Федарук.

На адкрыццё былі запрошаны прадстаўнікі літаратурных аб’яднанняў мінскіх ВНУ, выхаванцы літаратурнай студыі «Малінавыя галасы» і, вядома ж, усе аматары паэзіі, хто здолеў прыйсці ў будні дзень у бібліятэку. А такіх, трэба сказаць, аказалася нямала. Вялікая чытальная зала ледзьве ўмясціла ўсіх жадаючых.

Пасля выступлення дырэктара бібліятэкі С. Чабатар першым атрымаў слова кіраўнік літаратурнага аб’яднання «Крокі» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка паэт Мікола Шабовіч. Літаб’яднанне пры БДПУ, нязменным кіраўніком якога ён з’яўляецца вось ужо 28 гадоў, мае трывалыя традыцыі і адпаведна высокі мастацкі ўзровень, што і пацвердзілі выступленні выхаванцаў аб’яднання Веранікі Мандзік, Ірыны Чарняўскай і Ксеніі Шаржановіч. Трэба адзначыць, што маладыя паэтэсы ўжо не першы раз выступаюць у сценах 20-й бібліятэкі і заўсёды іх выступленні вельмі цёпла сустракаюць слухачы. Прачытаў свае вершы і сам Мікола Шабовіч, удала пацвердзіўшы неафіцыйны тытул «самага закаханага паэта Беларусі».

У працяг імпрэзы пра гісторыю літаратурнага аб’яднання Беларускага дзяржаўнага універсітэта расказаў ягоны кіраўнік, крытык, літаратуразнаўца і перакладчык Міхась Кенька. Ён прыгадаў вядомых літаратараў — выхаванцаў аб’яднання, расказаў пра яго мэты і задачы, складанасці і шляхі іх пераадолення.

Потым на вечарыне было прадстаўлена літаратурнае аб’яднанне Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта «Полистих», кіраўніком якога з’яўляецца паэт і перакладчык Андрэй Цяўлоўскі. Аб’яднанне, дарэчы, досыць маладое (заснавана ў мінулым годзе), але ўжо здольнае пахваліцца пэўнымі набыткамі. Публіка з прыемнасцю прыняла выступленні яго выхаванцаў Вольгі Юмашавай, Наталлі Томшынай, Аляксандра Жывулькі, Андрэя Кабана. Прачытаў свае вершы і кіраўнік аб’яднання А. Цяўлоўскі.

Таксама вынеслі свае творы на суд аўдыторыі ўдзельніца суполкі «Літаратурнае прадмесце» пры газеце «Советская Белоруссия» дзевяцікласніца Марыя Дварэцкая і член літаратурнай студыі «Малінавыя галасы» Ганна Федарук. Напрыканцы прачытаў свае вершы кіраўнік літаратурнай студыі «Малінавыя галасы» і студыі «Маладзік» Міхась Башлакоў.

Магчымасць прадэманстраваць свае здольнасці атрымалі і пачынаючыя паэты «Маладзіка».

За выдатную арганізацыю імпрэзы хочацца падзякаваць загадчыцы мінскай бібліятэкі № 20 Святлане Мікалаеўне Чабатар, намаганнямі якой паэты ўжо не ўпершыню маюць магчымасць сустрэцца з чытачамі ў гэтай гасціннай чытальнай зале, а сама бібліятэка на сённяшні дзень з’яўляецца бадай самай «паэтычнай» у Мінску.

Андрэй КАНСТАНЦІНАЎ

Сведчаннем — фота

80 здымкаў, зробленых за два “паслячарнобыльскія” дзесяцігоддзі, складаюць фотавыстаўку, якая так і называецца — “Пасля Чарнобыля”. Яна экспануецца ў французскім горадзе Клермон-Феран, пабраціме нашага Гомеля, і прымяркоўваецца да чарговай гадавіны аварыі на ЧАЭС. Аўтар гэтых работ — вядомы гомельскі фотамастак, фотакарэспандэнт БЕЛТА Сяргей Халадзілін.

Такая выстаўка наладжаная па ініцыятыве місіі знешнеэканамічных сувязей мэрыі Клермон-Ферана невыпадкова. Раней думалі, што Францыя зусім не зведала на сабе наступстваў чарнобыльскай аварыі. Ды некалькі гадоў таму і на пэўнай частцы тамтэйшай тэрыторыі выявілі радыеактыўныя ападкі, занесеныя чарнобыльскім ветрам. Вось і з’явілася ў французскіх пабраціміаў неабыякавае стаўленне да тэмы, балючай для гамяльчан, як і для ўсіх беларусаў. Дарэчы, С. Халадзілін і раней прадстаўляў за мяжой свае работы на чарнобыльскую тэматыку: на экалагічным форуме ў польскім горадзе Гданьску (1993) і на выстаўцы ў нямецкім Гамбургу (1996). Адметна, што побач з яго сёлетняй выстаўкай у Клермон-Феране разгарнулася экспазіцыя фатаграфій з японскага горада Нагасакі, дзе ядзерны выбух калісьці таксама пакінуў свой трагічны след.

С. Б.

Сустрэча са студэнтамі

Добрая традыцыя склалася ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце — запрашаць у госці да будучых кнігавыдаўцоў беларускіх літаратараў, чые кнігі, магчыма, ім з часам давядзецца ўласнаручна “пускаць у свет”. На адну з такіх сустрэч былі запрошаны паэты Змітрок Марозаў і Мікола Шабовіч. На працягу амаль дзвюх гадзін госці адкрывалі таямніцы сваёй творчасці, дзяліліся з прысутнымі (студэнтамі 1—2 курсаў і выкладчыкамі) новымі вершамі. Студэнты цікавіліся гісторыяй напісання першага верша, адносінамі аўтараў да рэлігіі, сімваламі Беларусі ў іх творчасці. Прыйшлося паэтам раскрыць гасцям і некаторыя сакрэты адносна прататыпаў іх лірычных вершаў. Сустрэча адбылася дзякуючы Вользе Аляксандраўне Кузьміч, якая яе арганізавала.

Надзея СЕНАТАРАВА

Лідэры ранішняга эфіру

Сёлета ў адной з самых папулярных перадач Першага канала юбілей. Дзесяць гадоў споўнілася праграме “Добрай раніцы, Беларусь!” На адзін з красавіцкіх эфіраў вядучыя запрасілі калег з друкаваных СМІ, сярод якіх быў і карэспандэнт “ЛіМа”.

Вялікая студыя і прыемныя вядучыя, з лагоднай усмешкай — усё гэта і шмат іншага дакладна характарызуе атмасферу ранішняга эфіру на Першым.

Пакуль доўжыўся эфір, давялося не толькі пазнаёміцца з вядучымі, асаблівасцямі іх працы, але і ў цёплых, амаль хатніх, эфірных умовах пакаштаваць самапечаных пірагоў. Дарэчы, вядучых у эфіры вы можаце ўбачыць папарна: Святлану Бароўскую і Аляксандра Паўлава, Вольгу Шлягер і Аляксандра Аўчыннікава, Вольгу Водчыц і Дзмітрыя Карася. Таксама ў “Добрай раніцы, Беларусь!” працуюць дзве вядучыя відэаагляду — Валянціна Мішанёва і Кацярына Купчанка ды шэраг журналістаў, якія свежымі і злабадзённымі сюжэтамі штораніцы спрабуюць абудзіць гледача.

Як паведамілі ў прэс-службе Белтэлерадыёкампаніі, за час існавання перадачы трансліравалася больш як 7200 гадзін эфіру, у ролі вядучых выступілі больш 40 чалавек. Сярод іх Павел Каранеўскі, Яўген Булка, Сяргей Кухто, Кірыл Слука, Алесь Круглякоў ды многія іншыя. За 10 год у гасцях у перадачы пабывала звыш 10 тыс. чалавек.

Пра некаторыя сакрэты тэлевытворчасці распавёў намеснік генеральнага прадзюсера Першага канала Аляксандр Капёнкін.

— “Добрай раніцы, Беларусь!” — першая ранішняя перадача на беларускім тэлебачанні, сапраўдная “кузня тэлевізійных кадраў”. Прыемна, што за апошнія 3 месяцы яе рэйтынг вырас больш як у 2 разы. Вынікі сацыялагічных даследаванняў паказваюць, што “Добрай раніцы, Беларусь!” па сённяшні дзень самы звыклы “тэлебудзільнік”.

Тут насамрэч працуюць людзі з вялікім журналісцкім вопытам. За 10 гадоў ім даводзілася праводзіць нават экстрэмальныя эфіры, ладзіць міжнародныя тэлемасты паралельна з некалькімі краінамі, арганізоўваць уключэнні з Алімпійскіх гульняў. Нашы тэхналагічныя здольнасці дапамагаюць усё гэта зрабіць на добрым узроўні.

Некалькі гадоў таму ў Славеніі пад эгідай Еўрапейскага вяшчальнага саюза праходзіў форум для кіраўнікоў ранішніх тэлеканалаў, на якім была прадстаўлена і наша краіна. Падыходаў да арганізацыі ранішняга вяшчання шмат. Ёсць непасрэдна інфармацыйныя праграмы (як BBC EuroNews, якія не трацяць час на забаўляльнае вяшчанне на пачатку дня). Але, як паказвае практыка, у краінах, дзе насельніцтва складае да 10 млн. чалавек, іншая глядацкая псіхалогія. Іх адрозніваецца якраз зацікаўленасць у забаўляльных сюжэтах. Хаця ўсе падыходы аб’ядноўваюць адно — ранішняя праграма павінна быць актуальнай, даць станоўчы эмацыянальны пасыл, выклікаць добры настрой, каб дзень у чалавека стаўся лёгкім і плённым.

Таксама нельга адназначна казаць пра форму падачы матэрыялаў у такіх праграмах — усё суб’ектыўна. У некаторых краінах — усяго адзін вядучы, у іншых — мода на пары. Менавіта апошняй прытрымліваюцца беларускія гледачы...

Пасля гутарак з вядучымі журналісты друкаваных СМІ атрымалі шанц самастойна паспрабаваць сябе ў ролі каманды “Добрай раніцы, Беларусь!” і зрабіць невялічкі кавалачак эфіру самастойна.

Сяргей ДУБОВІК
Фота аўтара

Паэзія любові

У Віцебскай абласной бібліятэцы адбылася прэзентацыя адразу дзвюх кніжак вершаў Тамары Красновай-Гусачэнкі — “Сложение жизни” і “Я пришла”. Яе паэзія вобразна багатая, а сама паэтка па-майстэрску валодае словам, умее тонка перадаць свае пачуцці і эмоцыі... Трэба адзначыць, што з кожным годам яе прафесійнае літаратурнае майстэрства заўважна расце і сталее. Апошнім жа па часе вершам Т. Красновай-Гусачэнкі характэрныя як прастата, так і філасофская заглыбленасць, асабліва калі аўтар разважае пра час і сябе.

У гэтым пераканаліся і ўдзельнікі сустрэчы. А гэта былі людзі дасведчаныя ў беларускай культуры і літаратуры: бібліятэкары горада, супрацоўнікі “Таварыства беларускай мовы”, музыканты і мастакі.

Тамара Іванаўна з’яўляецца старшынёй Віцебскага абласнога аддзялення ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі”, таму ёй даводзіцца шмат ездзіць па вобласці, ладзіць творчыя і літаратурныя вечары сяброў сваёй арганізацыі, прапагандаваць беларускае мастацкае слова ўвогуле.

Як і гэтым разам, на арганізаваных ёй вечарынах няма спакою і абыякавасці. Паэтка чытала шмат сваіх новых вершаў, у асноўным любоўную лірыку. Каханне ў вершах Т. Красновай-Гусачэнкі ўсёабдымнае, усёпаглынальнае, яно сцвярджае сілу і сэнс зямнога чалавечага жыцця. А яшчэ ў многіх вершах паэткі гучыць матыў грамадзянскай адказнасці і трывогі за гэты свет. Скразным лейтматывам яе паэзіі з’яўляецца абарона і захаванне нацыянальнай духоўнасці. “Нашай беларускай зямлі, зрэшты, як самому чалавеку, патрэбная абарона” — кажа Тамара Іванаўна, маючы на ўвазе шырокі аспект нашага цяперашняга жыцця.. Што ж, паэзія тут не апошні з найбольш надзейных абаронцаў.

Г. ЦУРБАНАВА,
загадчыца Віцебскай цэнтральнай гарадской дзіцячай і юнацкай бібліятэкі імя А. Гайдара

Страшэнная навала — Чарнобыль — сёлета паўналетняя нават па амерыканскіх законах: 26-га красавіка трагедыі спаўняецца дваццаць адзін. Сярод тых, хто ўжо трэцяе дзесяцігоддзе змагаецца з яе наступствамі — спецыялісты былога Камчарнобыля. Калісьці камітэт пры Савеце міністраў, сёння ён пераўтвораны ў Дэпартамент па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС пры Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях. З яго новым кіраўніком Уладзімірам ЧЭРНІКАВЫМ — наша размова.

Змагары з агульным болем

— Уладзімір Аляксандравіч, з чым звязаная неабходнасць рэструктурызацыі вашага ведамства — яго пераўтварэння ў Дэпартамент з камітэта? Якія змены адбыліся ў сувязі з гэтым?

— Рэарганізацыя была ажыццёўленая паводле Указа кіраўніка дзяржавы ад 5 мая 2006-га года №289 “Аб структуры Урада Рэспублікі Беларусь” у рамках мер па далейшай аптымізацыі структуры органаў дзяржкіравання. У сувязі з пераўтварэннем Камчарнобыля ў Дэпартамент пры МНС колькасць яго супрацоўнікаў зменшылася на 28 працэнтаў.

Такім скарочаным штатам выконваем амаль увесь ранейшы аб’ём работ. Сюды уваходзіць рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, распрацоўка і арганізацыя аналагічнай праграмы ў рамках Саюзнай дзяржавы на 2006—2010 гады, а таксама прасоўванне міжнародных чарнобыльскіх праектаў, супрацоўніцтва з Сусветным банкам.

— Ці існуюць нейкія адрозненні ў падыходах да рэабілітацыі/ кансервацыі забруджаных тэрыторый у Расіі, Беларусі і Украіне? Калі так, то ў чым яны заключаюцца? Наколькі вялікай перашкодай з’яўляюцца такія адрозненні для рэалізацыі Праграмы сумеснай дзейнасці па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы ў рамках Саюзнай дзяржавы?

— Вывад забруджаных зямель з сельскагаспадарчага ўжытку ў Беларусі, Расіі і Украіне адбыўся ў перыяд да 1992 года. Асноўным крытэрыем пры гэтым стаў узровень радыеактыўнага забруджвання глебы.

Праўда, падыходы трошкі адрозніваліся. Да прыкладу, ў Беларусі былі выключаны з абароту землі са шчыльнасцю забруджвання цэзіем-137 больш як 40 кюры на кв.км, ва Украіне — больш як 15 кюры на кв.км, а таксама землі з анамальна высокімі каэфіцыентамі пераходу радыенуклідаў.

Праграма ж Саюзнай дзяржавы не зыходзіць са спецыфічных асаблівасцей заканадаўства дзвюх краін. Напрыклад, у Расіі і Беларусі ёсць адрозненні ў дапушчальных узроўнях утрымання радыенуклідаў у харчовых прадуктах. Аднак яны нязначныя, і ў цэлым не ўплываюць на рэалізацыю Саюзнай праграмы.

— У праграме, што ўзгадана вышэй, гаворыцца: “У 2000-х гадах у Расіі і Беларусі забяспечана ўкараненне комплексу сучасных метадаў і тэхналогій, якія забяспечваюць зніжэнне ўтрымання радыенуклідаў у прадукцыі сельскай і лясной гаспардаркі”. У чым заключаюцца такія метады і як яны дзейнічаюць?

— У краіне яшчэ з пачатку 90-х склалася і дзейнічае сістэма ахоўных мер, якія пацвердзілі сваю эфектыўнасць не толькі ў навуковых эксперыментах, але і на практыцы. У прыватнасці, гэта ўнясенне падвышаных доз фосфарных і калійных угнаенняў, вапнаванне кіслых глеб, ужыванне гербіцыдаў — для таго, каб панізіць долю ручной працы пры апрацоўцы агароднінных культур. Таксама сюды ўваходзяць стварэнне культурных сенакосаў для жывёл, ужыванне для свойскіх жывёл камбікорму з цэзійвыпраменьваючым сарбентам, радыяцыйны кантроль прадукцыі, якая выпускаецца.

Створана даведачная сістэма па вядзенні лясной гаспадаркі на тэрыторыях Беларусі, якія забруджаны радыенуклідамі. База дадзеных “Радыеактыўнае забруджванне лясоў” налічвае поўную інфармацыю аб радыеактыўным становішчы ў лясах 53 лясгасаў, 490 лясніцтваў, больш чым 62 тысячах кварталах лесу.

З 1 верасня 2005-га ўведзена ў дзеянне “Методыка радыяцыйнага кантролю харчовай прадукцыі леса”, а таксама “Метадычныя рэкамендацыі па радыяцыйным абследаванні ўчасткаў ляснога фонду для нарыхтоўкі харчовай прадукцыі”. Для інфармавання насельніцтва выдадзены альбомы паштовак “Грыбы і радыяцыя”, “Ягады і радыяцыя”.

— Спажывец часта баіцца купляць тавары з тэрыторый, блізкіх да забруджаных. Наколькі абгрунтаваная яго боязь?

— Сістэма радыяцыйнага кантролю забяспечвае паступленне ў гандаль толькі нарматыўна чыстай прадукцыі. Кожная партыя прадукцыі, выробленай на забруджаных тэрыторыях, суправаджаецца дакументам, які пацвярджае яе адпаведнасць патрабаванням радыяцыйнай бяспекі.

У наш час атрыманы прагнозныя залежнасці каэфіцыентаў пераходу цэзію ў звяне “глеба—расліна”. Гэта значыць, што толькі пры наяўнасці інфармацыі аб шчыльнасці забруджвання сельскагаспадарчых угоддзяў і тыпах глеб можна прагназаваць, якая колькасць радыенуклідаў будзе пераходзіць з глебы ў расліну з цягам часу.

— Створаны адзіны беларуска-расійскі банк дадзеных па асноўных аспектах чарнобыльскай катастрофы. А хто можа скарыстаць інфармацыю, якую ён змяшчае?

— Доступ да банка дадзеных ажыццяўляецца без усялякіх абмежаванняў праз Інтэрнет на старонцы http://rbic.ibrae.ru/RBIC.

— Вядома, што распрацаваныя праграма і методыка маніторынгу сацыяльна-псіхалагічнага стану насельніцтва, якое пражывае на тэрыторыях, забруджаных радыенуклідамі. У чым заключаецца методыка, калі пачнецца сам маніторынг? Ці будуць падчас яго ўлічаны пажаданні і патрэбы людзей, якія там пражываюць?

— Работа па сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі праводзіцца супольна беларускімі і расійскімі спецыялістамі. Яе мэта — асвета насельніцтва ў галіне радыяцыйнай бяспекі і радыеэкалогіі, пераадоленне сацыяльна-псіхалагічнага стрэсу і радыефобіі, павышэнне жыццёвай актыўнасці, фарміраванне бяспечнага ходу жыцця ва ўмовах пражывання на забруджаных тэрыторыях.

Вялікая праца ў гэтым накірунку праводзіцца ў дзіцячых рэабілітацыйна-аздараўляльных цэнтрах, якія штогод наведваюць 140 тысяч дзяцей і падлеткаў.

Мы з цікаўнасцю вывучаем досвед маніторынгу сацыяльна-псіхалагічнага стану насельніцтва, які назапашаны навукова-даследчым цэнтрам “Прагноз” (Обнінск, Расійская Федэрацыя). У рамках праграмы Саюзнай дзяржавы плануецца правесці буйное сацыялагічнае даследаванне сярод насельніцтва, якое пражывае на забруджаных тэрыторыях. Ягоныя вынікі і адпаведныя рэкамендацыі вучоных будуць скарыстоўвацца органамі дзяржаўнага кіравання ўсіх узроўняў.

— Не дзіва, што вялікі рэзананс і розныя меркаванні ў беларускім грамадстве выклікалі планы будаўніцтва АЭС. А якая ваша пазіцыя тут, як начальніка дэпартамента па ліквідацыі наступстваў найвялікшай тэхнагеннай катастрофы?

— Сапраўды, Беларусь як ніякая іншая краіна сутыкаецца з наступствамі найвялікшай тэхнагеннай катастрофы. Аднак, аб’ектыўна, альтэрнатывы развіццю атамнай энергетыкі ў краіне, якая не забяспечана сыравіннымі рэсурсамі, пакуль не існуе. У той жа час, калі мы ў бліжэйшыя некалькі год не вырашым задачу самастойнага забеспячэння энергарэсурсамі, можа стварыцца рэальная пагроза суверэнітэту нашай дзяржавы. Гэтага, вядома, не жадаюць нашыя грамадзяне, у тым ліку і тыя, хто пражывае на тэрыторыях, забруджаных радыенуклідамі.

— Апошнім часам мацнеюць адносіны паміж Мінскам і Кіевам, рыхтуецца нават дзяржаўны візіт Прэзідэнта Беларусі ва Украіну. Ці адчулі гэта ў Дэпартаменце, ці паболела праектаў супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Украінай у вашай сферы?

— Іх заўсёды было шмат. Бо гэта сфера, непадуладная дзяржаўным межам, палітычным разыходжанням. Гэта агульная бяда нашых краін, і разам нам з ёй наканавана змагацца.

З моманту аварыі і па сённяшні дзень не спыняецца ўзаемадзеянне вучоных Беларусі, Украіны і Расіі. Асабліва насычаным стаўся мінулы год, калі адбыліся буйныя міжнародныя канферэнцыі па чарнобыльскай праблеме ў Кіеве, Гомелі і Мінску. Калі ж казаць пра супольныя праекты, якія будуць ладзіцца ў бліжэйшай будучыні, то гэта, безумоўна, сумесны праект па вывучэнні ўздзеяння радыяцыі на аб’екты жывой прыроды ў Палескім радыяцыйна-экалагічным запаведніку. Ён будзе ажыццяўляцца пад эгідай ЮНЕСКА.

— У суседніх краінах часам адбываюцца акцыі пратэсту чарнобыльцаў, ліквідатараў. Чым адрозніваюцца ўмовы, у якіх знаходзяцца ліквідатары, у нашых краінах?

— Па інфармацыі, якую мы атрымоўваем пераважна праз СМІ, гэтыя акцыі ў Расійскай Федэрацыі былі абумоўлены рэзкім скарачэннем памераў пенсій інвалідаў-чарнобыльцаў, а таксама несвоечасовай манетызацыяй ільготаў. Грашовыя выплаты ліквідатарам там прадастаўляюцца за кошт рэгіянальных бюджэтаў, а не федэральнага.

На Беларусі ж сітуацыя іншая. Усе льготы і кампенсацыі, прадугледжаныя дзеючым заканадаўствам для пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту, і праблем тут няма. Памеры пенсій інвалідаў-чарнобыльцаў у нас, да прыкладу, значна вышэй, чым у іншых катэгорый пенсіянераў, і выплачваюцца яны рэгулярна.

— Многія пісьменнікі, мастакі ў Беларусі маюць творы на чарнобыльскую тэматыку...

— Пастаянна развіваецца супрацоўніцтва Дэпартамента з беларускімі мастакамі, вялікую частку творчасці якіх займае тэма чарнобыльскай катастрофы. Пры падтрымцы МНС рэгулярна ладзяцца іх выставы ў Італіі, Швейцарыі, Германіі, Сербіі і іншых краінах.

Фільмы аб Чарнобылі, створаныя цягам апошніх 20 год, дапамагаюць уявіць эвалюцыю адносінаў грамадства і дзяржавы да чарнобыльскай навалы. Значнай культурнай падзеяй мінулага года стаў створаны пры нашай фінансавай падтрымцы фільм “Чарнобыльскі крыж” (Рэж. А.Алай). Стужка стала лаўрэатам леташняга міжнароднага фестывалю экалагічнага кіно “EKOFilm”.

У творчым супрацоўніцтве з вядомымі беларускімі літаратарамі апошнім часам выдадзены зборнікі “Прайсці праз зону”, “Чарнобыльская рана”, “Апакаліпсічная зорка”, “Спрадвечнае” і інш.

Вядучыя дызайнеры рэспублікі садзейнічалі нам у падрыхтоўцы панарамнай экспазіцыі “Чарнобыль і Беларусь”, якая была падрыхтавана да 20-й гадавіны навалы. Экспазіцыя дэманстравалася ў Палацы Рэспублікі, а потым — на міжнародных выставах у Маскве і Мінску.

Гутарыў
Мікалай АНІШЧАНКА

Яны ведалі Яроменку

У галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася прэзентацыя кнігі «Николай Еременко. А свет не погас...». Гэта збор нарысаў, маналогаў і ўспамінаў, у якіх распавядаецца пра творчы і жыццёвы шлях Мікалая Яроменкі, народнага артыста СССР, народнага артыста Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Арганізатары прэзентацыі мелі магчымасць паказаць кадры з лепшымі ролямі Мікалая Яроменкі, згадаць шматлікія інтэрв’ю з ім. Але быў абраны іншы, неафіцыйны шлях. У гэты вечар сябры і калегі сустрэліся, каб прыгадаць чалавека, які пражыў яскравае, насычанае, поўнае выбітных падзей жыццё, чалавека, які да сямідзесяці гадоў захаваў маладосць і дабрыню ў сваім сэрцы.

У кнізе шмат фотаздымкаў з сямейнага архіва Яроменкі, з архіваў музея Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь. У тым ліку ёсць тут фота з апошняга спектакля «Милый лжец», у якім акцёр іграў разам з жонкай, Галінай Арловай. «Іграй Мікалая Мікалаевіча была амаль містычнай, нібыта ён здагадваўся, што гэта яго апошні спектакль. Зусім іншае вымярэнне, іншая глыбіня знаёмых фраз. Публіка вітала акцёра стоячы, а ўсяго праз тры дні яго не стала», — прыгадвае Галіна Арлова.

«З ім было лёгка працаваць — імгненнасць думкі, пульс фразы... Гэта нагадвала нейкі своеасаблівы рэактар, які нельга спыніць, — кажа Л.Екель, укладальнік і ініцыятар кнігі.

Кніга, што выдадзена ў серыі «Жизнь знаменитых людей Беларуси», багата на цеплыню і шчырасць людзей, якія ведалі Мікалая Яроменку і падзяліліся сваімі ўспамінамі. Акрамя таго, у кнізе можна знайсці маналог народнага артыста «Сцена из-за кулис».

Каштоўнасць выдання не толькі ў тым, што яно пра чалавека, які стаў увасабленнем эпохі, але і ў тым, што ў ім неверагодная канцэнтрацыя жыцця. Голас Мікалая Яроменкі будзе гучаць яшчэ доўга і з экранаў тэлевізараў, і са старонак кніг.

Таццяна КАРДАШЫНА

Пра помнік Льву Сапегу ў Слоніме

4 красавіка споўнілася 450 гадоў з дня нараджэння канцлера Вялікага княства Літоўскага і слонімскага старасты Льва Сапегі (1557–1633). У гэты дзень у Слоніме магла быць самая яркая і знамянальная падзея — адкрыццё помніка гэтаму вялікаму чалавеку, які шмат зрабіў для эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця майго роднага горада. Але, як заўважыў аўтару гэтых радкоў скульптар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і Беларусі, мой зямляк Іван Якімавіч Міско, пэўных зрухаў ў гэтым кірунку пакуль не адчуваецца.

— Іван Якімавіч, дык калі ў Слоніме з’явіцца помнік Льву Сапегу?

— Пакуль помнік Льву Сапегу ў Слоніме застаецца нават не на паперы, а толькі на словах. Я некалькі гадоў таму казаў у райвыканкаме, што трэба адкрыць банкаўскі рахунак на помнік славутаму канцлеру і паціху туды пералічваць грошы, збіраць іх грамадой разам па крупінцы, калі гэты праект немагчыма прафінансаваць адразу. Міністэрства культуры фінансаваць помнік не будзе, толькі трэба спадзявацца на мясцовае фінансаванне. Так цяпер робіцца ўсюды. Але мяне ніхто не паслухаў, таму помніка ў Слоніма няма і калі будзе — невядома. Мне чыноўнікі з райвыканкама кажуць: “Мы вам патэлефануем. Мы вам патэлефануем...” Да сённяшніх дзён я чакаю іх званкоў і канкрэтных прапаноў і спраў.

— Але намеснік міністра культуры Валерый Гедройц старшыні ТБМ Алегу Трусаву сказаў, што помнік Сапегу ў Слоніме будзе пастаўлены...

— Ён у плане ёсць. Пытаюся ў міністэрстве, а хто помнік фінансаваць будзе? За кошт мясцовага бюджэту — адказваюць. Вось так. І кошт помніка невядомы.

— А ці падрыхтаваны праект помніка?

— Рабочая мадэль помніка даўно падрыхтавана і зацверджана Рэспубліканскім манументальным саветам. Усе астатняе робіцца хутка.

— Дзе плануецца паставіць помнік Льву Сапегу?

— На плошчы Льва Сапегі ў Слоніме вельмі дрэннае месца для помніка, яго там ставіць нельга. Таму яго плануюць узвесці у цэнтры горада ў скверы. Ды і сквер увесь трэба пераабсталёўваць па-іншаму.

— Іван Якімавіч, над чым вы працуеце цяпер?

— Рыхтуюся да персанальнай выставы, прысвечанай космасу. Яна адкрыецца ў пачатку красавіка ў зале мастацкага музея ў Мінску.

Сяргей ЧЫГРЫН

Аднойчы летам паэт Павел Вераб'ёў запрасіў мяне да сябе на радзіму ў вёску Рабавічы, што на Слаўгарадчыне. З намі меўся ехаць яшчэ адзін паэт, але ён раптам захварэў. У дарогу мы выправіліся ўтрох — Павел узяў з сабой падлетка сына Антона. Пасля я шкадаваў, што творца, які не змог з намі паехаць, не пабачыў усёй той прыгажосці, якую бачылі мы, што ён не пахадзіў з намі па стромкіх берагах Проні і Сожа, не папіў вады з гаючага Сіняга Ключа — крыніцы, якая, колькі сябе тут помняць людзі, жывіць усіх, хто да яе прыпадае. Мне, далёкаму ад паэзіі, было б цікава пабачыць гэтых двух зусім розных творцаў у радыяцыйнай зоне, дзе жывуць людзі, паназіраць за паэтамі...

Літаратура і рэальнасць

Аднойчы летам...

Быў чэрвень. Пара цвіцення разнатраўя. Тая пара, калі вятрыскі над лугамі, хоць і рознакаляровыя, а ўсё ж месцамі яшчэ і блакітныя.(Помніце, якія вятры вясною, скажам, у Міхася Стральцова, слыннага сына слаўгарадскай зямлі?..)

Але Слаўгарадчына, зрэшты, як і многія куткі нашай зямлі, шчодрая на пісьменніцкія і чалавечыя таленты. Дастаткова сустрэцца з тамтэйшымі людзьмі, пабыць побач з імі... Наконт пісьменніцкіх, то пачытайма творы Кастуся Кірэенкі, таго ж Міхася Стральцова, Алеся Масарэнкі, Віктара Ракава, Уладзіслава Рубанава ды Паўла Вераб'ёва — гэта калі казаць пра найбольш вядомых. Увогуле ж Магілёўшчына, калі браць толькі той, усходне-паўднёвы яе край, які жывяць Проня, Сож, Бася, Бесядзь ды дзесяткі меншых рэчак і рачулак, люляюць адвечныя лясы ды лашчаць аксамітныя лугі, нарадзіла цэлы россып выдатных творцаў. Мяркуйце самі: Аляксей Пысін, Віктар Карамазаў, Анатоль Казлоў, Леанід Левановіч, Алесь Пісьмянкоў, Панас Палітыка, Рыгор Яўсееў... Яны наш край, прыроду, чалавека-працаўніка, мудрага і бясхітраснага ў сваёй жыццястойкай прастаце і шчырасці, славілі ўсе. І кожны, як мог, праз сваю паэзію, прозу, а хто і праз гумар, даводзілі да чытача жыццёвую філасофію сваіх землякоў. (Скажам, М. Стральцоў, дык і мудрасць роду — згадаем дзеда Міхалку з аповесці "Адзін лапаць, адзін чунь"). А яна зводзіцца да наступнага: калі гора — то мы разам; калі радасць — таксама, калі маеш патрэбу ў дабрыні — вазьмі ў нас; у спагадзе — таксама...

Павел Вераб'ёў паспрабаваў пасвойму ў кнізе вершаў і эсэ «Не трэба вас...» (2005) таксама распавесці нам пра жыццёвую мудрасць свайго радаводу.

Так, у эсэ «Крысан» П. Вераб'ёў піша: «У дзеда ж была адна філасофская формула, якую ён вельмі часта паўтараў: «Ворага накармі, напаі і ў дарогу дай». (Да гэтага паэт расказвае, як дзед, застаўшыся без жонкі з маленькім сынам, узяў жанчыну з трыма дзецьмі-сіротамі; аддаў пасля вайны сваю ацалелую хату (у вёсцы захаваліся на той час і больш прасторныя) пад калгасную кантору, сельсавет, клуб... І яшчэ цікавы штрых: даведаўшыся, што нарэшце калгаснікам будуць плаціць пенсію, дзед Крысан не мог даўмецца: як гэта — ты нічога не робіш, а табе грошы дадуць? (Трэба сказаць, што «смаку» «незаробленай капейкі» ён так і не паспеў адчуць — незадоўга да атрымання пенсіі памёр.)

Дзедава выказванне, агучанае Паўлам Вераб'ёвым, чуў у дзяцінстве і я ў сваім пасёлку. На той час ніяк не мог з пачутым змірыцца, прымаючы яго літаральна. Сапраўды, як можна спрыяць ворагу? Выходзіць, ты яго падсілкуй, падмацуй, абагрэй, каб ён ішоў далей рабіць людзям зло? (Потым ужо, значна пазней, мне растлумачылі сведчыя людзі ды вартыя кнігі, што ў тых словах — іншы сэнс.)

Зафіксаваная паэтам Паўлам Вераб'ёвым «дзедава філасофская формула» ахоплівае шырокі спектр уласна стаўлення чалавека да жыцця. Вытокі яе — ад біблейскіх запаветаў. Зрэшты, не варта трымаць зла на іншых. Пазбаўся ў сваёй душы варожасці да сябе падобнага, дай таму надзею на дабро: і яму, і табе стане лепш... Словам, варыяцыі ў розных жыццёвых абставінах могуць быць самыя розныя, але яны прыводзяць усеадно да разумення, што кожны павінен быць Чалавекам.

Дык вось, што тычыцца ўвогуле такой «філасофіі», калі гаварыць пра яе далей, то было незразумела, чаму гэта кажуць людзі, якія нічога не баяліся ў жыцці? (Хіба што аднаго — не дайсці да таго, як піша паэт, «каб есці хлеб чужы».)

Тое, што і Паўлавы землякі не ахвочыя да чужога хлеба, і яго родзічы — дык гэта добра прачытвалася яшчэ ў падтэксце двух папярэдніх зборнікаў паэта «Крытычная маса» (1990) і «Цёмнае віно» (1995).

Мабыць, чытач звярнуў увагу на вялікую «разбежку» ў часе паміж Паўлавымі кнігамі. За пятнаццаць гадоў — усяго тры. Скажам, тым часам асобныя пішучыя людзі лічаць сваім здабыткам не мастацкую якасць напісанага, а колькасць выдадзеных «кніг». Такім чынам ідзе дыскрэдытацыя мастацкай літаратуры праз «самадзейных» пісьменнікаў. І калі мы свядома, упарта цягнем у творчыя арганізацыі такіх аўтараў, значыць, зневажаем літаратуру, чытача. Так і хочацца ўсклікнуць падобным беларускамоўным аўтарам: о, бедны Максім Багдановіч са сваім адзіным прыжыццёвым «Вянком» на фоне, скажам, якога-небудзь усюдыіснага паэта К. з яго амаль трыццаццю кнігамі! А рускамоўным — о, скрушны Арсен Таркоўскі са сваімі зборнічкамі «Перед снегом», «Земле — земное», «Вестник» у параўнанні з пяццю «кнігамі» ў год якога-небудзь паэта Н.!

Як тут не прыгадаць вядомае: працаваць трэба са здольнымі, а не з тымі, у каго амбіцыі замест здольнасцей. І варта шчыра сказаць ім: для вас асабіста, ды і для ўсіх будзе больш карысці, калі вы, чалавек без творчых задаткаў, будзеце далей займацца *сваёй* справай, да якой здатны, якой навучаны.

II

Між іншым, сваёй справай займаюцца людзі ў радыяцыйных зонах. У прыватнасці, і там, у Рабавічах, куды мы ехалі, дзе ў 1958 годзе нарадзіўся Павел Вераб'ёў, і якім паэт прысвяціў нямала твораў.

Сталася так, нямала часу адпрацаваўшы ў Слаўгарадскай райгазеце, аб'ездзіўшы, абхадзіўшы, як кажуць, уздоўж і ўпоперак сваю зямлю, Павел Вераб'ёў падаўся на вучобу ў сталіцу, дзе потым яго пакінулі працаваць. У Рабавічах, далёка ад Мінска, заставалася адна яго маці Ганна Крысанаўна. Праз пэўны час сын угаварыў яе перабрацца бліжэй да сябе, пад Мінск, у вёску Баравыя. (Бацька Віктар Паўлавіч памёр у 1995 годзе).

З той пары мінула шмат гадоў. Многае змянілася ў жыцці. І мне было цікава: ці помняць сёння Вераб'ёвых у Рабавічах? Бывае ж так: з'ехалі па нейкай прычыне людзі — і ніякай пра іх у землякоў згадкі. Або такая: «Ат, махні рукой...»

Калі, напрыклад, такое гавораць пра таго, хто не займаецца працай, значнай для іншых — адно. А калі, крый Божа, пра творцу?.. Тады, як у нас казалі, ад сораму хоць у мех завяжыся... І калі ўжо, скажам, за нешта заганнае твае землякі адмахнуцца ад цябе, дык прыйдзецца шмат папацець, каб даказаць, што зноў змог стаць такім, як трэба... А якім трэба?.. Кажуць, што звычайным, простым, бясхітрасным, добрым і спагадлівым.

Павел Вераб'ёў, нягледзячы на тое, што ўжо даўно няма радні ў Рабавічах, пастаянна наведваецца туды. Дамоў. І верш «Дамоў», ведаю, напісаны яшчэ тады, калі ў Рабавічах жыла паэтава маці.

Здаецца, просты твор: *«Госцем да мамы еду,// Еду нібы на край-свет//...»* Словам, знаёмы кожнаму з нас дарожны настрой, хаця ў кожнага ён свой. Але ж ёсць там нешта па-стральцоўску шчымліва-асветленае, калі ў душы з'яўляецца асэнсаванне самога сябе, калі ажываюць самыя патаемныя пачуцці, калі, напрыклад, «... *падсветленай скрусе// У прадчуванні млець//»*. І калі: *«Боязна — не вярнуцца»*, ды *«Страх — не паспець...»*

У тую нашу паездку — ён вярнуўся да свайго гняздоўя, дому, саду, людзей. Чаму? Хто ведае? Адно, так яму было трэба.

Пра свае Рабавічы, пра «край-свет», пасля ўжо чарнобыльскай пары, Павел Вераб'ёў напісаў няшмат. Але важка. У калектыўнай кніжцы «Прайсці праз зону» (2001), выдадзенай у «Мастацкай літаратуры», — цыкл яго вершаў. Прасякнуты і болем, і надзеяй, і верай. І клопаты землякоў паэту не чужыя. Бо:

Жыву я на зямлі, а не на небе,
Мяне турбуе згода землякоў,
Жыццё чыё — у бульбе, хлебе.
Яны жывуць.
Не плачуць аб пражытым.
Агонь надзеі ні ў адным не згас.
Спрадвеку жыта ратавала нас.
І я ля іх, душой адратаваны,
Гляджу на свет смялей і весялей,
Бо ёсць каму загойваць
нашы раны,
Жывуць і боль і вера у людзей...

Вядома, усё гэта зразумець творцу важна. І самому перажыць тое, што перажываюць людзі. Але, як ведаем, пра чарнобыльскую бяду ў нас напісана шмат. Выдадзены асобныя кнігі, зборнікі. Адны аўтары — сапраўды ведаюць, што такое зона, як там жывуць і працуюць людзі. Другія ствараюць творы, не пакідаючы сваіх кабінетаў. Скажам, Алесь Крыга, Мікола Капыловіч і Ніна Рыбік — доўга папрацавалі ў Чарнобыльскай зоне. Ведаюць усё там да драбніц. Мікола Мятліцкі, Анатоль Казлоў (ягоная Асінаўка таксама "зруйнавана" радыяцыяй), Анатоль Бароўскі, Тамара Кручэнка, Мікола Ждановіч і многія іншыя пісьменнікі і журналісты не раз былі там. Вядома, літаратурныя сведчанні і тых, і тых — найбольш каштоўныя. А як жа тады адносіцца да тых, хто за сотні вёрст абыходзіць небяспечныя радыяцыйныя месцы, а потым піша паэмы, вершы, літтворы іншых жанраў пра зону і яе людзей?

Наконт гэтага адзін дасведчаны пісьменнік мне растлумачыў проста: «Ёсць людзі, якім няма розніцы, пра што пісаць: абы спрычыніцца да справы, асабліва калі яна агульназначная. Кастрычнік, Першамай, камсамол, партыя. Цяпер — Чарнобыль. Таму часам і літтворы далёкія ад рэальнасці».

Але ж мне зноў падказваюць, што менавіта тыя, хто «прайшоў» Чарнобыльскую зону не турыстам, сёння павінен пра яе пісаць. Маўляў, інакш узнікае маральны аспект: «прыстасаванства». Хто тут мае рацыю, а хто — не, вырашаць не мне.

Толькі ж вернемся да тэмы. Паэт Павел Вераб'ёў непрымірымы і як чалавек, і як творца да розных прыстасаванцаў. Як ведаем, сёння прыстасаванства — з'ява даволі ўчэпістая. Звычайна прыстасоўваюцца да таго, ад чаго асабістая выгада. Дык вось, у публіцыстычным вершы паэта, што даў назву яго апошняй кнізе ідзе канстатацыя: «Вы прышчэміцеся на скрыжалі», у любых сітуацыях з карысцю для сябе. Канечне, прышчэмяцца і некаторыя з нас, пісьменнікаў і непісьменнікаў. Гэта праўда. Як праўда, што наступіць час, калі яны ці мы, тыя, хто «прышчэміцца», будуць не патрэбны радзіме менавіта з-за гэтага. Вядомае, але іншы раз нагадаць пра гэта не лішне...

...А ў той час хтосьці тупаціць па плошчы, каб здаля «спрычыніцца», а дзяржава будуе бальніцы, школы, дарогі, аздараўляе зямлю, праводзіць газ, а яе кіраўніцтва разам з людзьмі, што ў бядзе...

III

...Я доўга выціраў абутак аб траву каля чорнага, некалі сшараванага мноствам ног ганку. Трава была мяккая, высокая, сагнутая пад налітай свінцом і бронзай расе. Сонца садзілася. Барвяная чырвань адбівалася ў вокнах хаты, што выходзілі на падворак. Падворак парослы разнатраўем і крапівой. Тым часам Павел намацаў у расшчэліне вугла ключ і лоўка адшчоўкнуў просты, адамкнеш цвіком, замок.

Прыкмеціў: калі мы заходзілі ў двор, на вуліцы нікога не было, а пачалі шумець на падворку, з'явілася сталага веку жанчына, доўга моўчкі за намі наглядала.

— Не пазнае, і я яе не пазнаю, — сказаў Павел і азваўся: — Я — Крысанаў унук.

— Крысана я помню. Тады помню і вашу маму, дзеткі. Як там Аня на чужыне? Гэта ж які край свету, кажуць... А мы з Чырвонай Слабады. Як вёску нашу пахавалі, дык мы сюды перабраліся. З дзецьмі я. А хто з нашых, як ваша маці, парассыпаліся па свеце, па чужых людзях.

— Мама, нічога пачуваецца, дзякуй, — сказаў Павел. — Наказвала, каб рабавічанам, слабадчанам, усім тутэйшым людзям кланяўся. Але ж і там, як вы гаворыце, на чужыне, людзі жывуць.

— Але ж, жывуць, — пагадзілася старая. — І чалавек з людзьмі будзе жыць, калі ўмее ладзіць. А не будзеш ладзіць, то ні са сваімі, ні з чужымі, нічога не будзе. Змарнееш, згоркнеш, асабліва ў горы, як у нас.

— Мусіць жа, ладзяць у нас, у Рабавічах, — папытаўся Павел.

— Ладзяць, ладзім, — пагадзілася старая. — Во, і калодзежы разам капаем (паказала на той бок вуліцы на калодзеж), і хаты будуюць, у каго сілы ёсць. Ды вялікія, такіх раней не ставілі. Нашто яны, калі дзяцей зараз памногу не нараджаюць? Во, гэтая хата дзеда вашага Крысана. Пасля вайны ацалела, дык ён пусціў сюды і сельсавет, і кантору, і клуб. Мы ж, як дзеўкамі былі, сюды са сваёй Слабады хадзілі на вячоркі. Хата гэтая пазводзіла разам не адну пару: гулялі, любіліся, жаніліся.

— Можа, і вы тут свайго чалавека знайшлі? — пацікавіўся Павел.

— Не, не буду хлусіць. Мой чалавек — свой, слабадскі. Але ж разам хадзілі сюды і адсюль.

— Гэта далёка, Слабада? — спытаў я ў Паўла.

— Ды не. Вярсты тры. Заўтра ўбачыш.

IV

Думаю, чытачу нецікавыя будуць мае апісанні пахаваных вёсак: даўно апісана. Тое ж, пустэча без чалавека... Скажу адно: людзі з іх без увагі не пакінуты, прытулак ім дадзены. Дзяржавай...

Я параіў бы тым, хто не чытаў Паўлаву кнігу «Не трэба вас...», пачынаць чытаць яе з эсэ. Чаму? Гэта своеасаблівая біяграфія і маральная аснова ягонага помнага роду, надта няпростага ў сваім памкненні да выжывання і жыцця між людзей. Эсэ дазваляюць зразумець Паўла Вераб'ёва-паэта, які жыццё вывучае праз свае ўласныя ўчынкі, праз учынкі продкаў.Вось адна сітуацыя, расказаная Паўлу маці, і адлюстраваная ім ў эсэ «Па чым вашы яблыкі?» ...Калі Павел быў малы і сям'я не мела добрага саду, бацька з маці паехалі купляць яблыкі ў Слаўгарад. Бацька сустрэў знаёмага чалавека. Той: «Купі ў мяне!» Купіў. Дорага. Едуць дадому, маці і пытае, адкуль ты яго ведаеш? Расказвае, што гэта той чалавек, які ў пачатку вайны трапіў у палон, а потым уцёк з лагера. За ім гналіся немцы, а ён ускочыў у хату. Бабуля ўсё зразумела, схапіла яго, хлапчука (будучага Паўлавага бацьку), ды яму на калені. «Гэта твой бацька, гавары, што гэта твой бацька!» І калі на парозе з'явіўся немец з аўтаматам, хлопчык пачаў абдымаць уцекача і цалаваць. «А маці падбегла да немца, глумачыць: «Пан, пан, гэта мой гаспадар». Так і выратавала. Толькі праз два дні чалавек той пакінуў іх, як не ўгаворвала маці пабыць хаця б колькі дзён: немцы ж могуць запытаць, дзе гаспадар, тады ж усіх расстраляюць...

А закончыць хочацца вось чым: вяскоўцы пазнаюць Паўла Вераб'ёва «па прыродзе» — падобны на дзядоў. Як збіраюцца, напрыклад, на Радуніцу, пытаюць, маўляў, каму ж тыя перадалі сваю навуку? Гэта значыць, адносіны да людзей, да жыцця, а разам з гэтым і сваю «філасофскую формулу». (А другі дзед нікога першы не чапаў, але ўмеў пастаяць за сябе). Думаю яму, Паўлу, і перадаліся іхнія гены. А далей — унуку Антону, які насуперак усяму быў настойлівы: вазьмі мяне, бацька, на радзіму дзядулі і бабуль.

Што дзедава «філасофская формула» дзейнічае, дык чытачу будзе зразумела яшчэ вось з чаго. Перад нашай паездкай на Слаўгарадчыну Паўла выключылі з творчай арганізацыі «дэмакраты» за тое, што яму, як і многім з нас, надакучыла іх палітыканства, у якое яны з іх ранейшым партімпэтам імкнуліся ўцягнуць усіх. І за тое, што ён асмеліўся іх аслухацца. Кажуць, адзін з паэтаў, які ў свой час, па першай кніжцы, даваў П. Вераб'ёву рэкамендацыю, адазваў яе. Нагадаю: неўзабаве Павел Вераб'ёў у сваю кнігу «Не трэба вас...» уключыў верш, прысвечаны таму паэту. Дарэчы, цудоўны верш.

Я параіў бы тым, хто не чытаў Паўлаву кнігу «Не трэба вас...», пачынаць чытаць яе з эсэ. Чаму? Гэта своеасаблівая біяграфія і маральная аснова ягонага помнага роду, надта няпростага ў сваім памкненні да выжывання і жыцця між людзей. Эсэ дазваляюць зразумець Паўла Вераб'ёва-паэта, які жыццё вывучае праз свае ўласныя ўчынкі, праз учынкі продкаў.

Уладзімір САЛАМАХА

Фота аўтара

Падарожжа беларускага Уліса ў прасторы і часе

У мінулым годзе выдавецтва “Мастацкая літаратура” выпусціла ў свет кнігу мастацкай прозы слыннага беларускага літаратуразнаўцы і пісьменніка Уладзіміра Гніламёдава. Мяркую, што назва яго рамана “Уліс з Прускі” з'яўляецца невыпадковай па некалькіх прычынах. Па-першае, яна выяўляе аўтарскую канцэпцыю лёсу галоўнага героя твора — хлопца з беларускай вёсачкі на Брэстчыне, які смела рушыў у пошуках долі ў далёкую заакіянскую Амерыку, не забываючы пры гэтым, як і герой гамераўскага эпасу, пра сваю радзіму, родны дом. Па-другое, такім спалучэннем сусветных культурных рэмінісцэнцый з нацыянальнымі рэаліямі У. Гніламёдаў працягвае традыцыю, што ўжо замацавалася ў беларускай літаратуры. Згадаем хоць бы паэтычную кнігу У. Караткевіча “Мая Іліяда”.

Дарэчы, менавіта У. Караткевіч калісьці марыў пра адраджэнне, рэканструкцыю беларускага паэтычнага эпасу, узнаўленне ў новых культурна-гістарычных умовах і на грунце абноўленай паэтыкі спрадвечных мастацкіх архетыпаў і асаблівасцей нацыянальнага светаўспрымання. Беларуская проза ў гэтым плане мае відавочныя здабыткі. Лепшыя яе ўзоры, створаныя на працягу мінулага стагоддзя, у сваёй сукупнасці даюць дастаткова выразнае ўяўленне пра адметнасць нацыянальнага светабачання і менталітэту, спосабы выяўлення дачыненняў асобы з соцыумам і прыродным асяроддзем. Разам з тым, мабыць, было б неабачлівым сцвярджаць, нібыта ўжо цалкам завершаны працэс станаўлення беларускай эпікі, што і вычарпаны магчымасці гэтага спосабу раскрыцця эстэтычных і духоўных праяў нацыянальнага жыцця. І сведчаннем таму — проза У. Гніламёдава, у якой беларускі эпас набывае новыя адценні і сэнсы, сугучныя часу.

За сто гадоў, якія аддзяляюць нас ад падзей, апісаных у рамане, вельмі многае змянілася ў свеце. Змяніліся таксама і эстэтычныя, філасофскія крытэрыі, паводле якіх ацэньваецца сутнасць працэсаў, што маюць культуратворчае і духоўнае значэнне. Але з тым большай цікавасцю звяртаюцца сёння і мастакі, і даследчыкі да пачатку XX стагоддзя — аднаго з важнейшых перыядаў фарміравання нацыянальнай светапогляднай сістэмы.

Раман У. Гніламёдава пачынаецца з таго, што да тубыльцаў невялікай вёсачкі Пруска, якая знаходзіцца на ўскрайку заходняга Палесся, паблізу ад Белавежскай пушчы, даходзіць нечаканая і нават не вельмі зразумелая вестка — пачалося *новае, дваццатае стагоддзе*. Аўтар паказвае, з якой спрадвечнай сялянскай насцярожанасцю сустракаюць гэтую навіну вяскоўцы, што звыкліся ўсё вымяраць паводле мерак свайго нетаропкага, грунтоўнага, напоўненага нялёгкімі працоўнымі клопатамі жыцця.

З эпічнай няспешнасцю цячэ жыццё ў Прусцы, гісторыя, здаецца, творыцца дзесьці ў іншых месцах, на прасторах шырокага свету. Апавядальнік такім вось чынам вызначае характар гэтага адвеку ўсталяванага ладу: “...людзі тут трывала прыстасаваліся да жыцця, аціхлі ў сваёй бясконцай і нялёгкай працы, нібы паснулі, зачараваныя замаруджанай плынню штодзённага існавання”. Аднак жа менавіта гэтая эпічнасць, угрунтаванасць прускаўцаў у першаасновах быцця і надае апавядальнай плыні рамана разгорнутасць, скіраванасць да выяўлення сувязяў асобнага чалавека, яго прыватнага жыцця з самымі разнапланавымі праявамі вялікага свету. Таго свету, які адкрываецца за ваколіцамі вёскі і які нязменна прыцягвае да сябе магчымасцямі пошуку сэнсу жыцця, яго больш разумнай арганізацыі.

Лявон Кужаль, галоўны герой твора, задуманага як шырокае эпічнае палатно, своеасаблівая хроніка роду, сямейная сага, кіруецца ў сваім жыцці нібыта перш за ўсё рэзонамі практычнай мэтазгоднасці. Яго, як тысячы іншых беларусаў, адправілі ў далёкі свет найперш імкненне да змагання са спрадвечнай сялянскай нядоляй, матэрыяльнай нястачай, жаданне ўмацаваць свой дабрабыт, адчуць пэўную эканамічную і сацыяльную незалежнасць.

Пачуцці гэтых шукальнікаў лепшай долі выразна выяўлены ў радках “Эміграцкай песні” Максіма Багдановіча: “Не расталіся б мы з нашым краем, // Каб было дзеля нас у ім хлеба”. Твор беларускага паэта напісаны якраз у той час, калі герой рамана У. Гніламёдава Лявон Кужаль вяртаецца пасля сямігадовага знаходжання ў Амерыцы на радзіму. Вяртаецца, пераплываючы праз акіян, у той жа самы порт, з якога калісьці і выпраўляўся ў далёкае падарожжа (і які фігуруе ў Багдановічавым творы), — Лібаву. На караблі, між іншым, ён сустракае новы, 1914 год, год трагічны і лёсавырашальны ў жыцці не толькі асобных людзей, але і цэлых народаў. Першая сусветная вайна для Беларусі сталася прычынай невымерных страт і цяжкіх выпрабаванняў. У шмат разоў большай колькасці мясцовых насельнікаў, чым гэта мела месца пры працоўнай міграцыі, давялося пакінуць свае дамы і спазнаць мітрэнгі далёкай вандроўкі. Пакіруецца зноўку ў нялёгкую, на гэты раз бежанскую, дарогу і Лявон Кужаль са сваёй сям'ёю. Пра тое, што чакае іх на гэтай дарозе, пісьменнік расказвае ў наступным рамане — “Усход”.

Наогул жа, У. Гніламёдавым задуманы і рэалізоўваецца вельмі цікавы і маштабны мастацкі праект, які прадугледжвае ў цыкле раманаў, аб'яднаных адзіным галоўным героем, выявіць не толькі багаты ўнутраны свет беларуса, але і паказаць глыбінную сувязь чалавека з гістарычнай эпохай. У мінулым годзе распачалася публікацыя ў часопісе “Полымя” трэцяга па ліку рамана (“Вяртанне”), у якім гніламёдаўскія героі, і найперш Лявон Кужаль, вярнуўшыся на радзіму з бежанства, імкнуцца аднавіць знядбаныя гаспадаркі, спрабуюць наладзіць жыццё ў няпростых умовах сацыяльнага і нацыянальнага ўціску з боку ўладаў польскай дзяржавы, якая анексавала заходнебеларускія землі.

Аўтар і сёння працягвае працу над задумай, праходзячы са сваімі героямі па крутых перавалах дваццатага стагоддзя, раскрываючы адметнасць характараў людзей, што, нягледзячы ні на якія перыпетыі, імкнуцца сцвердзіць сваю чалавечую годнасць, права на шчасце. Героі згаданых раманаў, і асабліва Лявон Кужаль блізкія і зразумелыя аўтару, мабыць, яшчэ і таму, што за большасцю з іх стаяць рэальныя прататыпы. У цэнтральным вобразе раманнай эпапеі знайшлі ўвасабленне перыпетыі лёсу і асабовыя рысы дзеда пісьменніка. Разам з тым, гэты вобраз, як і многія іншыя вобразы багата населеных раманаў У. Гніламёдава, з'яўляецца тыпізаваным, дзе праз асабісты лёс прасвечвае лёс цэлага пакалення.

На пачатку рамана “Уліс з Прускі” галоўны герой яшчэ падлетак, Лявонка. Сярод іншых вясковых хлапчукоў яго вылучае хіба што цяга да навукі, пазнання, асаблівая чуйнасць да ўсяго новага і невядомага. Моцна ўразіла яго вестка пра пачатак адліку новага стагоддзя, пачутая ім на вясковай вуліцы. Гэтую навіну прынёс ён дадому, каб падзяліцца ёю з дзедам, бацькам і маці. У невялікім сямейным коле абмяркоўваецца глабальная навіна (“час жа павінен неяк ісці”), а разам з ёю і іншыя, больш практычныя справы. Кужалі мяркуюць аддаць сына на вучобу ў народнае вучылішча ў бліжэйшым гарадок Камянец, каб ён змог вывучыцца на настаўніка. Здольнасці Лявонкі, а таксама магчымасць атрымання адукацыі за казённы кошт з'яўляюцца пераканаўчымі аргументамі пры няпростым вырашэнні гэтага пытання. Тут жа, у размове за абедзеным сталом, узнікае ўпершыню і амерыканская тэма. Гаспадар сям'і Міхаль Кужаль згадвае Амерыку як заможную краіну, дзе, па чутках, пануе справядлівасць.

Пазней неаднойчы яшчэ будзе з'яўляцца ў размовах і думках прускаўцаў вобраз далёкай, пэўным чынам міфалагізаванай краіны. У кампазіцыйна-сюжэтным разгортванні рамана вялікае значэнне мае сістэма ўзаемазвязаных вобразаў і матываў, якія надаюць хадзе падзей дадатковы сімвалічны падтэкст, садзейнічаюць успрыманню мастацкай рэальнасці ў яе шматпланавасці і патэнцыйнай невычарпальнасці. Лейтматыў, з дапамогай якога суадносяцца розныя жыццёвыя прасторавыя сферы ў рамане, дае магчымасць чытачу скласці больш поўнае ўяўленне аб прадвызначанасці і абумоўленасці з'яў, сувязі таго, што адбываецца тут і зараз, з тым, што падсцерагае герояў у будучыні.

За сто гадоў, якія аддзяляюць нас ад падзей, апісаных у рамане, вельмі многае змянілася ў свеце. Змяніліся таксама і эстэтычныя, філасофскія крытэрыі, паводле якіх ацэньваецца сутнасць працэсаў, што маюць культуратворчае і духоўнае значэнне. Але з тым большай цікавасцю звяртаюцца сёння і мастакі, і даследчыкі да пачатку XX стагоддзя — аднаго з важнейшых перыядаў фарміравання нацыянальнай светапогляднай сістэмы.

Пры тым, што ў рамане У. Гніламёдава дамінуе эпічны спосаб выяўлення, нарматыўная структура “Уліса з Прускі” ўяўляе сабой складаную, поліфанічную спалучанасць розных пунктаў гледжання. Вядома, найбольш блізкім да пазіцыі аўтара-апавядальніка з'яўляецца светабачанне Лявона Кужаля. Менавіта гэты герой найпаўней раскрывае свой унутраны духоўны патэнцыял, выяўляючы пры гэтым павышаную чуйнасць да ўсіх праяў навакольнага свету. У дадзеным выпадку адбываецца вельмі цеснае паяднанне аўтарскага аповеда з унутраным голасам самога героя.

Пры такім абвостраным успрыманні практычна немагчыма раздзяліць аўтарскае і персанажнае маўленні, якія зліваюцца ў адзінае пачуццё ўсеабдымнай далучанасці да экзістэнцыяльнай прасторы. Вось як, напрыклад, апавядаецца пра пачуцці галоўнага героя, якія заваладваюць ім з надыходам вясны: “Пачыналася вясна вады. На Лосне зашумеў крыгаход. І як бы ні паланілі Лявонку кнігі, але вясна разварушыла і яго. Ноччу ў вокны Нохімавай хаты ціха струменілася зеленаватае святло сакавіцкіх зораў, а выйдзеш з хаты — запахне свежасцю ранішняя далячынь...” У гэтым акварэльна акрэсленым малюнку злітнасці прыроднага і асабовага звяртае на сябе ўвагу тое, што герой выяўлены адначасова і са знешняга ў адносінах да яго пункта погляду, і знутры. Тым самым дасягаецца эфект *прысутнасці* ў гэтым канкрэтным месцы і падключанасці да дадзенай сітуацыі не толькі аўтара і яго героя, але і чытача.

Трэба зазначыць, што вопыт даследчыка літаратуры, тонкага знаўцы сакрэтаў мастацкай творчасці, несумненна, дапамагае У. Гніламёдаву ў выбудоўванні стратэгіі разгортвання літаратурнага дыскурсу. Таму эпічны лад яго рамана ўзбагачаецца з улікам найноўшых дасягненняў сучаснай апавядальнай паэтыкі. Аўтар смела ўводзіць у структуру твора свае ўласныя развагі і назіранні, падключае час ад часу да сюжэтна-апавядальнай плыні гістарычныя каментарыі, у якіх дае агульную характарыстыку эпохі, узнаўляе асобныя бакі традыцыйнага побыту беларускага сялянства.

На самым пачатку рамана робіцца экскурс у гісторыю краю, які, з'яўляючыся ў мінулым часткай ВКЛ, здаўна вызначаўся сваёй нацыянальна-этнаграфічнай адметнасцю. Героі рамана, жыхары заходнепалескай вёскі Пруска — нашчадкі старажытнага славянскага племені з багатай гісторыяй. Гісторыя, можа, непасрэдна і не ўсведамляемая большасцю насельніцтва, дае аб сабе знаць шматлікімі памяткамі, з якімі мясцовы чалавек сутыкаецца ледзь не на кожным кроку. Яна — у назвах паселішчаў і ўрочышчаў, у велічнай Камянецкай вежы, што ўзносіцца над наваколлем. Прызнаючы сваіх герояў на дадзеным прамежку часу “адлучанымі ад гісторыі”, аўтар разам з тым заўважае, што “жылі яны адкрыта, умелі размаўляць з зорамі і Сусветам, чуць, як расце трава і шэпчацца з берагам вада...” Спрадвеку яны ў згодзе з прыродай. Апазіцыя *прырода — культура (навука)*, як адна з ключавых у светаразуменні пары нацыянальнага адраджэння, у многім прадвызначае напрамак сюжэтнага развіцця і характар унутранага канфлікту ў рамане У. Гніламёдава. З ёю пэўным чынам стасуюцца, уступаюць ва ўзаемадзеянне і сацыяльныя пытанні. Прага да навукі валодае вясковым падлеткам Лявонкам Кужалем. І выкіроўвае яна яго напачатку на той жа шлях, па якім ішлі многія сялянскія дзеці ў пошуках ведаў і шырэйшай сферы прыкладання сваіх здольнасцей. Народнае вучылішча — тая першасная прыступка, на якую ўзыходзілі будучыя народныя асветнікі, народныя інтэлігенты.

Лявонка Кужаль таксама трапляе ў такое вучылішча ў родным мястэчку, дзе юнаку адкрываюцца перспектывы грамадзянскага сталення, асабовага сцвярджэння ў соцыуме. Новыя ідэйныя павевы, усё, што несла з сабой новае неспакойнае стагоддзе, так або інакш закранаюць свядомасць хлопца з Прускі. Аднак лёс складваецца так, што Лявону даводзіцца пастаянна вяртацца з бліжніх і дальніх вандровак дадому, да сваіх радавых вытокаў, у стыхію спрадвечнага бытавання ў згодзе з зямлёю-карміцелькай. Спачатку Лявон вымушаны пакінуць вучобу ў вучылішчы і мару пра настаўніцкую прафесію ў сувязі са смерцю бацькі. Ён становіцца апорай сям'і, на ім ляжыць галоўны клопат па гаспадарцы. Імкненне выбавіцца з ціскоў панскай пазыкі, умацаваць сваю гаспадарку прыводзіць затым хлопца да думкі пра ад'езд у Амерыку на заробкі.

Нялёгкім аказалася гэтае падарожжа, планаванае напачатку вяртанне дадому адразу пасля атрымання дастатковай сумы, каб разлічыцца з панам Падгурскім, адкладвалася на няпэўны час і ажыццявілася толькі праз доўгія, насычаныя цяжкай працай і выпрабаваннямі сем гадоў. Праца ў Нью-Йорку мыйшчыкам вокан хмарачосаў, наёмным работнікам на ферме (пацягнула да зямлі), рыбалоўства на Вялікіх азёрах, якое ледзь не скончылася трагічна для героя, — усё гэта загартоўвала волю юнака, давала яму багаты матэрыял для вывучэння жыцця. Лявон пераканаўся на ўласным вопыце, што мара не заўсёды адпавядае сапраўднасці, што нялёгка жывецца працоўнаму люду і ў краіне, куды такія, як ён, заблукалі ў пошуках долі. У той жа час Кужаль прыкмячае ў чужым краі ўсё, што спрыяе лепшаму ўладкаванню жыцця, садзейнічае развіццю творчага патэнцыялу чалавека. Пастаянна адбываецца аналітычная праца па супастаўленні: а як бы гэта, убачанае тут, магло дзейнічаць там, дома?

Уладзімірам Гніламёдавым створаны шматпланавы эпічны твор, у якім экзістэнцыйныя прастора і час герояў разгортваюцца суадносна з рухам гістарычнага часу, з духам і чаканнямі эпохі. Глабальныя змены ў светаадчуванні і ладзе мыслення чалавека XX стагоддзя, сведчыць аўтар, не абыходзяць стараною беларусаў. Аднак, як можам мы пераканацца, надзвычай важнай застаецца пры гэтым тая праўда, якая сыходзіць ад укаранёнасці чалавека ў радавое жыццёвае асяроддзе, яго знітаванасці са спрадвечнымі быццёвымі законамі і маральнымі каштоўнасцямі.

Яўген ГАРАДНІЦКІ

Гніламёдаў Уладзімір. Уліс з Прускі: Раман. — Мінск: “Мастацкая літаратура”, 2006. (Беларуская проза XXI стагоддзя).

Светлы ручаёк памяці

У Брэсцкім аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі ўбачыў я гэтую кнігу, якая выйшла ў свет у ААТ “Брэсцкая друкарня” напрыканцы 2006 года. “ОПАЛЁННЫЕ ВОЙНОЙ”. 60-летию Великой Победы и освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков посвящается... Аўтар — Васіль Філіпавіч Маркаў.

Назва, як і блікі на бліскучай каляровай вокладцы сімвалічных сполахаў далёкай ваеннай навальніцы, калоны танкаў Т-34 на маршы з чырвонаармейцамі-вызваленцамі на брані і белым асабістым нумарам 301 на вежы галаўной машыны, адразу перанеслі ў ваеннае ліхалецце.

Галоўная вартасць кнігі — яе канкрэтнасць. З'яўляючыся свайго роду працягам гісторыка-дакументальнай кнігі “Памяць. Маларыцкі раён”, яна прапануе чытачу звесткі аб франтавіках — жыхарах Маларыцкага раёна, што вярнуліся з вайны дамоў. Прычым пададзены яны нестандартна, як бы вянчаючы раздзелы пра галоўныя ваенныя аперацыі Вялікай Айчыннай вайны з кароткімі біяграфічнымі даведкамі франтавікоў-маларытчан, якія ў гэтых бітвах удзельнічалі. Два заключныя раздзелы маюць загалоўкі “Общественные музеи района” “Памятники павшим на территории Малоритского района”. Тыраж у дзве сотні экземпляраў, без сумнення, удзесяцярыцца і ўзрасце яшчэ ў разы, калі кнігі будуць чытаць на ўроках мужнасці ў школах раёна і Маларыцкім ліцэі, пагартаюць у бібліятэках Брэстчыны і іншых месцах Беларусі, Расіі, Украіны, убачаць у грамадскіх музеях Маларыцкага раёна.

Аляксандр ЮДЗІЦКІ



Для мяне кожная новая кніга Фелікса Мысліцкага — своеасаблівае адкрыццё. Як быццам і знаёмы даўно з творчасцю гэтага выдатнага паэта, ды ўсё адно чарговая сустрэча з ёй прыносіць задавальненне. Яно і зразумела: прастора душы не трывае пустэчы. А ў жыцці надараюцца моманты, калі раптам пачынаеш адчуваць, што чагосьці табе не стае. Тады выйсце знаходзіш у тым, каб разгарнуць кнігу паэзіі любімага аўтара, у якой —даўно ўпэўніўся — ёсць вершы, што прыносяць не проста задавальненне сваёй мастацкай дасканаласцю, але і выклікаюць пачуцці, думкі, сугучныя тваім пачуццям, думкам.

Мелодыя скрыпкі, узятай у ветра

З такім адчуваннем раскрываў і кнігу Ф. Мысліцкага "Световые птицы". Праўда, спачатку крыху насцярожыўся. Усё ж, прызнаюся шчыра, я куды большы прыхільнік паэзіі традыцыйнай, класічнай, гэты ж зборнік цалкам складаецца з афарызмаў, верлібраў, дый тры паэмы, што ўвайшлі ў яго, таксама нясуць у сабе вольную плынь паэзіі, як бы вырастаючы з саміх афарызмаў. Вядома, і ў папярэдніх кнігах Ф. Мысліцкага былі падобныя творы, але там яны суседнічалі з іншымі, а тут, лічы, аб'ёмны том — больш як дзесяць улікова-выдавецкіх аркушаў, ці не завельмі?

Аднак як хутка гэтая насцярога з'явілася, гэтаксама маланкава яна і знікла. Хіба ж можа быць зашмат свежага паветра? Няўжо настаюць моманты, калі надакучвае блакіт нябёсаў, а хуткая плынь рачулкі пачынае раздражняць? А пах свежаскошанай травы падаецца нечым чужым, пазбаўленым нерушавасці водару? Калі б хто-небудзь паспрабаваў падобнае сцвярджаць, яго, у лепшым выпадку, палічылі б дзіваком. Паэзія ж Ф. Мысліцкага — гэта і бясконцасць неба, і крынічная чысціня вады, і азонавая свежасць пачуццяў, і вабнасць луга, на якім краскі, што ляглі ніц на пракосы, працягваюць дарыць радасць.

У рэшце рэшт, як мне здаецца, Георгій Марчук нават лепш прыкмеціў усё гэта (ягоныя словы вынесены на чацвёртую старонку вокладкі): "Фелікс Мысліцкі — паэт першай велічыні. Ён цудоўна ўвабраў у свае паэтычныя радкі светлы смутак Ясеніна, душэўнасць Пушкіна, разважлівасць Гётэ, пяшчоту Коласа, філасафічнасць Тагора, эпічнасць Дантэ". Хіба што ў сувязі з гэтым неабходна адно ўдакладненне: працягваючы традыцыі сусветнай паэзіі, Ф. Мысліцкі нязменна застаецца самім сабою, пішучы так, каб слова знайшло ў душы чытача належны водгук.

Падобная акалічнасць немалаважная, бо, як вядома, можна стаць віртуозам у паэзіі і пры гэтым застацца паэтам кніжным, далёкім ад жыцця і аўтаматычна ад таго, каму адрасавана напісанае. Грані паэтычнага алмаза, безумоўна, адшліфуюцца бездакорна, але яны так і застануцца назаўсёды халоднымі. Тое ж самае тычыцца і пашырэння творчых абсягаў. Паэзія Ф. Мысліцкага тым і адметная, што пры ўсім сваім сяганні ў касмічныя высі, яна ўсё ж застаецца паэзіяй зямной. Паяднанасць чалавека і вечнасці — скразная лінія новых вершаў творцы:

Уходят тайны куда-то
выбиты окна у дали
в них чьи-то лица стоят
звук отражается в молчании
небо нынче синей от того
что в нём повторяются
наши глаза
скрипку у ветра возьми
играй лицо к лицу с вечностью

Па сутнасці матыў, блізкі гэтаму, гучыць і ў паэме "Птицы лазури":

не забывай язык вечности
будешь общаться с ней
будешь возвращать
упавшие звезды на небеса
будешь поднимать невесомое

На мове вечнасці, кранаючы струны скрыпкі, узятай у ветра, у самой прыроды, і нараджае паэт тую дзівосную мелодыю, у якой нязменна знаходзіцца месца каханню да блізкага чалавека, любові да ўсяго таго, што акаляе цябе, а філасофская напоўненасць радка выклікае самыя розныя асацыяцыі. Аднак, якімі б яны ні былі, усё адно адчуваецца важкасць думкі, што мацуецца шчырасцю споведзі лірычнага героя. Яго разумееш, як разумееш самога сябе ў моманты нейкага асаблівага азарэння, якое прыходзіць нечакана, абнаўляючы душу. Каханне лірычнага героя становіцца часткай і твайго пачуцця. Хіба толькі часам даводзіцца шкадаваць, што яно па розных прычынах так і засталося да канца не выяўленым, цалкам не раскрытым, а цяпер, на жаль, рабіць гэта неяк і пазнавата:

Я зацелую тебя и выпью печаль
из твоего лица
мое слово дружит
с твоим словом
походка моя повторяет
твою походку
наши пути слились в один
я дал ему имя
оно звучит истиной
его замечает небо
выйдем в заоконье
дождь смыл следы
кроме своих
как хорошо звучит на ветру
твое струнное тело

А якая метафарычная насычанасць радка ў гэтым, таксама вершы:

Сочится заря
в зрачках земляных
туманятся лица пространства
захлебнулся росинкой звук
вода набегавшись
отдыхает во впадине
воздух прирос к земле
его не повалит ветер
странно выпрямилась тишина
заговорила дорога
проходят глаза сквозь глаза
пора отращивать крылья

Крылы неабходныя тым, хто прагне палёту, але пакуль няздатны ажыццявіць яго. Лірычны герой Ф. Мысліцкага і падказвае шляхі да ажыццяўлення гэтага, бо сам ён увесь час у руху, напоўнены прагай пазнання чагосьці новага, яму цесна на зямлі, але ён і не ўяўляе сябе без яе. А яшчэ ён не пазбаўлены афарыстычнага ўспрымання рэчаіснасці. Аднак калі ў вершах гэта праглядваецца толькі месцамі, дык самі афарызмы — сапраўдная скарбонка думак. Яны — па сутнасці тыя ж вершы, але найчасцей аднарадковыя. Шчодры россып думак, метафарыстычная сціслацсь іх, а за гэтым — глыбокі сэнс: "глаза пустоты не старятся", "отними высоту у неба и оно упадет", "между правдой и истиной требуется вечность", "тесна ночь в которую не заходят сны"...

Можна працягваць цытаваць, бо ў кнізе змешчана ажно 1590 афарызмаў! Таму невыпадкова, што сярод іх лёгка знайсці сапраўдныя "изюминки". Але разам з тым такая колькасць у адной кнізе ўсё ж крыху насцярожвае. Не хацелася б, каб пісанне іх ставілася ледзь не "на канвеер", бо цяжка падабраць столькі арыгінальных, а галоўнае — "думкаёмістых" афарызмаў. Дый сямтам у вершах відавочная перакліччка з самім сабой, аднак гэта, безумоўна, ні ў якім разе не можа засланіць таго галоўнага, што выносіш для сябе пасля прачытання новай кнігі Ф. Мысліцкага: ён — сапраўды паэт першай велічыні. У яго не лішне было б павучыцца каму-небудзь з тых пісьменнікаў (не толькі паэтаў), каго паспелі ўжо зрабіць ледзь не класікамі.

Ды гэта ў пэўнай ступені таксама, як кажуць, справа густу. Каму падабаецца Андрэй Хадановіч, каму — Югася Каляда, а мне Фелікс Мысліцкі. Я не збіраюся некаму навязваць сваю думку, проста не магу яе не выказаць. Кажучы словамі Сакрата, "Я не думцы вучу, а думанню". Дарэчы, менавіта іх Ф. Мысліцкі ўзяў эпіграфам да сваіх афарызмаў.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Дзіва дый годзе

Паэтка Аўгіння Кавалюк выдала ў Санкт-Пецярбургу некалькі кніжак для самых маленькіх чытачоў, у тым ліку і з паралельнымі перакладамі на рускую мову ("Дзе схавалася вясёлка?", "Сямейкі", "Палічы старонкі", "Белае дзіва"). У гэтым жа радзе і перакладзеная ёй на беларускую мову кніжка для дзяцей рускага паэта Мікалая Бутэнкі "Блакітнае Залюстэр'е".

Асобнымі кішаньковымі выданнямі выйшлі на абедзвюх братніх мовах зборнічкі вершаў "Нашы кашы" ("Наши каши").

Паэтычны талент Аўгінні Кавалюк, якая даўно жыве за межамі Беларусі, не падлягае сумненню (выходзілі кніжкі вершаў паэткі, пра яе творчасць пісалася шмат пазітыўнага ў нашым перыядычным друку). Але пра здольнасці Аўгінні Трафімаўны да дзіцячай літаратуры даведваюся ўпершыню, па сутнасці, гэта для мяне сапраўднае адкрыццё. Вядома, што разуменне і тонкае вычуванне дзіцячай душы яшчэ не знак таго, што ты зможаш словам дастукацца да эмацыянальнай неаперанай натуры. Аднак шматгадовы настаўніцкі вопыт і нажытая з узростам мудрасць разам з жаночым інстынктам і мацярынскімі пачуццямі любові і дабрыні, гарманічна ўзважаныя і ўзвышаныя адметным творчым паэтычным дарам, прынеслі нечаканы мастацкі плён.

Усе стварэнні Божыя
Разумныя, прыгожыя,
Сытыя, рахманыя.
Ну, і паслухмяныя.
Абыходзіць кот сабаку,
Не пачне ён першым драку.

Нельга не заўважыць, што ёсць у гэтых кніжачках і дробныя недагляды , памылкі ды апіскі (скажам, у гэтым выпадку, рускае слова "драку" я замяніў бы на беларускае *"сварку"*). Але як для рускамоўнага асяроддзя і відавочнай выдавецкай самадзейнасці, то ўсе гэтыя выпадковыя агрэхі выбачальныя. Нязначны і наклад кніжачак. І ўсё ж калі хоць сто санктпецярбургскіх дзетак прачытаюць (ці хоць бы прагледзяць-праслухаюць) гэтыя зборнічкі – карысць ад таго нам (беларусам) будзе вялікая і неацэнная. У чужой хаце, як кажуць, гаспадаром быць не выпадае... Таму напрыканцы, відаць, да месца будзе працытаваць перакладзены А. Кавалюк верш упомненага вышэй рускага паэта М. Бутэнкі "Воўк":

На палянцы воўк сыночку
Цыраваў штаны й сарочку.
Клаў на дзірку ліст зялёны, –
Пазычаў яго у клёна.
Вожык, што жыве ля ёлкі,
Пазычаў яму іголкі.
Замест нітак павуцінкі
Зняў яму павук з асінкі.
Ах, як новая сарочка
Зноўку будзе у сыночка!

Хоць яшчэ з часоў Чырвонай Шапачкі вядома нам, што воўка ў любой апратцы зубы выдаюць...

Смяюся, смяюся, бо, адчуваю, што сёння гэта ўжо і дзецям смешна... За што дзякуй паэтам і нашай зямлячцы ў Паўночнай Пальміры Аўгінні Кавалюк у прыватнасці.

Леанід ГАЛУБОВІЧ

Часопіс альтэрнатыўнай літаратуры

Пабачыў свет трэці нумар літаратурна-мастацкага праекта "Тэксты". Гэтае выданне выгодна адрозніваецца ад іншых такога кшталту часопісаў сваёй канцэптуальнасцю і дэмакратычнасцю: зыходзячы з апублікаваных матэрыялаў можна меркаваць, што з "Тэкстамі" супрацоўнічаюць найбольш вядомыя сучасныя аўтары — пісьменнікі, філосафы, літаратуразнаўцы, культуролагі. На старонках часопіса можна пабачыць імёны Юрася Барысевіча, Валянціна Акудовіча, Адама Глобуса, Альгерда Бахарэвіча, Ірыны Шаўляковай, Аксаны Бязлепкінай, Зміцера Вішнёва, Сержа Мінскевіча, Зміцера Серабракова і многіх іншых.

Канцэпцыя выдання палягае ў адкрытасці, у закліку да дыялога: калі паэты Віктар Жыбуль і Адам Шостак напрыканцы сваіх артыкулаў запрашаюць чытачоў да супрацоўніцтва, яны, па сутнасці, прапаноўваюць ім стаць сааўтарамі, судэміургамі мастацкай прасторы. У такім выпадку літаратурнае выданне перастае быць эстэтычнай рэзервацыяй, дзе маюць пачэснае права друкавацца толькі пэўныя адыёзныя асобы, якія пішуць элітарныя творы для не меней элітарнага, вузкага кола чытачоў. Часопіс ператвараецца ў дыскусійную прастору, у множнаснае поле інтэрпрэтацый. Дыскусійнасць выражаецца таксама і ў тым, што матэрыялы не вытрыманы ў адзіным правапісе: кожны аўтар абраў тую пісьмовую традыцыю, якая яму даспадобы. Інакш кажучы, чытач, разгарнуўшы "Тэксты", мае цікавую магчымасць адчуць, як на ягоных вачах адбываецца літаратурны працэс, мала таго, ён пры жаданні сам можа далучыцца да фарміравання гэтага працэсу.

Трэці нумар выдання адкрываецца культуралагічным эсэ Юрася Барысевіча "Тактыка і стратэгія альтэрнатыўнай літаратуры", асноўнай мэтай якога з'яўляецца пераасэнсаванне асноўных ідэй філасофіі постмадэрнізму ў іранічным ключы (з'яўляецца прыемнае здзіўленне: няўжо і мы, гаротныя інтэлектуалы, дараслі нарэшце да еўрапейскасці?). Спадар Барысевіч заўважае: "Насьпеў час перагледзець канцэпцыю трынітарнай шызафрэніі пісьменьніка, замацаваную ў літаратуразнаўстве Ралянам Бартам (аўтар — скрыптар наратар)", і тым самым прапануе шматлікія эстэтычныя формы існавання літаратуры ў нашую інфармацыйную эпоху, пазбаўленую духоўнасці. Натуральна, паколькі жыццё поўнае парадоксаў і абсурду, то менавіта да іх апелюе Ю. Барысевіч, калі апісвае літаратуру як такую: "Бібліятэка будучыні, мяркую, будзе нагадваць парк атракцыёнаў альбо псыхіятрычную клініку, дзе чалавек зможа перажыць любы абраны ім ці зададзены па школьнай праграме твор"; "каб ахапіць усе сэнсы тэксту і нават тыя, пра якія ня ведае сам аўтар, перад чытаньнем трэба падмацаваць свой позірк адмысловай дыетаю, дыхальнымі практыкаваньнямі, напружваньнем у пэўнай пасьлядоўнасьці мускулятуры цела". Можна меркаваць, што Ю. Барысевіч прапануе пэўнага кшталту тлумачэнне рэдакцыйнай палітыкі часопіса, які збольшага прысвечаны авангардной (альтэрнатыўнай) літаратуры.

Артыкулы і эсэ, змешчаныя ў трэцім нумары "Тэкстаў" маюць пераважна аналітычны, філасофскі, літаратуразнаўчы характар. У якасці прыкладу можна прывесці матэрыялы з рубрык "Тэорыя", "Крытыка", "Бум-Бам-Літ". Уласна мастацкія творы, у тым ліку пераклады з Альберта Маравія, Себасцьяна Каля і Мар'яна Пала, а таксама п'есы з некалі не выдадзенага зборніка "Нетутэйшыя" і літаратурныя спробы маладых беларускіх авангардыстаў-пачаткоўцаў (Аляксея Талстова, Кацярыны Шкоды, Юрася Ленскага etc) выглядаюць сціплым давескам да асноўнага корпуса тэкстаў. Зрэшты, гэтак жа ўспрымаецца і музычны дыск эксцэнтрычнага гурта "Краджа золата", які прыкладаўся да пэўнай часткі накладу часопіса і які з'яўляецца адным з найбольш абсурдысцкіх праектаў айчыннага андэграўнду ў самым брутальным яго варыянце. Таму, згодна са сваёй тэматычнай разнастайнасцю, выданне зацікавіць не толькі вытанчаных інтэлектуалаў, але і нефарматную публіку. Магчыма, менавіта ў гэтым заключаецца перспектыўнасць літаратурна-мастацкага праекта "Тэксты" і яго папулярнасць сярод чытачоў.

Марцін КОТ

Анатоль ЗЭКАЎ

Матуліна хата

Тут ноч усю гарыць святло.
— Не спіцца, —
кажа маці.
А можа, хоча, каб было
і ноччу светла ў хаце.

Гарыць святло,
а я заўжды
яму чамусь не рады.
Святло — як быццам знак бяды,
як SOS, што кліча ў хату.

Ідылія вясковага двара

Ідылія вясковага двара.
Сабака. Кот. Карова.
І ў штабялёчку дровы.
Ва ўсім у добрага гаспадара
заўжды парадак,
чысціня
і лад.

І трэскі аніводнай —
усё, бы ў вёсцы роднай,
дзе без мяне дзічэе бацькаў сад
(і без мяне, і без унукаў),
дзе
травеюць моўчкі грады
і двор, які так рады,
калі прыеду я хаця б на дзень.
Ідылія вясковага двара.
Сабака. Кот. Карова.
...А што, калі, як дровы,
мае ўспаміны дагараць?

У верасні

Здаўна люблю я ў верасні
па лесе паблукаць,
там, дзе грыбы у верасе,
стаіўшыся, стаяць.

Схаваліся пад лісцікі
са шляпкамі ажно,
нібыта ад нячысціка
двухногага з нажом.

Іх выглядзю і ў верасе— ‘
ці то ж не дзівакі?
І будуць пахнуць вераснем
мае баравікі.

Сцежкі маленства

Пазатравелі сёння сцежкі,
якімі я, хлапчук-грыбнік,
у лес ажно ляцеў па ўзмежку,
каб зрэзаць першы баравік.
А там — другі, глядзіш, і трэці,
і што ні грыб — краса адна.
Затым лічылі з братам Пецем,
набраў грыбоў хто болей з нас.
Дамоў ішлі заўжды няспешна:
як нам зайздросцілі сябры!

...Сягоння затравелі сцежкі —
няма каму іх больш тарыць.

Конніца

Плачуць сосны векавыя,
бо на іх яшчэ вяку,
пэўна, коні вараныя
не адольвалі раку.
У апошні раз іржалі
коні, трапіўшы ў віры...
Рэчку Конніцай назвалі
з той далёкае пары.

...Рэчка ўжо не тая сёння —
ні віроў тых, ні вады,
і ў рацэ купаюць коней
без ніякае бяды.
Ды згадаецца ў сутонні
мне на выспах баравых,
як тапіла рэчка коней,
гэтых мілых вараных.
Страпянецца ўмомант сэрца,
сцісну пугаўё ў руцэ,
бо яшчэ дасюль здаецца:
коні тонуць у рацэ.

Пасля ліўня

На стыку ліпеня і жніўня,
як бы падкраўшыся здаля,
зямлю памылі шчодра ліўні,
каб чыстаю была зямля.

Яны рупліва шчыравалі
без перапынку на абед.
Здаецца, так адшаравалі,
нібы паркетчыкі паркет.

Аднак не стала больш прыбранай
зямля,
як і само сяло,
бо столькі друзу з-пад парканаў
раней нябачнага ўсплыло...

Згадка пра Кускоўскі парк

Кускоўскі парк — такі далёкі,
як і гады майго юнацтва.
Зноў над табой плывуць аблокі,
наўкола людзі мітусяцца,
у возера палац глядзіцца,
нібы ў чароўнае люстэрка,
і сонца на ваду садзіцца,
і хтось каханне кліча:
— Верка!
У чоўне зноў вяслуе лета
па хвалях, як па небнай высі.
...Аднак плывём не мы ў чаўне тым,
а іншы хтось, як мы калісьці.

* * *

Як не забыць жанчын імёны,
што мной шапталіся ўначы;
як не забыць саміх жанчын,
чые сляды даўно замглёны;
як захаваць мне успаміны
пра кожную з маіх жанчын;
як крыкнуць ім, што я — адзін
і стаць хоць для адной адзіным...

* * *

З водаправодных труб
дыхне, як з нейкіх спратаў.
Я не паставіў зруб,
не кажучы пра хату.

Я дрэва пасадзіў.
Яго ж — ці то не гора? —
буран абцерабіў,
затым зламаў пад корань.

Судзіць ці не судзіць —
дарэмная гамонка!
Я сына нарадзіў?
Дык то ж не я,
а жонка.

Няўжо нічога сам
не змог займець, аднак, я
і сыну перадам,
як кажуць,
дулю з макам?

З гада́мі...

З гада́мі хочацца часцей
пабыць чамусьці аднаму.
Старэю, пэўна, і таму
у доме менее гасцей,
і сам у госці не лячу
па першай позве, як раней.
Не цягне да гульбы мяне —
я засяродзіцца хачу,
каб дні і ночы, што былі,
згадаць
і ўсе мае гады.
І ў тым ніякае бяды,
што я адзін
на ўсёй зямлі.

Таццяна СТАРАСЦЕНКА

У палоне Баха

Нічога не жадаю ў гэты вечар:
чаруе існасць музыкі святой.
Да мрояў-птахаў
дакранецца Вечнасць
і ўздыме іх над грэшнаю зямлёй.

Святкуюць думкі радасць абнаўлення
і з гукамі ляцяць увышыню,
дзе зоры, бы агеньчыкі збавення,
анёл святлом таемным ахінуў.

Мінулае патоне ў багне змроку
пад цяжарам раструшчаных надзей.
Сустрэне золак праведнай дарогай,
і будзе дабрынёй спавіты дзень.

Лістападаўская шчодрасць

А помніш? Залацісты лістапад
ласкавым промнем цалаваў далоні.
А мы кідалі словы неўпапад
у задуменнасць рыжага палону.

Зрываў вятрыска сумных галубоў
з далёкіх і даўно забытых дахаў.
І нас, прыціхлых,
з вулак гнаў дамоў
у валадарства яблычнага паху.

Не пажадалі з восені ўцячы
і па хвілінах доўжылі сустрэчу,
пакуль заснуў на гарадскім плячы
такі прастуджаны і золкі вечар.

...Калі ж пачуццяў
светлы лістабой
змяце зіма і ціха стане ў хаце,
як дзеці, заблукаем мы з табой
у залаціста-шчодрым лістападзе.

Белы пух успамінаў

Час спыніўся... Хвіліна – як век
у суладдзі пачуццяў і думак.
З-пад пушыста-бялюткіх павек
паглядалі таполі на вулках
на маленькі агеньчык, які
ўсё зырчэй разгараўся цяпельцам
ад пяшчоты каханай рукі
і ад шчасця трывожнага сэрца.
Кожны год белы пух – успамін
светла-сумны і крышку тужлівы:
мы з табою – адзін на адзін,
і як вечнасць –
кахання хвіліны.

* * *

Калі ападзе лістота
на брук схаладнелых вулак
і не заблукае ў пальцах
наўздзіў асцярожны прамень,
няхай, як тады, — ці помніш? –
сцішанасць парку прытуліць
і дрэвы схаваюць моўчкі
ад свету ў бязмоўнасць наш цень.

Забудзеш? (Навошта згадкі?)
Наросхліст акно – у снежань,
дзе рухі сняжынак – гукі
скрыпічнай “Зімы” Вівальдзі.
Чароўная споведзь стрэчы
у позірках, жэстах. На снезе –
сляды ў бясконцасць. А можа,
так толькі будзе здавацца?

У жніўні прысніцца восень.
Спытаеш: “Няўжо так хутка?”
І стомішся ад падлікаў
(такі ўжо, маўляў, наш час!)
А дзесьці ў парку кастрычнік
адчуе асенні смутак,
не прычакаўшы з букетам
да першага зазімку нас.

Пяшчота

Якія пяшчотныя пальцы твае!
Маўчанне ў адказ.
Няўжо гэта дождж
дакрануўся на хвілю і знік
у травы, у кветкі, у дрэвы,
каб іх перайначыць?..
Ды толькі ранейшыя мы.

Надзея

Адплакала восень
самотным каханнем,
зіма падарыла бязважкасць і ростань.
Ды недзе глыбока жыло спадзяванне
на зорнае лета, на шчодрую просінь.

Чакаць. Сумнявацца. Забыць.
І аднойчы
раптоўна сустрэць
пад залевай ці снегам
таго, хто не здрадзіць,
не кіне, не збочыць,
адзінага ў свеце, свайго чалавека.

Лёля БАГДАНОВІЧ

Ахвярам Чарнобыля

Зямлю праменнем лашчыць сонца,
Нябёсы — вымытае шкло.
Але паўсюль цікуе стронцый
І цэзій распасцёр крыло.

Не ўратавацца, не схавацца,
Не адкупіцца аніяк.
Як з гэтай нечысцю змагацца,
Суседзе, дружа, мой зямляк?!

Калі б магла, сваё я сэрца
На здзек пачвары аддала,
Каб кожная вясна на свеце
Усмешкай на вачах цвіла.

Каб назаўсёды знікла ліха
Хвароб чарнобыльскай бяды,
Каб рэха слёз і страт заціхла
І знікла гора назаўжды.

Няхай жыве у сэрцах згодных
Спатканне свята і каханне,
А разам з ім — замілаванне
Красою краявідаў родных.

Тэкст і фота
Васіля Жуковіча

Нататнік

Уладзімір СЦЯПАН

МАСТАК І ПАВУК. У мастака ў майстэрні завёўся павук. Другі б выкінуў яго, змёў на падлогу, расцісну абцасам і забыўся думаць. Мог акно адчыніць, калі забіць не здатны, каб сам вылез, жыццё ўратаваў. Але самотны, немалады мастак пачаў павучка даглядаць-гадаваць. Лавіў павучку мух, вос, мурашоў там розных, і з крылцамі і бяскрылых. Кідаў у павуту і глядзеў, як гадаванец харчуецца. Перажываў, калі не было чым пачаставаць маленькую істоту. Усё ў чалавека і павучка ішло добра. Павучок зрабіўся павуком. Даволі ладным. Мастаку не было чым плаціць за майстэрню, бо карціны яго не куплялі, і таму загадалі казённую майстэрню вызваліць. Мастак так распераживаўся, што ад гора памёр. Новы гаспадар прыйшоў у майстэрню. Павук глядзеў на яго з-за скрыні, пачастунку чакаў, лапкамі варушыў. Новы гаспадар майстэрні пражыў тыдзень. Казалі, што хацеў адзінае, сто гадоў нямытае, акно працерці. Адчыніў яго і выпаў на вуліцу.

Наступны мастак лямпачку пад столлю палез мяняць. Стол, на стол крэсла, а на крэсла скрыню. Паспеў толькі лямпачку выкруціць... Захісталася скрыня, бразнуўся мастак на падлогу — хрыбетнік зламаў....

P. S. Каму толькі не прапаноўвалі тую нешчаслівую майстэрню — усе адмаўляліся. Павук чакаў, чакаў новага гаспадара і памёр.

* * *

СЮЖЭТ. Дзяўчаты жылі ў адным пад'ездзе, вучыліся ў адным класе... Алька штурханула сяброўку ў спіну, калі тая чапляла шторы. Верка ўпала на асфальт і забілася. Дом стары — шосты паверх высокі. Аліна выйшла з кватэры сяброўкі. Сышла паверхам ніжэй — бацькі яшчэ не вярнуліся з працы. Пусціла ў ванну гарачую ваду, распранулася і легла.... Дзяўчыну калаціла. Учора яны даведаліся, што адна паступіла ў інстытут, а другой не хапіла бала. Але яны не ведалі, што сёння ў інстытуце прынялі рашэнне дабраць на першы курс яшчэ дваццаць чалавек. Аліна Мацур, якая ляжала ў гарачай вадзе, па новым спісе ішла трэцяй...

* * *

АДАМ. Адам дагнаў мяне перад лесам. Не дзіва, мне адзінаццаты, у мяне цяжкае вядро з ягадамі. Баба навыбірала і я вязу іх у Касцюкоўку. Ягады прыкрытыя белай хусткай, на ёй — колькі чырвоных плямак, праступае сок. Адам — марак. Ён лёгка падхапіў маё вядро, быццам яно бязважкае. Адам руды, сінявокі, гаварлівы... Ён распытвае пра вясковых дзяўчат, і пра тых якія прыехалі ў госці, карацей, мне адказваць не вельмі і цікава. Стужкі з якарамі ўзлятаюць, калі Адам рэзка паварочваецца і глядзіць на мяне сваімі сінюшчымі вачамі. Ён збівае сваю шапку на патыліцу, ён пасміхаецца... Нам яшчэ ісці чатыры кіламетры да шашы... Ніколі не забуду той гук... Скураны пас з начышчанай спражкай круціцца над галавой Адама. Круціцца.... А потым другі гук... Так падае са стала на падлогу і разбіваецца яйка. Бліскучая спражка з якарам знайшла галаву аднога з трох незнаёмцаў. Ізноў зафыркацеў над Адамавай галавой скураны пас, заблішчэў якар...

Спынілася машына з будкай. Мяне, вядро з ягадамі, Адамаву шапку са стужкамі закінулі ў машыну. Адам ускочыў апошнім. Машына паехала. Адзін з трох колькі бег, схапіў камень, кінуў... Белая тканіна была руковай, а край вядра ліпкім ад соку. Адам смяяўся і цёр аб рукаво спражку.

* * *

СХАВАНАЯ КАМЕРА. Двор. Першыя прымаразкі. З купіны дрэў гэтай ноччу абсыпалася шмат лісця. Вялікі каштан зрабіўся амаль голым. Лісце пападала на легкавікі, пазасыпала іх. Рудыя вожыкі паразбіваліся аб асфальт і нарадзілі каштаны. Лісце яшчэ працягвае меланхалічна аблятаць. Старая, фарбаваная-перафарбаваная машына, стары і яе гаспадар. Мужчына далікатна, як сівыя валасы з жончыных плячэй, здымае каштановыя і кляновыя лісты са свайго дабітага жыццём аўто. Кляновыя лісты вогненныя, а каштанавыя — мякка жоўтыя. Чорны кот па мянушцы Самурай ляжыць на капоце суседняй бліскучай іншамаркі і сочыць за кожным рухам старога. Рухавік вызваленай ад лісця машыны, як не намагаецца гаспадар, не заводзіцца... "Гэта восень і больш нічога", — думаю я. На ветравое шкло, як на лёд, падае яшчэ вільготны ліст і саслізгвае. Ад цыгарэты лёгкі блакітны дым. Мужчына азіраецца... Акрамя Самурая і мяне яго няўдачу ніхто не бачыць.

* * *

СХАВАНАЯ КАМЕРА 2. Яны стаяць пад сцяной трансфарматарнай будкі ў глыбіні двара. Трансфарматары тужліва гудуць. З дрэваў аблятае лісце. У вечаровай цемры мільганне. Бамжоў двое. Ён і яна. Мужчына крыху вышэйшы за жанчыну. Падаюць каштаны. Расколваецца абалонка і каштаны коцяцца, падскокваюць. Ён і яна — бамжы і ім няма куды падацца. Мітусліва дапілі віно. Паелі. Тая, каторая жанчына, прысела на пачак кардона, сціснулася ў камяк бруду. Той, каторы мужчына, паляпаў яе на спіне. Праз паўгадзіны ён побач са сметнікам расклаў цяпельца. Ёй было халодна. Ён пачаў паліць кардонныя скрыні. Брудны камяк выпрастаўся, рукі пацягнуліся да цяпла. У неба паляцелі зыркія іскры. Агонь нагадваў прашыты сонцам кляновы ліст. Ён і яна меркавалі раніцай той кардон здаць і атрымаць грошы. Але кастрычніцкая ноч халодная, а да туманнага рання яшчэ далёка. Як хутка гараць скрыні з-пад марозіва...

* * *

НАЦЮРМОРТ. Праводжу і сёння дачку ў гімназію. Пляцак з падручнікамі цяжкі, даросламу як падняць. Спяшаемся. Рухаемся найкарацейшым шляхам, праз двары. Абмінаем трасфарматарную будку, якая гудзе дваццаць чатыры гадзіны ў суткі. Невысокі парканчык вакол зялёных скрынь-кантэйнераў са смеццем. Галубы ўзлятаюць у кастрычніцкае неба. Побач с крэсламі-інвалідамі, вынесенымі на сметнік, стаіць і бялее шыльда з надпісам "праспект Францішка Скарыны". Вынеслі, прыставілі, як п'янага, і сышлі... Побач ЖЭС, на ганку сантэхнікі паляць, гамоняць. Так, па беламу сінімі літарамі адбіты надпіс. Колькі імгненняў стаім і разглядаем нацюрморт. Зрабі такі фотаздымак і можна на конкурс адсылаць. Ніякіх высноў, дэфініцый, а тым больш здымкаў, рабіць не хочацца.

* * *

ЧЫРВОНЫЯ КОМІНЫ. Як далёка не адыдзі ад Гэ Пэ, ці не ад'едзь на ровары, — будзеш бачыць коміны шклозавода. Удзень яны чырвоныя, а ноччу на іх запальваюцца ліхтары. На самым вялізным — партрэт Ламаносава. Комін з чырвонай цэглы, а Ламаносаў выкладзены з белай. Той, самы вялікі комін, клалі не мясцовыя муляры, а далёкія. Будавалі ламаносаўскі комін у сямідзесятыя гады, доўга. Ён вавілонскай вежай паступова ўрастаў у дымнае неба. Жыхары Гэ Пэ былі ўпэўненыя, што будоўля не скончыцца, бо колькі разоў прыпынялася. Аднаго разу праз будаўніка. Адзін "камандзіровачны" муляр паляцеў долу. Пакуль падаў, ламіў рыштаванні... Ні я, ні хто з сяброў-аднагодкаў, таго драматычнага палёту не бачыў. Шкадавалі, што нам так не пашчасціла. Бегалі на завод глядзець паламаныя дошкі рыштаванняў. Памятаю, як неаднойчы потым, спрачаліся і разважалі, а ці можна так скочыць, каб не пабіцца.

Заводскія коміны, як піраміды. Усё мінае, а яны стаяць.

* * *

ЧЫРВОНЫЯ КОМІНЫ 2. Насупраць вялізных комінаў шклозавода тырчаў закураны чырвоны комін гэпэшнай кацельні. Ён нагадваў тэлескоп, бо быў не надта высокі, нейкі крываваты, крыху пахілены. Па ім, як грабеньчык, уздымаліся жалезныя скобы. На самым версе тырчаў доўгі штыр. Відаць, некалі сцяг да яго мацавалі. Колькі ніжніх, паедзеных іржой скобаў-прыступак, каб падшыванцы, ці якія п'яніцы не лазілі, густа намазвалі салідолам, або смалой... Калі ноччу вяртаўся паўз кацельню, прыпыняўся глянуць. Там за вялікімі вокнамі, у вялізных пячах ярка і таемна зыркаў агонь. Дзядзькі хадзілі, на прыборы паглядалі, ці ў шашкі гулялі.... Спакойна рабілася на душы. А пукаты, крываваты комін глядзеў-углядаўся ў неба, на мігатлівыя зоркі, на кроплю-спадарожнік, якая коцілася па атрамантавым прадонні, на шурпатую поўню..... Сёння таго коміна няма. Зруйнавалі. Шкада, бо і ён таксама стварыў адметнасць краявіду.

* * *

ВУСНЫ АНЁЛА. Яе рот нагадвае сэрца. Невялікі і акуратны. Такія вусны можна маляваць анёлам, такія і малявалі мастакі Адраджэння. Люблю глядзець, як яна есць. Далікатна падносіць лыжачку, або відэлец. Ніколі не спяшаецца. А самае цікавае і узбуджальнае, гэта калі яна дражніцца. Смокча цукерку, ці грызе моркву....

З анёльскіх вуснаў, бывае, злятаюць брудныя праклёны... Але тут сам і вінаваты.

* * *

АЛЬПІНІСТ. Ён пакінуў трох знясіленых сяброў на невялікай пляцоўцы ў памаранчыкавым намёце, на вышыні ў пяць тысяч метраў. Сам пайшоў да сляпучай вяршыні. Ён марыў усе апошнія гады ўзысці на яе, перамагчы недаступную гару... Ён доўга падаў, каціўся, каціўся. Нарэшце бясконцае, як у сне, падзенне скончылася. Ён ляжыць. На вочы падае рэзкі цень. Яшчэ цень і яшчэ. Чорныя кропкі зрэнкаў пульсуюць. Гэта побач з ім праходзяць альпіністы. Яны ідуць лёгка, моўчкі, без цяжкіх пляцакоў, нават рыштунак не бразгае. Так, быццам няма шасці тысяч шасцісот метраў пройдзенага шляху. Ён спрабуе крыкнуць. Спрабуе прашаптаць. Спрабуе ўзмахнуць рукой. Спрабуе паварушыць пальцам. Спрабуе міргануць... Марна. Яны сыходзяць, уздымаюцца па белай цаліне стромага схілу. Так, таго самага схілу, па якім ніхто і ніколі не падняўся да вяршыні, а хто паспрабаваў — загінуў... І да яго даходзіць, што альпіністы ў памаранчыкавых камбінезонах, якія бязгучна, снег не рыпеў пад цяжкімі чаравікамі, як па ваце, прайшлі побач і не заўважылі яго — прывіды... А ён яшчэ жывы, пакуль жывы. Гэтая думка не прынесла палёгкі. Хутка снежны пыл перастаў раставаць на яго вачах... Чорныя кропелькі зрэнак сціснуліся пад празрыстай скарынкай лёду і больш не пульсавалі... Ён лёгка ўстаў, пайшоў і дагнаў сваіх сяброў. Яны разам узышлі на вяршыню. Стаялі на сляпучым снезе, на іскрыстым лёдзе, а сцюдзёны вецер ляцеў скрозь іх, як праз цені...

* * *

ПАВЕТРА. Самае дзіўнае — яго крылы. Адно белае, як туман, другое шэрае, як хмара. Яны такія чуллівыя, што дастаткова прайсціся побач і яны ажываюць. Уздыхнеш, хістанешся, крыкнеш — крылы трапечуць, а ён адварочваецца ад цябе.

Ён — папяровы анёл. Ён прысніўся маёй дачцэ. Яна села раніцай да стала. Узяла самую лепшую паперу, каляровыя алоўкі, клей, маміны манікюрныя нажніцы (справа ж далікатная) і пачала рабіць яго. Ёй хацелася, каб анёл атрымаўся падобным да таго, які прыходзіў у яе сон... Яна старалася. Рэзала паперу, расфарбоўвала... З падушкі выцягнула колькі пёраў і з іх зрабіла свайму анёлу лёгкія крылы. Цяпер папяровы анёл вісіць у спачывальні на белай нітачцы, пад вясковым фотаздымкам... Яна прынесла яго нам, каб мы не сварыліся.

* * *

АДНАКЛАСНІК. У восьмым Сашка перамог на трох матэматычных алімпіядах. Я яму зайздросціў... Тэхнікум, інстытут, добрая праца... Але жыццё не склалася і Сашка ператварыўся ў п'яніцу. Ён яшчэ колькі гадоў спрабаваў пераканаць сябе і іншых, што пры жаданні зможа "завязаць". А потым і пераконваць кінуў, бо зразумеў, што не можа — зацягнула-засмактала. Апошні раз мы сустрэліся, калі я прыехаў хаваць бацьку. Выйшаў з дому, каб сустрэць сваякоў, а спаткаў аднакласніка. Ён падышоў і павітаўся. Яго твар быў, як у нас кажуць, азызлы... Ён пераступаў з нагі на нагу, а потым прапанаваў выпіць віна. Я адмовіўся. Азызлы твар аднакласніка зрабіўся пакрыўджаным, расчараваным. Давялося тлумачыць, што да чаго. Ён хітаў на мае словы і я разумеў, што ён не вельмі і верыць маім словам. Тут пад'ехала машына са сваякамі. Аднакласнік убачыў жалобныя вянкі, кветкі... Шчыра паспачуваў і сышоў. Мне давялося тлумачыць сваякам, што брудны п'яніца — мой аднакласнік.

* * *

ДЗЕСЯЦЬ БАКСАЎ. Аднойчы майму знаёмаму літаратару не было чым карміць дзяцей. Скончыліся грошы. Сышлі, як і не было іх ніколі. Добра, што тэлефон пакуль не адключылі. Літаратар патэлефанаваў старэйшаму сябру-пісьменніку. Не хацеў, а давялося. Размова была нядоўгай, позні вечар, амаль ноч. Той здзівіўся, але паабяцаў, што заўтра дапаможа. "Патэлефануй раніцай, перастрэнемся і я табе дапамагу. Ты ж мне дапамагаеш..." — Лагодна сказаў пісьменнік знаёмцу. Літаратар супакоіў дачку з сынам, сказаў, што заўтра ён прынясе ім у школу па вялікім бутэрбродзе і па кардонцы соку. Абнадзеены, лёг спаць. Раніцай дзеці папілі гарбаты, цукар яшчэ быў дома, і выправіліся ў школу... Літаратар патэлефанаваў свайму сябру, калі той сядзеў за сталом і снедаў. Пісьменнік жаваў і размаўляў такім жа лагодным голасам, як і ўчора. Ён сказаў што, на жаль, учора памыліўся, не ведаў, што грошы дома скончыліся. "Ну хоць десяць баксаў дай, дзяцей няма чым пакарміць.." — шэптам прызнаўся літаратар і пачырванеў. Яго ніхто не бачыў, ён быў адзін дома. Ён пазычыў дваццаць тысяч у суседкі, пенсіянеркі. Хто ж адмовіць, калі даведаецца, што дзяцей няма чым карміць. Да вялікага перапынку літаратар паспеў забегчы ў гастраном, прыгатаваць дзецям паесці. Ты хочаш спытаць, а што пісьменнік... Ён праз тыдзень звярнуўся па дапамогу і літаратар яму не адмовіў. Вось і думай-маракуй, чыя праўда... Нашто табе прозвішчы? Ведаеш ты іх, ведаеш.

* * *

ЛУЗЕР. Восем гадоў таму яна з'ехала жыць у Амерыку. Казала, што едзе туды толькі дзеля сына, якому трэба даць сапраўдную адукацыю і г. д. Зрабіць дакументы на цуцыка (звяглівы спаніэль) аказалася большым клопатам, чым на людзей. Яна, сын і сабака з'ехалі. Прамінула восем гадоў. Гэтым летам мы сустрэліся. Тут шмат чаго памянялася. Яна прыехала на пару месяцаў, каб вырашыць з сястрой маёмасныя пытанні... З усяго таго, што пачуў пра жыццё там, запомнілася не шмат, хоць прагаварылі доўга. Я спытаў пра яе сына, як ён там? "Сабака здох, сын вырас, я састарэла..." — нетаропка прамовіла і клацнула запальнічкай. Уразіла толькі адно слова. Яна прамовіла яго хутка, калі расказвала пра свайго сына. "На яго няма ніякага спадзеву... Ён — лузер", — сказала і адвярнулася ад мяне.

* * *

ШЭРЫ КРАЯВІД. Усё на тым краявідзе было шэрае.... Неба, зямля, дрэвы, калюгі на дарозе, туманная далячынь... І толькі адно дрэва было рудое, як засохлая на тканіне кроў. І гэтая адна пляма рабіла аркуш паперы каштоўным, а той восеньскі краявід жывым, тужлівым. Краявід той намаляваў Алесь Агафоненка, а было тое на першым курсе мастацкай вучэльні ў лістападзе 1973 года.

* * *

ПЕРШЫ СНЕГ. Першы снег нагадвае маляванне... Белая папера пакідаецца некранутай. Белая. Некранутая папера і ёсць снег. Гэта разумеюць тыя, хто маляваў.

* * *

ЧАРНАТА. Бабай? Ён жыў за вялікай шафай. Там заўсёды цёмна-цёмна. Там заўсёды ноч. Мне здавалася, што калі нейкая рэч заляціць туды, закоціцца, заваліцца — ён яе не аддасць. А калі я паспрабую выцягнуць, дастаць яе з чарнаты, то ён абавязкова схопіць за руку. Будзе моцна трымаць, сціскаць пальцы... А потым адкусіць іх... Усмешлівая суседка пажартавала. Бацькі папрасілі яе прыглядзець за мной чатырохгадовым, а самі пайшлі ў госці. Яна раззлавалася і сказала, што калі я не буду спаць, то Бабай зацягне мяне за шафу. Пакуль, пад раніцу, бацькі не вярнуліся з гулянкі я ляжаў і калаціўся пад коўдрай. Суседка ціхамірна спала на канапе. Праз колькі дзён бацька спецыяльна адсунуў цяжкую шафу. Знайшліся: маленькі шкляны шарык, лыжачка, бутэлечка, пластыкавы пеўнік і дзве цукеркі, а яшчэ шмат шэрага пылу... Бабая, вядома, я і не пабачыў, але баяцца не перастаў. Мой ложак стаяў побач з шафай і я падоўгу не мог заснуць. Мама сядала побач і гладзіла мяне па галаве. Яна казала: "Баю — бай, баю — бай..." А мне чулася "Бабай", і я пачынаў румзаць. Што спарадзіла той халодны жах? Чарната цемры і немагчымасць уявіць чорную фантастычную істоту, зробленую з цемры? А можа, я баяўся заснуць і не прачнуцца? Не ведаю...

* * *

БАРВОВАЯ ПОСЦІЛКА. Зеленавокай сарамлівай дзяўчыне хацелася стаць жанчынай. Доўгавалосаму непрывабнаму, а таму самаўпэўненаму хлопцу хацелася зрабіць прыгажуню жанчынай. Каханне тады між імі яшчэ не было, яго замяняла жаданне. Каханне прыйдзе потым. Жаданні супалі, а таму і месца знайшлося. Халасцяцкая аднапакаёўка яго стрыечнага брата на шостым паверсе. Канапа, барвовая даматканая посцілка, падушка, прасціны, бутэлька салодкага віна, а што яшчэ трэба? Яна развіталася са сваёй цнотай... Было акно і зорка, якая міргала, а на світанні растала... Ні ён, ні яна раніцай і не думалі, што тая даматканая, мулкая, колкая посцілка звяжа іх назаўсёды... Так, так... яны будуць прыбітыя да аднаго крыжа. Пакуль будуць жыць. А пасля... Магчыма, і пасля, калі іхнія душы разляцяцца кожная на сваю зорку, яны не перастануць згадваць колкую даматканую барвовую посцілку.

Арт-пацеркі

Аўтарскі вечар народнага артыста СССР і Беларусі Ігара Лучанка прайшоў у Палацы Рэспублікі. Удзельнічалі ў ім Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Віктара Бабарыкіна, ансамблі “Песняры”, “Сябры”, “Чысты голас”, Капэла хлопчыкаў Рэспубліканскага каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, салісты Анатоль Ярмоленка, Ядвіга Паплаўская, Аляксандр Ціхановіч, Якаў Навуменка, Аляксей Хлястоў, Ірына Дарафеева, Яўген Чалышаў, Фрэдэрык ды інш. Народны артыст СССР Іосіф Кабзон, які прыехаў з Масквы для ўдзелу ў канцэртнай праграме, выступіў не толькі як саліст, але і як вядучы вечарыны — разам з Аленай Спірыдовіч. Апроч песень І. Лучанка, якія ўжо даўно лічацца класікай жанру (“Спадчына”, “Мой родны кут”,“Вераніка”, “Жураўлі на Палессе ляцяць” ды інш.), прагучалі прэм’еры, у тым ліку і аркестравае папуры на тэмы песень І. Лучанка і У. Мулявіна.

Не так даўно мы віншавалі з 75-годдзем заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Івана Міско — знанага скульптара, якога вылучае сярод калег сапраўдная апантанасць тэмай космасу. А на-

пярэдадні Дня касманаўтыкі з’явілася яшчэ адна нагода для віншавання: у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь адкрылася персанальная выстаўка гэтага майстра. Экспануецца больш як чатыры дзесяткі яго работ: графіка, мастацкае фота і, вядома ж, скульптура — у тым ліку і рамантычныя кампазіцыі на касмічную тэматыку, і выявы герояў космасу... Выстаўка працуе да 14 мая.

Дзень факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці адзначыў БДУ культуры і мастацтваў у межах свайго традыцыйнага фестывалю “Арт-мажор”. Выпускнікі факультэта працуюць ва ўсіх рэгіёнах краіны — а гэта каля 8 тысяч спецыялістаў, падрыхтаваных за больш як 30 гадоў яго дзейнасці. Прафесіі, якія тут атрымліваюць, — запатрабаваныя сёння і перспектыўныя ў сферах менеджменту сацыяльнай і культурнай галін, міжнародных культурных сувязяў, у сацыяльна-культурнай дзейнасці, сацыяльнай педагогіцы і выхаваўчай рабоце ва ўстановах сацыяльна-культурнага напрамку, у кампаратыўным мастацтвазнаўстве і г.д. Будучыя спецыялісты праходзяць практыку ў такіх шаноўных установах краіны, як Палац Рэспублікі, канцэртная зала “Мінск”, Белтэлерадыёкампанія, Нацыянальны мастацкі музей і Нацыянальная бібліятэка, санаторыі, падпарадкаваныя кіраўніцтву справамі Прэзідэнта Беларусі... У Дзень факультэта яго студэнты і выпускнікі (сярод якіх ёсць і вядомыя артысты) наладзілі канцэрт у сталічным Палацы культуры і спорту чыгуначнікаў. У межах імпрэзы адбылася дабрачынная акцыя для гадаванцаў дзіцячага дома № 7 і дзяцей-інвалідаў Івянецкага дома-інтэрната.

С. ВЕТКА

Фота К. Дробава

У акцёра Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Івана Мацкевіча нядаўна адбылася вельмі значная падзея: споўнілася 60. Гэтымі юбілейнымі днямі ён за сваю працу атрымлівае заслужаныя падзякі ад калег па тэатры і кіно. Сыграныя ім ролі даюць гледачу вельмі многа: разуменне жыцця, чалавечых адносін, навуку прызнаваць памылкі і здольнасць дараваць, любіць, верыць у сябе, у людзей...

Сцэна, экран — і жыццё

Любоў

— Іван Іванавіч, я вас увесь час бачыў такім, які вы зараз. Зусім не верыцца, што вы гадуеце ўжо чатырнаццацігадовага ўнука. Як удаецца так трымаць сябе, “не паддаваца” ўзросту?

— Я ўсё жыццё быў любімы. Мяне любілі мае бацькі, бабуля з дзедам. Любяць мае ўнукі. Самае галоўнае — мяне кахае мая жонка. І я павінен паводзіць сябе адпаведна як муж, як бацька, як дзед. Не трэба турбаваць і засмучаць сваіх блізкіх, трэба ім паказваць сваю любоў. А яшчэ трэба сябе трымаць у форме: я ўсё сваё жыццё займаюся спортам. І жонка мяне даглядае, не дае мне згубіцца, дапамагае захаваць сябе. Я імкнуся зразумець, што раблю, дзе памыляюся, чым я жыву. Унутрана заўсёды змяняюся.

Чалавек вайны

— У вашым творчым багажы шмат фільмаў на ваенную тэматыку. Вайна — сур’ёзнае выпрабаванне чалавечага духу, духоўнасці, маральнасці. Вайна — тое страшнае, жорсткае, пра што ў звычайных абставінах нават не думаеш. Паводле ўражанняў ад вашых роляў у гэтых карцінах у мяне склалася ўспрыманне вас як чалавека жорсткага і строгага. Гэта адпавядае вашаму характару?

— Так, я бываю жорсткі, калі мяне раззлуюць. Бываю несправядлівы. Памыляюся ў адносінах з людзьмі. Але гэта не значыць, што я такі ўвесь час. Я лічу сябе насамрэч чалавекам добразычлівым. У кіно акцёр не мае магчымасці вялікага выбару, яго прызначаюць на ролю. Я мушу адпавядаць той ролі, што мне даюць. Даводзіцца сябе нават прымушаць рабіць тое, што ад мяне вымагае мая прафесія, інакш возьмуць іншага акцёра.

У фільме Міхаіла Пташука “Вазьму твой боль” у мяне была роля паліцая. Вельмі цікавая роля: там ёсць змена чалавечага лёсу праз гады, і сам матэрыял выдатны. Канечне, мне было цяжка: я не вылюдак, і мы ўсе ведаем гісторыю фашысцкай акупацыі. Але я ведаў, што абавязаны паказаць свой персанаж арганічна. Калі не я — гэта ўсё роўна зробіць нехта іншы. Але нават з такім настроем у сцэне, калі павінен быў страляць у дзяцей, я не змог сябе пераадолець. У мяне не хапала той злосці, што робіць з чалавека вылюдка. Каб усё было, як трэба, Пташук прымусіў мяне выпіць кубак гарэлкі. Толькі тады ў мяне нешта атрымалася.

— А жыццё ў акупацыі: гэта таксама вайна?

— Я нарадзіўся пасля вайны, але мае бацька і маці прайшлі праз гэта. З таго, што яны казалі, я зразумеў, што і гэта — вайна. Вайна за захаванне роду: дзяцей, бацькоў. Вайна з самім сабой: за тое, каб захаваць сябе як чалавека, за тое, каб у гэтым нечалавечым выпрабаванні не зрабіцца вылюдкам.

— Тады былі свае героі. А цяпер? Вы здымаліся ў серыяле паводле твораў Мікалая Чаргінца. Там ёсць героі нашага часу?

— Чаму, калі амерыканцы ў сваіх фільмах пра вайну знайшлі свайго героя, мы на гэта не здатныя? Здатныя. Нам патрэбны свой герой, для маладога пакалення. Каб было прыемна паглядзець на свайго мужнага, прыгожага, моцнага героя.

Чалавек становіцца героем толькі ў экстрэмальнай сітуацыі. Тады ярка выяўляюцца тыя якасці, што робяць яго такім.

Змена тэатраў

— Колькі гадоў у вашым жыцці займае тэатр?

— У тэатры я з 1968-га года. Атрымліваецца, што трыццаць дзевяць гадоў. Спачатку я быў у Брэсцкім абласным, потым перайшоў у мінскі Тэатр-студыю кінаакцёра. Апошнія дзесяць гадоў іграю ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага.

— Якая сцэна для вас зрабілася больш блізкай?

— Я з задавальненнем працаваў у Брэсце да пэўнага моманту. Нічога дрэннага я сказаць пра той тэатр не магу: выдатныя ролі, выдатныя акцёры. Проста прыйшоў час нешта мяняць. Потым з задавальненнем працаваў у тэатры кінаакцёра. Але ўрэшце я засумаваў па вялікай сцэне: у тэатры-студыі кінаакцёра яна вельмі маленькая...

Прафесія акцёра асаблівая. У нас бываюць розныя моманты ў жыцці: мы і сварымся, і мірымся. Але кожны тэатр, дзе мы працуем, кожная сцэна, на якой мы іграем, для нас самая блізкая.

Для акцёра змена тэатраў спрыяе яго развіццю. У Брэсце прайшлі мае маладыя гады, я там навучыўся аднаму. У тэатр кінаакцёра я прыйшоў загартаваны і ведаў, чаго хачу, што мне патрэбна, і мяне пахіснуць было вельмі цяжка: гэта ўжо “навучанне” іншае. Тэатры трэба мяняць — гэта вопыт. І, дарэчы, нягледзячы на вонкавае ўражанне жорсткасці, у тэатры кінаакцёра ў мяне была роля і чалавека з даволі мяккім характарам. У спектаклі “Глядзіце, хто прыйшоў” я іграў інтэлігента, які не можа пастаяць за сябе і за сваю сям’ю. Такога бядотнага, загнанага чалавека.

— Але сёння ў горкаўскім тэатры ёсць ў вас і такія ролі, як у “Апавяшчэнні Марыі”.

— Гэты спектакль для нас вельмі асаблівы, на рэлігійную тэму. Тэму, да якой мы адносімся з асцярожнасцю і павагай. Мы вельмі асцярожныя да таго, што і як гаворым са сцэны, да сваіх роляў.

Вандроўкі

— У спектаклі “Апавяшчэнне Марыі” ваш герой выпраўляецца ў паломніцтва. Ці можна такімі вандроўкамі спазнаць боскае прасвятленне?

— Упэўнены, што так. Я і сам вельмі хацеў бы пабываць у такім падарожжы. Можа, калісьці і будзе магчымасць наведацца ў Іерусалім і дакрануцца да святых мясцін. Гэтая вандроўка раскрывае велічнасць чалавечага духу.

— Але ў вас была іншая вельмі значная вандроўка...

— Так, я прайшоў на яхце “Гала” ад Севастопаля да Туніса. Я быў у Турцыі, бачыў астравы Грэцыі. Сам паход быў у гонар трох стагоддзяў расійскага флоту.

— Што вас уразіла ў падарожжы?

— Я быў у Акропалі. Мяне ўразіла мармуровая лесвіца, што вядзе наверх. Яна сцёртая ўшчэнт, мусіш узнімацца амаль паўзком, каб не зваліцца. Туды ідзе столькі народу, што немагчыма сабе нават уявіць. Гэта іншы дух і, на жаль, іншая памяць. Мы былі ў вандроўцы больш як сорак дзён, і большую частку на вадзе. Уражвала ўсё. І Басфор, і знакаміты мост, што аб’ядноўвае Еўропу з Азіяй, і Стамбул (знакаміты гістарычны Канстанцінопаль), і Мальта.

Мы патрапілі ў шторм, і выратавала толькі тое, што мы ішлі сапраўды са святой справай. Мы прыходзілі да могілак расійскіх маракоў турэцка-рускай вайны. Жудасна было бачыць іх разрабаванымі. Для мяне самым галоўным у гэтым паходзе сталася тая загартоўка, што я атрымаў. Калі даводзіцца пабываць у такіх выпрабаваннях і выжыць, да жыцця з’яўляецца ўжо іншае стаўленне.

І надалей

— Апошнім разам у вас быў выдатны спектакль з рэжысёрам Вітаўтасам Грыгалюнасам паводле п’есы Андрэя Карэліна “Я веру ў гараскопы”. Ці запрасіў ён вас у свой новы спектакль?

— Запрасіў. Гэта будзе спектакль паводле Уладзіміра Караткевіча “Легенда пра беднага д’ябла”. У арыгінале гэта — кінасцэнарый. Грыгалюнас разам з Барысам Луцэнкам і кінарэжысёрам Уладзімірам Арловым зрабілі яго інсцэніроўку. Падзеі разгортваюцца так: малады нячысцік памыліўся, і галоўны д’ябал адпраўляе яго на зямлю ў пакаранне за гэта. І з далейшых падзей выбудоўваецца інтрыга.

— А як вы мяркуеце, ці заўсёды мы павінны плаціць за свае памылкі жорсткай карай, ці можа гэта нас чамусьці навучыць?

— Канечне, пабачанае мной у жыцці і ў тэатры навучыла мяне, што трэба ўмець і вучыцца дараваць, вучыцца разумець. Трэба разумець, што жыццё адно, нельга таптаць, нельга біць, нельга скідваць людзей, тым больш — таленавітых людзей: у нас іх не шмат.

Такія рэчы, як давер і любоў — гэта ўласцівае чалавеку. Калі ты згубіў сваю чалавечую прыроду, трэба яе выхоўваць наноў, нават калі гэта будзе вельмі цяжка. Мы ўсе памыляліся. Жыццё вельмі складанае, каб быць у ім бязгрэшным, але неабходна, каб нам даравалі і каб даравалі мы. Тады толькі можна застацца чалавекам.

Можна жыць без усяго гэтага. Ісці напралом. Раскідваць на сваім шляху ўсіх, абражаць, падманваць. Гэта проста. Але што будзе потым? Рана ці позна гэты чалавек застанецца адзін. Ён азірнецца, а вакол не будзе нікога, хто захоча яму дапамагчы і падтрымаць. Гэта непазбежна, бо тое, што сапраўды павінна карацца — свядомае зло.

Гутарыў Андрэй КЛЮЧНІКАЎ

На полі эксперыментаў

У Рэспубліканскім тэатры юнага гледача ідзе адна з самых цікавых прэм’ер апошняга часу. Цікава для тэатральнай публікі найперш тое, што рэжысёр новай пастаноўкі — Мікалай Пінігін, які паспеў ужо зрабіцца беларускім класікам. Вядома, цяпер, больш як 10 гадоў, ён спрабуе свае творчыя сілы на сцэне саюзнай Расіі.

Адкрыю сакрэт: рэжысёр Мікалай Пінігін працуе ў славутым Вялікім драматычным тэатры Санкт-Пецярбурга не з-за ганарараў. Там ён праходзіць са сваімі спектаклямі апрабацыю. Такім чынам да нас, праз год пасля дамовы з кіраўніцтвам Рэспубліканскага тэатра юнага гледача, дайшла апрабаваная ім на сцэне піцерскага Вялікага драматычнага тэатра імя Г.Таўстаногава пастаноўка “Матылёк” паводле п’есы расійскага драматурга Пятра Гладзіліна.

Гэты спектакль паказвае, что Расія — вялікае поле эксперыментаў, дзе за адну ноч партыец-камуніст не толькі можа зрабіцца “буржуем”, і перамяніць пол. І неістотна, дзе такое адбываецца. Гэтым разам — у вайсковым падраздзяленні, пасярод заснежанага поля.

Тут паказана супрацьстаянне двух чалавек з рознымі поглядамі на жыццё, рознага ўзросту. Сваім напорам, аўтарытэтам, статусам, сталасцю камандзір-Палкоўнік імкнецца зламіць волю сваіх падначаленых, падабраць іх, што называецца, пад сябе, прымусіць рабіць так, як яму трэба. Гвалтоўна зрабіць з дзіцяці дарослага чалавека. Але галоўнае — з часам прыходзіць разуменне: гэты “правільны” светапогляд не што іншае, як самая найгоршая дзіцячая гульня: прыніжаны і зацкаваны радавы Мікалай Лябёдушкін эмацыйна сталейшы за ўсіх сваіх катаў. І ўнутрана мацнейшы.

Нягледзячы на пераезд, М. Пінігін не адмовіўся ў сваіх пастаноўках ад грувасткіх канструкцый, якія, між тым, зусім функцыянальныя. У “Матыльку” (мастак А. Сарокіна) гэта збудаванне з тоўстых брускоў. Накрытыя белым палотнішчам, яны сімвалізуюць белую халодную бязмежнасць рускага поля і пакінутасць “культурнай адзінкі” — армейскага клуба. Там захоўваецца палкоўніцкая памяць пра каханне: фіранкі.

“Фіранкі” — так і павінен быў называцца спектакль. Праз рэчы П. Гладзіліна раскрывае людзей. Перамена рэчаў паказвае змены ў характарах. Як хлопец становіцца дзяўчынай, гэтак жа лёгка Палкоўнік ператвараецца ў акцёра. Яго жыццё набывае сэнс толькі тады, калі Коля ў абліччы Наталлі зрывае і разразае на кавалачкі тое, што дагэтуль было недакранальнае: фіранкі, якія купіла для клуба яго былая жонка. Але М. Пінігін убачыў у дзеяннях персанажа тую лёгкасць, якая ўласцівая толькі матылькам. Але жыццё матылька нядоўгае... У палёце праз такое прывабнае і такое пякучае святло, якім сталася для салдата Лябёдушкіна яго творчая свабода, яго, як матылька, чакае смерць.

Камусьці такі вынік жыцця можа падацца крахам душы мастака. Але толькі таму, што жыццё ён лічыць сваім галоўным набыткам і думае пра тое, што сам можа атрымаць.

П’есу “Матылёк” упершыню паказалі ў “Майстэрні Пятра Фаменкі”, хаця на яе мог бы прэтэндаваць куды меней пераборлівы расійскі тэатр. Мы дайшлі да ТЮГа... Пінігін ведаў, каму прапанаваць гісторыю не тое, каб трансвестыта, але салдата, што ператварыўся ў дзяўчыну. Самае дзіўнае для мяне, хаця і зразумелае, што тэатр пагадзіўся з прапановай рэжысёра наконт размеркавання роляў. І такім чынам у спектаклі з’явіліся запрошаныя: маладая купалаўская актрыса Ганна Хітрык і Пётр Юрчанкоў-старэйшы з мінскага Тэатра-студыі кінаакцёра. Магчыма, таму, што ў ТЮГу разлічвалі на скандальнасць пастаноўкі і не хацелі падстаўляць сваіх? У любым выпадку ўсё атрымалася проста роўным. Паводле ўсіх паказчыкаў...

А. ЗАМКОВІЧ

На здымку: заслужаны артыст Беларусі Анатоль Жук (Палкоўнік).

Фота А. Дзмітрыева

Memento...

Занатаванае падчас вандроўкі ў Чачэрск, на першае свята беларускай музыкі.

Навакольнае

Усё, як заўсёды: аўтобус бяжыць, матор пяе, мітульга падарожных думак не замінае глядзець у акенца і з прыемнасцю заўважаць, як імкліва над нашай зямлёй распраўляе свае светлыя крылы вясна. Усё, як заўсёды, пакуль у калейдаскопе тыповых паўднёвабеларускіх краявідаў не з'яўляецца тое, што палохае нязвыклай штучнасцю, безвыходнасцю, канчатковасцю.

Тубыльцы, мабыць, горка пасміхнуліся б з гэткай маёй уразлівасці: два дзесяткі гадоў мінула пасля атамнай катастрофы ў Чарнобылі, колькі ўсяго ўжо давялося пабачыць-перажыць і перасяленцам, і жыхарам, якія не пакідалі "асабліва пацярпелыя тэрыторыі", і тым, каму проста даводзілася бываць у гэтых небяспечных мясцінах. Але ж я жахаюся і наўздзіў сабе расчульваюся, бо ўпершыню не на фота і не ў кіно бачу краявід, пазначаны пячаткаю няўгледнай бяды.

Як скаланае душу гэты стыхійна ўтвораны чарнобыльскі мемарыял! Кіламетры пустой і зроўненай зямлі, дзе замест жыццядайнай глебы — друз былога сялянскага дабрабыту. Вуліца-прывід з чарадой недабудаваных вясковых двухпавярховак: цагляная кладка перапынілася знячэўку і навек. Прыгожая хата: здаецца, яшчэ не паліняла фарба на самавітых баках яе зруба і на дыхтоўным ганку, а праёмы дзвярэй і вокнаў гаспадарская рука "зашкліла" плёнкай — абачлівасць недарэчная, бо поліэтыленавыя шыбы не абаранілі дом, падраныя на шматкі, яны жаласна трапечуцца пад налётамі ветру...

Прыехаўшы ў Чачэрск, мы амаль не гаварылі з месцічамі пра галоўную экалагічную праблему. Але між іншым даведаліся, што тамтэйшае паветра ўжо лічыцца чыстым, а вось у зямлі смертаносныя часцінкі "мірнага атама" захоўваюць сваю актыўнасць. Асабліва небяспечна ўжываць лясныя дары. Хтосьці ўжо ледзь не забыўся на смак жывых чарніц і з асалодай успамінае, як слуцкія сябры пачаставалі летась слоікам варэння...

Зрэшты, дзе б ні жыў чалавек, ад праблем, тых або іншых, яму не засцерагчыся. Галоўнае — душу зберагчы, навучыцца радавацца жыццю, асэнсоўваць яго з аптымізмам, імкнуцца разнастаіць і ўпрыгожыць. Дык вось на чачэрскай зямлі, як і паўсюль на Гомельшчыне, людзі маюць шчаслівы дар: жыць творча. Яны здатныя выяўляць эстэтычную прыроду кожнай добрай справы, у тым ліку — стваральнай хлебаробскай працы на зямлі. Самі артыстычныя, вялікія аматары паспяваць ды патанчыць, яны ўмеюць ацаніць мастацкі талент госця. Адчувалася гэта і падчас асамблеі "Дыялог парламентарыяў Беларусі з актывам Чачэрскага раёна" (гл. нумар нашай газеты за 6 красавіка), што прымяркоўвалася да свята беларускай музыкі "Чачэрскія сустрэчы-2007", і ў самой фестывальнай атмасферы.

Паразуменне

Дваццаць гадоў існуе Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам маэстра Міхала Фінберга. Без малога 70 фестываляў арганізаваў і правёў гэты калектыў, у тым ліку ў невялікіх беларускіх гарадах, у гістарычных мястэчках. Такімі святамі высокага музычнага мастацтва, што пры падтрымцы абласных, раённых і мясцовых улад адбываюцца ў не спешчанай мастацкім жыццём правінцыі, кіраўнік аркестра шчыра ганарыцца:

— Я сам нарадзіўся ў невялікім гарадку і з асаблівай прыемнасцю і задавальненнем раблю ўсё магчымае, а часам і немагчымае, каб у такіх мясцінах адбываліся святы сапраўднага прафесійнага мастацтва. Каб гучала наша родная беларуская музыка — і старадаўняя спадчына, і творы сучасных кампазітараў, якія пішуць у акадэмічных жанрах, і свая, беларуская песня з беларускімі словамі, і ўзоры сусветнай класікі. У нашых невялікіх гарадах жывуць цудоўныя, адметныя людзі. Яны вельмі тонка адчуваюць мастацтва і ўмеюць слухаць самую розную і самую складаную музыку. А што яшчэ важна і дзеля чаго трэба пашыраць такі фестывальны рух — дык гэта выхаванне новых пакаленняў дасведчаных слухачоў. У гарадах з пэўным фестывальным стажам — Нясвіжы, Заслаўі — плён такой асветніцкай дзейнасці ўжо адчуваецца: колішнія падлеткі прыходзяць у канцэртную залу са сваімі зусім яшчэ маленькімі дзецьмі. Гэта радуе, усцешвае: гадуюцца слухачы XXI стагоддзя — значыць музыканты працуюць не толькі дзеля сённяшняй публікі, а і на будучыню. З пачуццём асаблівай адказнасці мы адкрываем такі фестываль у Чачэрску — рэгіёне, найбольш пацярпелым ад чарнобыльскай навалы. Для людзей, якія жывуць і працуюць у спецыфічных умовах, вельмі важная духоўная падтрымка, сустрэчы з жывой музыкай.

З чым жа чыннікі новага фэсту прыехалі да незнаёмай публікі? З прэм'ерай. "Музычнае мастацтва Беларусі: на скрыжаванні стыляў і эпох" — так называлася канцэртная праграма, якою распачаліся "Чачэрскія сустрэчы-2007". Упершыню загучала ў гэтым цыхім старажытным гарадку класіка XX стагоддзя і ўзноўленыя старонкі нашай музычнай даўніны. Навуковы каментатар, доктар мастацтвазнаўства Вольга Дадзіёмава вяла канцэрт, як заўсёды, натхнёна і даходліва. Спрактыкаваная асветніца ўлічыла характар аўдыторыі, таму перш чым прадстаўляць творы, уключаныя ў праграму, яна распавяла пра спецыфіку аркестра, які ўзначальвае Міхал Фінберг, пра яго складаную структуру і віртуозныя камерныя калектывы, што ў гэтую структуру ўваходзяць. Расказала пра лёс адметных кампазітараў — ураджэнцаў Беларусі, якія мусілі шукаць долі ў іншых краях і ўрэшце рабіліся класікамі суседніх культур. Прадставіла і постаці тых замежных музыкантаў, што на доўгія гады звязвалі свае жыццё і творчасць з нашай зямлёю.

Ян Голанд, сучаснік Баха, Моцарта, Гайдна, кампазітар, бальшыня жыцця якога прайшла ў асяроддзі Радзівілаў; аўтар пастаўленай у Нясвіжы "Агаткі", якую сёння называюць першай беларускай операй. Восіп Казлоўскі, беларускі геній з мястэчка Прапойск (цяперашні Слаўгарад), які ўвайшоў у гісторыю рускай класічнай музыкі не толькі знакамітым гімнам імперыі "Гром победы, раздавайся!", а многімі, многімі яскравымі старонкамі, які вярнуўся на радзіму і зрэдчас музіцыраваў са сваім вучнем і сябрам Міхалам Клеафасам Агінскім, наведваючыся да яго ў маёнтак Залессе. Напалеон Орда, шляхетны беларускі паляшук, рознабаковая таленавітая асоба, якую на радзіме пачалі належным чынам цаніць і шанаваць, бадай, толькі ўпярэдзень 200-годдзя з дня нараджэння. Станіслаў Манюшка, узгадаваны на музычным фальклоры Міншчыны, стваральнік першай беларускамоўнай оперы "Сялянка", чыя постаць на доўгі час была адлучаная ад беларускага культурнага кантэксту. Класікі айчыннай музыкі XX стагоддзя Мікалай Чуркін, Аляксей Туранкоў, Яўген Глебаў, творчасць якіх, на жаль, пачынае знікаць з рэпертуару сённяшніх выканаўцаў...

Колькі розных п'ес, новых транскрыпцый, аранжыровак прадставілі ў сваіх выступленнях

Ансамбль кларнетыстаў з лідэрам Генадзем Забарам, трубачы "Інтрады" (мастацкі кіраўнік Мікалай Волкаў), ансамблі флейтыстаў і салістаў на драўляных духавых інструментах (кіраўнікі абодвух Барыс Нічкоў і Генрых Гедыльтар), малады Струнны квартэт, Камерны аркестр пад кіраўніцтвам Валерыя Сарокі! Так, музыка ўражвала дзякуючы густоўным аранжыроўкам і як ніколі натхнёнаму выкананню. Віртуозныя сольныя пасажы кларнета (Г. Забара) у Манюшкавай "Віянэле". Па-аркестраваму магутнае і па-тэатральнаму кідкае туцці труб у "Фландрыі" — папулярнай часткі з балета Я. Глебава "Ціль Уленшпігель". Сакавіты жанравы гукапіс фрагментаў Струннага квартэта нашага таленавітага суайчынніка і сучасніка У. Кур'яна. Пераствораныя з фартэпіянных арыгіналаў класным аранжыроўшчыкам А. Шпянёвым партытуры танцавальных п'ес Н. Орды...

Яго вальс "Аўрора" і адзін з паланезаў выконваліся Камерным аркестрам, які завяршаў праграму. Зала наладзіла доўгую авацыю. Апафеоз! Але, аказалася, — яшчэ не фінал. Дырыжор В. Сарока лёгкім жэстам вярнуў музыкантаў за пульты... І ўзрушаная публіка тут жа, шчырымі гарачымі апладысментамі, адрэагавала на сюрпрыз: усе пазналі шчымлівы, кранальны матыў самага знакамітага ля мінорнага паланеза М. Кл. Агінскага...

"М. Кл. Агінскі — сусветная велічыня". Гэта ўжо назва манаграфічнай праграмы, якую камерныя калектывы Нацыянальнага канцэртнага аркестра прадставілі падчас вечаровай музычнай сустрэчы ў Чачэрску, якая сталася годным завяршэннем свята беларускай музыкі. Безумоўны поспех першага фестывальнага візіту дае надзею і месцічам, і іх гасцям на працяг такіх сустрэч у наступныя гады .

Паводле Якобі

Канцэртная зала "Кастрычнік" увесь дзень поўнілася музыкай. Апроч дзвюх вялікіх фестывальных праграм, тут адбылося выступленне лаўрэата міжнародных конкурсаў і фестываляў дуэта "Аляксандра і Канстанцін". Яго ўдзел у "Чачэрскіх сустрэчах" — не выпадковасць. "Пяты сезон мы маем гонар працаваць у аркестры пад кіраўніцтвам Міхала Фінберга", — заўважыла Аляксандра, распачынаючы канцэрт, праграму якога сама ж і вяла. Публіка з энтузіязмам вітала лепшыя песні вядомых артыстаў: "Пчолку" і "Сена", "Галілея"і "Каляду". А пад "Святы вечар" спявачка так раскруціла гледачоў, што яны пачалі адгукацца на прыпеў дружным хорам. Нават сам маэстра выйшаў з-за куліс падзівіцца на такое творчае сумоўе і дадаў у імправізаваную партытуру свае апладысменты і ўсмешку...

У фае працавала выстаўка Чачэрскага раённага цэнтра дзіцячай творчасці: сонечнае, жыццярадаснае мастацтва саломапляцення, інкрустацыі саломкай, карцінкі з бяросты, арыгінальныя цацачныя звяркі ды птушкі з добрымі "выразамі твараў"... Ва ўлонні выстаўкі наладзілі бліскучае выступленне госці — народны ансамбль народнай песні і музыкі "Палеская жывіца" Палаца культуры Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода (мастацкі кіраўнік Ірына Мандрык). Слухаючы іх, углядаючыся ў аблічча і постаці гэтых жвавых і адухоўленых, дасціпных і зухаватых музыкаў з народа, можна забыцца на час...

Між іншым, у тым самым фае разгарнулася і невялічкая экспазіцыя работ Аляксандра Плістава, чачэрскага майстра гальванапластыкі. Пазнаёміліся мы ў верасні 2005-га, падчас фестывалю Беларускай камернай музыкі, наладжанага Нацыянальным канцэртным аркестрам у Тураве. У старажытным горадзе было вялікае свята, на якое з'ехаліся і госці са сталіцы, і творчы люд ці не з усяе Гомельшчыны. Шпацыруючы паўз найбагацейшы кірмаш рамёстваў, "тавар" гэтага чалавека проста немажліва было абмінуць. Сярод нашых традыцыйных народных промыслаў нічога падобнага няма. Гэта не сувенірная чаканка, не саматужнае ліццё, не штампоўка. Гэтыя, скажам так, вырабы класічнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўражваюць найвысокай тэхнічнай дасканаласцю і эстэтычнасцю мастацкага вобраза. Гэта — гальванапластыка.

Разгаварыліся з майстрам, які аказаўся з Чачэрска. Не ведаю, як сёння (падчас "Чачэрскіх сустрэч" пабачыць яго ля аўтарскай экспазіцыі не давялося), а тады Аляксандр Плістаў працаваў у чачэрскай міліцыі. Называў сябе аматарам, да якога захапленне гальванапластыкай прыйшло выпадкова і... не адпускае. Гадоў 15 таму ўбачыў такія работы ў сябра, захацелася і самому паспрабаваць дзіўнае рамяство. Пачаў мэтанакіравана асвойваць новы занятак. Давялося праштудзіраваць фізіку з хіміяй, якім у школе сур'ёзнай увагі не надаваў. Метад гальванапластыкі амаль 170 гадоў таму распрацаваў выданы фізік і электратэхнік Барыс Якобі. З дапамогай гэтага працэсу ўдаецца атрымліваць дакладныя металічныя копіі прадметаў.

Высокамастацкія арыгіналы А. Плістаў знаходзіць у музеях, дзякуючы знаёмым і сябрам. І атрымлівае медныя шэдэўры: дэкаратыўныя талеркі, пано з ювелірна ўзноўленымі антычнымі сюжэтамі, біблейскімі сцэнамі, геральдычныя знакі, велікодныя сувенірныя яйкі, медалі. Ёсць нават копіі работ Бенвенута Чэліні, Мікеланджэла. У Аляксандра Леанідавіча ўжо за дзве сотні такіх вырабаў, яны экспанаваліся на больш як дваццаці выстаўках у Беларусі. Удзельнічаў у адным з дабрачынных еўрапейскіх аўкцыёнаў, які ладзіўся ў падтрымку дзяцей Чарнобыля...

Надвячоркам

Едзем дадому. Манатонны спеў матора гучыць, як ціхая калыханка. На мяжы неспакойнага і кароткага дарожнага сну мрояцца-множацца ўражанні гэтага вясновага дня. Вобразы небяспечна хворай, кінутай людзьмі, зямлі; асірацелых студняў пад калісьці адмыслова прыгожымі, а цяпер апанаванымі нейкай шэрай каростай, дашчанымі буданчыкамі. Вобразы ацалелых, але ўжо не жывых самотніц-хацін і дыхтоўных сялянскіх дамкоў з усё яшчэ белымі ліштвамі над чорнымі праваламі аконных вачніц. Вобразы спляжаных падворкаў са слядамі зруйнаванага і пахаванага жытла... Здаецца, яшчэ хвіліна — і ў панылым спеве матора пачуюцца ноткі чарнобыльскага рэквіема.

Чарнобыль: імгненні, гадзіны, гады жаху, плачу, адчаю, зняверанасці, пакоры, надзеі. Чарнобыль: у кожнага свой, але, што ні кажы, — адзін на ўсіх. *Memento mori...*

Але мінаюць жалобныя кіламетры і чуецца мажорны вокліч захаплення: мы едзем праз казку! Паабапал дарогі разгортваецца дзівосная панарама: сонечны надвячорак, Дняпро без берагоў, фантазійны жывапіс паводкі... І ўспамінаюцца свежыя разоры палеткаў, і павесялелыя, абноўленыя шаты хвояў, і гурма кабет на чачэрскай вуліцы: жвавыя, гаманкія, цягавітыя, настроеныя на працу — у кожнай без малога мех нарыхтаванай насеннай бульбы. І ўспамінаецца ўвесь гэты шчодры і шчыры, напоўнены жывой музыкай, фестывальны дзень. Дзень сярод людзей, улюбёных у жыццё.

Старажытныя выслоўі, мудрасць якіх апрабаваная часам, перадаюцца з пакалення ў пакаленне, што называецца, без варыянтаў. *Memento...* Стоп! Згадаўшы вядомы ўсім лацінскі афарызм, захацелася сёння парушыць яго сакральную трапнасць і замяніць наступнае звыклае слова — антонімам: *vita.* Помні пра жыццё!

С. БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: старшыня Чачэрскага райвыканкама В. Максіменка і народны артыст Беларусі М. Фінберг адкрываюць музычнае свята; майстар гальванапластыкі Аляксандр Плістаў на фестывалі ў Тураве.

Фота В. Кавалёва

«Крыж ігуменні»

Пры сустрэчах з культработнікамі, настаўнікамі, кіраўнікамі шматлікіх творчых асяродкаў рэспублікі, асабліва пасля друкавання ў "Полымі" кінарамана "Спасам пакліканыя", даводзілася чуць просьбы пра стварэнне такога агульнага кінасцэнарыя, які падагуліў бы сюжэтыку рамана "Пакліканыя" і драматычнай містэрыі "Крыж ігуменні" ("Маладосць" г.г., № 1,2, што прыдасца для кінастудый, а магчыма, і тэатраў розных узроўняў. У гэтай сувязі сведчу, што агульны матэрыял бачыцца мне падзеленым на 4 фільмы, 8 містэрый, 16 частак, кожная з якіх мае сваю ўнутраную структуру і сюжэтыку.

Аўтар

"... бо яна наступіла нагамі сваімі на змяіную галаву гэтага злога раба і процістаяла дзёрзкасці яго акаяннай..."

("Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні манастыра Святога Спаса і Найсвяцейшай Ягонай Маці, што ў горадзе Полацку. Благаславі, Ойча!")

...І ўсіх іх — галоўных герояў серыяла — сямёра: ігумення полацкая Еўфрасіння, ігумен з Бельчыцаў Міхал, чаляднліца Еўпраксія, князёўна Менская Вольга, князь Давыд, чарніца Даля, летапісец Коста. І з імі — імператарскі тлумач і ахоўнік Асан. А таксама Кажадуб, наглядчык порубу і кат; Лазар Богша, майстра; Веранія, жонка Міхала; Сава, кмет порубу, вартаўнік манастыра; Рымша, брат Міхала, соцкі Запалоцкай варты; Анёл срэбракрылы; Пасланец д'ябла, прадстаўнікі духавенства і паганства, воінства, містычнага і рэальнага свету, у тым ліку — князі полацкія і кіеўскія.

...Яшчэ не завершыцца малюнак грознага шторму на Міжземным моры, які суправодзіць цітры, а полацкія паломнікі ўжо скупна пойдуць праз спякотную Іудзейскую пустыню, пясок якой, наліпшы на полы іх манаскіх шатаў, пачне гучна абзывацца пры хадзе:"Шшах....Шах...Шах..." Менавіта гэтае камертонавае шаханне гарачай галілейскай прасторы, сімвалізуючы няўпынны рух чалавека праз пустыню жыцця да Госпада, стане суправаджаць палачан праз усю іх доўгую, перапоўненую перашкодамі, дарогу. І гэты няпросты шлях у Іерусалім стане развіццём канкрэтных паломніцкіх успамінаў, што высвецяць перад намі як жыццё ўсяго Полацкага княства XII стагоддзя, так і дзейнасць самой Ігуменні з далёкага манастырскага Сяльца...

Гістарычна-часавыя межы серыяла: Пачатак XII ст. — канец 60-х гадоў XII стагоддзя.

Мясціны галоўных падзей: Старажытнае Полацкае княства; Меншчына разам з Заслаўем; Кіеў са святымі лаўрамі, старажытная жмудзь; Візантыя і Канстанцінопаль; іншыя мясціны, звязаныя з паломніцкім шляхам да Дамавіны Гасподняй, у тым ліку: Міжземнае мора, Галілея, Іудзейская пустыня, Іерусалім, уключна з Гефсіманскім садам.

Асобасныя вымярэнні. Галоўная гераіня фільма — князёўна Прадслава, яна ж, у будучым, ігумення манастыра Святога Спаса Еўфрасіння. Асоба яе, характар, а таксама падзейнасць фільма будуць разгортвацца на працягу шасці дзесяцігоддзяў, у чатырох часавых вымярэннях.

I. Першы і другі часавыя пласты звязаны з юнацтвам князёўны — ад прыходу ў келлю-скрыпторый дванаццацігадовай перапісчыцы да першага аб'яўлення ёй Анёла, які прынясе Прадславе Боскі наказ стварыць манастыр у Сяльцы (прыкладна 1125 г.)

II. Трэці і чацвёрты перыяды кінажыцця славутай ігуменні звязаны з абвастрэннем барацьбы паміж Кіевам, Полацкам, Навагорадам за дзяржаўнае першынства ў Кіеўскай Русі, у выніку чаго адбыўся вайсковы паход вялікага князя Мсціслава на Полацкае княства, а таксама наступнае за гэтым забранне ў палон і высылка ў Візантыю (1129 г.) полацкіх князёў, у лік якіх трапілі бацькі ігуменні. У такіх абставінах адбываецца мацаванне на полацкіх землях хрысціянскай веры: будаўніцтва царквы Святога Спаса, пасольства пасланцоў Еўфрасінні ў Царгород па Адзігітрыю, стварэнне знакамітага крыжа Лазара Богшы і, урэшце, паломніцтва палачан на чале з Еўфрасінняй у Іерусалім(зіма — вясна 1167 года).

Галоўныя сюжэтныя канфлікты. Галоўныя канфлікты фільма судакранаюцца з канкрэтнай дзейнасцю самой Еўфрасінні. Вастрыню разгортвання падзей таксама падтрымаюць іншыя паралельныя лініі. Да прыкладу: **1.** Барацьба за ўладу паміж мінскім Расціславам і полацкім Рагвалодам; **2.** Змаганне за ігуменства паміж Еўфрасінняй і князёўнай Звеніславай; **3.** Развіццё любоўнага "трохкутніка", што звязаны найперш з жорсткім запалоцкім князем Барыславам, які, аслеплены страсцю, на працягу ўсяго фільма "мадэліруе" сітуацыі авалодання ігуменняй. Асобная роля ў інтрызе адводзіцца князёўне Звеніславе, закаханай у Барыслава. Таму сутычкі яе з Еўфрасінняй падсвечаны не толькі змаганнем за ўладу ў абіцелі, але і рэўнасцю. **4.** Асабліва важны для развіцця падзей і канфлікт веравызнанняў — смяротная барацьба паміж тагачасным паганствам і маладым хрысціянствам, дзе галоўнымі супраціўнікамі становяцца, з аднаго боку, епіскап, ігумення Еўфрасіння, ігумен Міхал і святары. У супроцьлеглым лагеры — вешчуны Вікула і Валодша, актыўныя "слугі" паганскіх бостваў Хорса, Перуна, Лады. Асобная роля тут адводзіцца таксама юнай дачцы князя Расціслава Вользе "Агненніцы", якая займае адметнае месца і ў любоўных перыпетыях. **5.** Што да завяршэння фільма, то дзеянне фіналу пераносіцца ў большасці выпадкаў у Візантыю і Галілею. Рэтраспекцыі толькі завяршаюць тую ці іншую сюжэтныя лініі. Такім чынам, адбываецца завяршэнне полацкіх "жыццяпісаў" такіх персанажаў фільма, як Барыслаў, Еўпраксія, Вольга, Міхал, Лазар Богша і, вядома, сама ігумення Еўфрасіння. Непасрэдна ў паломніцтве палачан сустракаюць свае неспадзяванкі. Да прыкладу, — сутычкі ігуменні і брата імператара Мануіла ў Канстанцінопальскім палацы падчас спробы выкрадання наследнага прынца Алексіса. Ставіцца сюжэтная кропка і ў завяршальнай гісторыі біярмійскага скарбу, што супадае з завяршэннем усяго паломніцтва.

Містычны падсвет. Містычны змест фільма найперш у малітоўнай узаемасувязі ігуменні Еўфрасінні з Маці Божай, Збаўцам, містычнай "прысутнасці" сакральных супраціўнікаў: Анёла срэбракрылага і Пасланца д'ябла, якія змагаюцца за ўплыў на ігуменню. Асобная роля адводзіцца таксама цудам Еўфрасінні, што асабліва ярка праявіліся падчас будавання царквы Святога Спаса і выгнання бесаў з менскай князёўны Вольгі "Агненніцы"і галілейскай палонніцы Алмы. Асобная старонка ў гэтым кантэксце адводзіцца містычным прывідам Іудзейскай пустыні — персаніфікаваным ветру Хамсіну і Змію Галаадскаму. Апошні пэўным чынам увасабляе ўсю апраметную сілу і насцігае ігуменню па дарозе ў Іерусалім. Такім чынам, рэальнае ў фільме пераплятаецца з містычным, люструючы незвычайнасць асобы ігуменні з Полацка — адной з самых загадкавых жанчын Сусвету.

СЮЖЭТ ФІЛЬМА (сцісły агляд): Фільм першы. Спасам пакліканыя (дзве містэрыі, чатыры часткі): ***Містэрыя першая. Акрыленая(ч. 1—2); Містэрыя другая. Час чумы (ч. 3— 4);*** **Фільм другі. Сяльцо ігуменскае:** ***Містэрыя трэцяя. Абіцель(ч. 5—6);Містэрыя чацвёртая. Вольга, князёўна менская "Агненніца" (ч. 7—8);*****Фільм трэці. Князь Мсціслаў:** ***Містэрыя пятая. Напад на абіцель ч. (9—10); Містэрыя шостая. Замах на Расціслава (ч. 11-12);*** **Фільм чацвёрты. Абранне:** ***Містэрыя сёмая. Паломніцтва(ч. 13—14); Містэрыя восьмая. Сад Гефсіманскі (ч. 15—16).***

Агульнае апісанне першага фільма "СПАСАМ ПАКЛІКАНЫЯ".

Першы фільм прапанаванай кінастужкі — Містэрыя першая. Акрыленая(ч. 1— 2); Містэрыя другая. Час чумы (ч. 3—4) — своеасаблівая запеўка для ўсіх наступных сюжэтных ліній. Таму з самага пачатку рэтраспектыўна падаецца бліскавічная гісторыя біярмійскага скарбу, што трапляе на Полаччыну якраз у тую снежную зіму, калі ў палацы князя Святаслава нараджаецца дачка. У гэтай сувязі разгортваецца малюнак містычных прыродных катаклізмаў, а таксама смерці купца Кірыкея ад рукі вешчуна Вікулы. Вастрыню частцы надае таксама фрагмент з'яўлення ў вешчуновым будане падкіданца Валодшы, з якім, як і з самой Прадславай, мы сустракаемся ажно праз дванаццаць гадоў — у школе пісца Данілы, дзе і знаёмяцца ўсе будучыя сябры князёўны — сын жмудзінскі, купец Кірык, сын вешчуна Вікулы Валодша, сын баярына, будучы ігумен, Міхал, княжыч-смалянін Дабраслаў, а таксама лучнік Кажадуб — будучы забойца і наглядчык порубу. Адбываецца і першая сустрэча Прадславы з запалоцкім князем Барыславам, што запальвае ў сэрцы немаладога князя пякучую жарсць да гожай пляменніцы.

Другая частка містэрыі распачынаецца сватаннем да Прадславы маладога смаляніна, калі ўпершыню абвастраецца супрацьстаянне Прадславы волі бацькі — князя Святаслава. На пярэдні план выступае забойства князем Барыславам саперніка, смаленскага княжыча, што адбылося на вачах у Прадславы. Не вытрымаўшы нервовага напружання, тая ўрэшце трапляе ў Заслаўскі манастыр ігуменні Раманы, дзе знаходзіць супакаенне ў малітвах і рыхтуецца да пострыгу ў манашкі. І пострыгу гэтаму не можа перашкодзіць нават бацька, які якраз удзельнічае ў паходзе вялікага кіеўскага князя Мсціслава на Менск. У якасці ўстаўкі разгортваецца сюжэт выкрадання Барыславам жонкі жмудзінскага купца Кірыка Алмы, якую адразу ж вывозяць на ўсходнія рынкі. Другая, упадабаная Барыславам, жанчына, жонка Міхала, таксама школьнага сябра Прадславы, амаль адначасна выкрадзеная тымі ж запалоцкімі слугамі, застаецца ўжо ў харомах Барыслава простай пакаёўкаю. Адбываецца таксама сустрэча жмудзінскага купца Кірыка з Барыславам, на якой апошні абяцае заклапочанаму купцу знайсці і вярнуць яго жонку Алму. Праўда, з умоваю выклікаць Еўфрасінню з Сафійскай келлі на начную сустрэчу да ракі. Авантура запалачаніна, аднак, не ўдаецца... Змест часткі звязаны таксама з княжай дачкой Звеніславай, што трапляе на лячэнне ў Эльблонг, дзе і сустракаецца з доктарам Тазігам, які пры развітанні з гэтай полацкай князёўнай дае ёй урокі авалодання людскімі сэрцамі і душамі. З гэтага моманту Звеніслава стае важнай сюжэтнай фігурай, якая на працягу фільма будзе выконваць ролю супраціву Еўфрасінні і ў справах манастырскіх, і ва ўзаемаадносінах з людзьмі.

Галоўная дзея трэцяй часткі разгортваецца і ў Полацку, і на паганскім капішчы ў пушчы, дзе адбываецца першая сур'ёзная сутычка маладой манашкі з вешчуном Вікулаю. Менавіта трэцяя частка — адна з важных кінаілюстрацый пастаўлення князёўны-манашкі, што ўпершыню, пры пахаванні на паганскім капішчы ахвяраў чумы, атрымлівае псіхалагічную перамогу над раз'ятранымі людзьмі. Велічна гучыць у фільме і матыў славы полацкіх князёў.

...Шуміць веснавая Дзвіна, нясе на сваіх рабрыстых хвалях плыты з людзьмі. І тымі, што палеглі падчас бойкі з атрадамі хана. І са знішчанымі чумой. Плывуць так блізка ад Полацка чаўны пад чорнымі вятрыламі! ...Шуміць бурная рака, а да яе берага ўжо спускаюцца ў баявых плашчах полацкія князі, і старэйшы, Барыс, звяртаючыся да месцічаў, што згрудзіліся на гарадской сцяне, гучна рапавядае пра свой намер выехаць у Кіеў для мірных перамоў. ... Зноў грымнулі ў бераг капытамі коні грыдняў. Зноў паімчала па ўзбярэжжы княжая варта. Паклікалі на бераг з келлі званы Сафіі і маладую Еўфрасінню. Але вось адплывае ад берага вялікі човен-струг, што ўрэшце прыстае да гарушкі, дзе знаходзіцца капішча. На бераг, услед за Барыславам, падымаюцца Еўфрасіння і малады бельчыцкі святар. Менавіта тут, на паганскім капішчы, у сутычцы з вешчуном Вікулаю, і ў вострым " дыялогу"са смердамі, якія маюць намер аддаць яе ў ахвяру вогненнаму Перуну, нявопытная, здавалася б, манашка ўсё ж... паварочвае сітуацыю на свой бок. Атрымаўшы, аднак, удар ад запалоцкага соцкага Рымшы, страчвае прытомнасць. Магчыма, якраз гэта і ратуе яе ад Барыслава, які, не дасягнуўшы ад князёўны ўзаемнасці, пакідае капішча...

...Імчыць, уцякае ад жоўтай смерці князь Барыслаў, сустракае па дарозе карэту, дзе сядзіць князёўна Звеніслава. Адзін толькі позірк маладой красуні на чарнавокага князя — і лёс яе першага кахання вырашаны. Аднак, — не аціхае чума... Не слабее і закаханасць паміж запалачанінам і Звеніславай. Вось толькі чамусьці выкрыквае князь начамі дзявочае імя Сяльцовай ігуменні: "Прадслава!", што нараджае ў сэрцы Звеніславы пякучую рэўнасць...

Пульсар устаўкі. Кірык. Зразумеўшы ўсю гнюсную ролю Барыслава ў выкраданні Алмы, колішні школьны сябра Прадславы жмудзінскі купец Кірык, сабраўшы адчайных людзей, робіць напад на запалоцкія харомы, аднак трапляе ў палон і ўрэшце — у страшную змяіную яму, падняцца з якой яму дапамагае Веранія. Апошнюю, ужо цяжарную, за правіну Барыслаў адсылае ў поруб. Там і нараджае яна дзіця. Пачынаецца галоўная дзея чацвёртай часткі, што развіваецца ў двух кірунках. Адзін з іх пераносіць гледача ў лекавую весю, дзе маладой Еўфрасінні даводзіцца прымаць на сябе ўдары персаніфікавай чумы і ўсіх тых, хто хоча ці за грошы, ці за бачнасць прыняцця хрысціянства купіць Боскую літасць і аздараўленне. Аднак паводзіны манашкі, што не па-дзявочы смела выступае супраць чумы, урэшце пераконваюць і прыводзяць да веры многіх, хто ўрэшце атрымлівае ацаленне. Час чумы завяршаецца магутнай веснавой паводкай і злачынствам на капішчы — укрыжаваннем бельчыцкага святара на кургане капішча. Другая дзея чацвёртай часткі сакральная і распавядае пра аб'яўленне Анёла, які перадае манашцы Боскі наказ будаваць у Сяльцы новы манастыр. Атрымлівае яна і дабраславенне епіскапа. Нагадаю, што названая перадача метахіі ў Сяльцы адбылася 19 жніўня 1126 г. Аднак галоўная складанасць тагачаснага палітычнага моманту заключалася ў тым, што пасля смерці Вялікага Уладзіміра Манамаха паўсюль запанавала палітычная нестабільнасць, і гэта ўскосна паўплывала і на полацкае жыццё. Аднак у жыцця манастырскага — свае асаблівасці, галоўны сэнс якіх — быць асновай спакою і міру для жыхароў не толькі Полацка, але і бліжэйшых гарадкоў. Вось чаму, яшчэ нават не паспеўшы павесіць на грудзі ігуменскі крыж, трапляе манашка Еўфрасіння ў даволі складаныя сітуацыі, адна з якіх — наведванне разам з епіскапам полацкага порубу, дзе адбываецца сустрэча ігуменні з наглядчыкам порубу і будучым вартаўніком абіцелі Савам. А таксама — з увязненай Вераніяй, якую маладая ігумення рашуча вызваляе з порубу. На гарызонце падзейнасці таксама ўзнікае былы знаёмы Еўфрасінні — Кажадуб, які стане іграць важную ролю пры праследаваннях ігуменні князем Барыславам.

Другі фільм "Сяльцо ігуменскае" закранае галоўным чынам падзеі 11-26—1129 гадоў і разгортваецца ў трох цесна спалучаных паралелях. Адна з іх паступова пераносіць падзейнасць з Полацка ў Сяльцо, паставіўшы ў цэнтр увагі адно маладую ігуменню Еўфрасінню і тыя нечаканыя суровыя выпрабаванні, якія давялося адолець ёй падчас адкрыцця і ўмацавання новай абіцелі. Гэта і новы віток змагання з пасланцамі апраметнай — зграяй пушчанскіх ваўкоў, і першае пранікненне ў новую абіцель граху — нараджэнне прышлаю манашкай пазашлюбнага дзіцяці.

Пэўным чынам да азначанага перыяду адносіцца і пабудова ігуменняй новай царквы, што адкрывае ў серыяле **тэму цудаў Еўфрасінні**. Якраз *тэма цудаў Еўфрасінні* уводзіць у серыял новую гераіню. Дзёрзкую князёўну-ваярку Вольгу Менскую. І адметныя рысамі гэтага няпростага персанажа стае яе асаблівая блізкасць да паганскага свету. Аднак магутная стыхія пакланення прыродзе паступова як бы зліваецца з новым пачуццём — вераю Вольгі ў Хрыста, вынікам чаго стае хрышчэнне ёю смердаў агнём і мячом. Што да цудаў Еўфрасінні, то якраз юная Вольга "Агненніца", захварэўшы, была вызвалена ад унутранага беса дзякуючы малітве Еўфрасінні. Асобная тэма — смерць Савы, даўняга ахоўніка ігуменні, з якім звязаны таксама тонкія лірычныя настроі фільма. Новая паралель стужкі адносіцца да міратворна-палітычнай і дыпламатычнай дзейнасці ігуменні, расказваючы пра яе ўдзел у вечы падчас выбару вялікага князя. Гаворка ідзе пра прыезд у Полацк князя Расціслава з Менска, і ў гэтым сюжэце асаблівае гучанне фільму надае трапяткая нота кахання Валодшы і Вольгі.

Трэці фільм "Князь Мсціслаў" закранае галоўным чынам 1128—1129 гады. Гісторыя сведчыць, што Мсціславу ўдалося перамагчы хана Баняка, і як толькі над боем празвінела апошняя страла, вялікакняжыя мячы грозна павярнулі ўбок Полацка. Абвастрэнне нестабільнасці пачалося і пасля смерці князя Барыса. Прынамсі, усё жыццё манастыра рэзка абвастрыла барацьба за ігуменства. І ў гэтым сэнсе праціўніцай Еўфрасінні становіцца Звеніслава. Насцярожыў таксама прыезд у абіцель баяраў з патрабаваннем выдаць ім для замужжа нават тых сёстраў Еўфрасінні, што ўжо прынялі пострыг. Аднак цвёрдая пазіцыя ігуменні перамагае. Іншая справа, што не заўжды атрымлівае яна падтрымку саміх сёстраў. І вось — напад Мсціслава на Полацк, які сёстры адчулі і на сабе. Атрад схмялелых вояў урываецца на падворак абіцелі, дзе іх нечакана сустракаюць невядомыя абаронцы — жмудзіны Кірыка.

Аднак самыя вострыя тэмы трэцяга фільма — дзве. Першая — суд над палоннымі князямі і высылка іх, у тым ліку бацькоў ігуменні, у Візантыю. Другая распавядае пра замах на князя Расціслава, уцёкі таго ў Мінск, а таксама напад Рагвалода на Меншчыну з мэтаю сагнуць супраціўніка і напалохаць Полацкае веча. Аднак непакорны Полацак, разам са сваёй ігуменняй зноў пракрычаў за Расціслава. Міратворнасць, уменне трымаць у руках грамаду людзей, здольнасць суцішваць мячы закранаюць у людскіх сэрцах патаемныя струны. ...Менавіта такой хочацца бачыць ігуменню ў фільме ці на сцэне.

Фільм чацвёрты. "Абранне". ...І апошняе, што згадвае ігумення, сыходзячы па трапе на галілейскі бераг, напэўна, той апошні іх паход з усімі сёстрамі ў пушчу каля бурлівай Лагвянкі, дзе раптам згадалася, як яна прыязджала сюды яшчэ разам з бацькам. Але тая пачвара, што сачыла за ёю ўсё жыццё, насцігла манашку і ў гэтым лесе, раптам скочыўшы з-за дрэў на грудзі... Аднак той, залатавалосы і дужы, той, хто апярэдзіў нават ваўчыцу, быў мацнейшы. І ўсё ж не змог... Не змог уратаваць сябе.

...І апошняе, што згадвала Звеніслава, а цяпер чаляднліца Еўпраксія, — гэта здзіўснага хараства крыж Лазара Богшы, які трымала ў руках сама ігумення, радуючыся, што ёсць у Полацка свой абярог і, значыць, блізіцца іх паломніцтва ў Святую Зямлю. Але вось яна ўжо — на хісткай паломніцкай павозцы, што кіруе праз пякучую Іудзейскую пустыню. Тут, у Галілеі, лінія Вольгі — "Агненніцы" завяршаецца таксама " ...з мячом у руках". Бо зноў яна, ужо зусім блізка ад Іерусаліма, бароніць сваю ігуменню і ўсіх палачан ад рабаўнікоў... Прывідны меч бліскае ў яе руках і ў самым канцы фільма, якраз тады, калі Вольга на сваім танканогім кані суправаджае ігуменню праз горнія весі да той, апошняй, брамы.

...І апошняе, што чамусьці згадалася самой ігуменні, калі яна ўжо ляжала на смяротным ложы, да якога ішоў Анёл срэбракрылы, — страшная жнівеньская ноч таго лета, калі разам з Еўлампіяй ехала яна ў Сяльцо на адкрыццё манастыра. І як даганялі іх пасланцы апраметнай — звар'яцелыя ваўкі, насуперак якім кінулася з адчайным крыкам чарнавалосая Веранія, уратаваўшы ігуменню і яе нянькучарніцу Еўлампію ад немінучай смерці.Запомнілася паломнікам і здарэнне ў палацы імператара Мануіла, дзе, карыстаючыся адсутнацю гаспадара, адзін з яго старэйшых братоў-прынцаў няўдала паспрабаваў выкрасці наследнага прынца, назваўшы вінаватаю ў тым ігуменню з Полацка. Аднак ні патрыярх, ні сама імператрыца не дазволілі... Падзеі заключнай часткі чацвёртага фільма (да 24 мая 1167 г.), паралельна з паломніцкімі сюжэтамі, рэтраспектыўна закранаюць галоўныя полацкія рэаліі апошніх гадоў манастырскага жыцця ігуменні Еўфрасінні. Пасля, калі Еўфрасіння выпрасіць у Госпада літасць завяршэння жыццёвага круга і светлалікая ваярка Вольга будзе суправаджаць сваю ігуменню ў той апошні шлях да Варотаў, Амінь белы, на белым кані, з дзідаю ў руцэ, такі падобны да Анёла срэбракрылага, з якім ігумення так часта сустракалася на зямлі, ужо будзе стаяць і цярпліва, з водбліскам бессмяротнасці на абліччы, пазіраць на вечную дарогу, чакаючы яе... Ігуменню з Полацка Еўфрасінню.

Валянціна КОЎТУН

Уладзімір ЕРМАЛАЕЎ

ПРА МУЗУ ПЕРШУЮ

Там, далёка, на пачатку
Маладой маёй вясны...

Я раствор цягаў на тачцы,
Я кароўнік будаваў.
І кружыла мяне ў танцы
Занямонская ўдава.

Я з ёй потым самы першы
Там, у пушчы, заблудзіў.

З таго часу і блукаю,
І шукаю, і блуджу.

Казімір Камейша

Выспявае кожны з часам,
Я ж хутчэй за іншых спеў.
Павучыўся ў сёмым класе
І ў дзесяты захацеў.

Праз гады гатоў прызнацца:
Кругам пойдзе галава,
Як цябе да першых танцаў
Падбухторыць удава.

Я правальваўся ганебна,
У каленях ажно млеў.
Што было ўдаве патрэбна,
Не дакладна разумеў.

Можа, думаў, хоча вершаў,
Каб ад сэрца... для душы.
Угаворвала ж: — Камейша,
Ты ў раёнку больш пішы!

Я цягаў на тачцы грузы,
Я кароўнік будаваў.
Стала потым першай Музай
Занямонская ўдава.

З той пары я вопыт маю,
Не раўня ўжо смаркачу.
Часам новых Муз шукаю,
Часам даўніх палічу.

Юрась НЕРАТОК

З ЖЫЦЦЯ БАМОНДУ

О Брытні Спірс Лагойскага раёна...
Ты так спакусна клеіла канверты...

Мікола Шабовіч

Калісьці я шаптаў табе ўлюбёна,
Што не бывае выпадковых супадзенняў:
Ты — Брытні Спірс Лагойскага раёна,
Я — Мікі Рурк (ці Стывен Шаб)
з Бадзень-Бадзеняў.

Мінула часу шмат з таго спаткання.
Адказнай справаю займаешся цяпер ты:
Пішу я вершы пра сваё каханне,
А ты спакусна клеіш мне канверты.

САМАДУР-НІЗАЦЫЯ

У прыёмную генеральнага дырэктара фірмы "Ад работы коні дохнуць" Васіля Асла завітаў дзед Мацвей і спытаў у расфуфыранай сакратаркі:

— Ці можна да Васіля Макаравіча?

— А па якім пытанні?

— Сканала мая старая. А яна больш дзесяці гадкоў у вашай фірме адпрацавала. Мо заўтра далі б аўтамабіль адвезці труну на могілкі?

— А навошта мазоліць вочы генеральнаму? Ваша пытанне вырашыць яго першы намеснік Мікіта Свістун. Толькі не праваронце. А то застанецеся з носам.

Не паспеў Мацвей Ягоравіч адчыніць дзверы кабінета Свістуна, як той прагундосіў:

— Я вас слухаю.

— У мяне — бяда. Жонка аддала Богу душу.

— Добра, добра.

— А што тут добрага?

— Добра тое, што вы разам з ёю ў труну не сыгралі, — пачаў выкручвацца Свістун. — Прыміце ад фірмы глыбокае спачуванне... Вядома, цяпер пахаваць чалавека цяжка. Я пастараюся дапамагчы. Толькі загляніце да майго намесніка Вепрука. Я яму патэлефаную, каб ён адным махам зняў усе вашы праблемы...

Вяпрук доўга не цырымоніўся з дзедам. Нават не выслухаўшы старога адфутболіў яго да загадчыка аддзела Душагуба. Загадчык кальнуў вострым позіркам Мацвея Ягоравіча, чмыхнуў носам і прамармытаў:

— А вы былі ў майго інструктара Кандрата Казла?

— Не-е-е...

— А чаго ж тады прыгаеце праз галаву? Трэба захоўваць субардынацыю. Таму, пакуль не позна, дуйце да яго.

Ты што, мілы чалавек, учора нарэзаўся да ачмурэння, што сёння не працуюць мазгі. Нясеш усялякую бязглуздзіцу. Дзе ты бачыў, што прыгаю праз галаву? Я ногі ледзь цягаю — цэлы дзень ганяюць мяне па кабінетах, як Марку па пеклу. Скажы-ка, даражэнькі, аб якой намякнуў ты субардынацыі? Мо аб самадур-нізацыі? То гэта чыстая праўда.

Твар Вепрука наліўся чырванню і стаў, як пераспелы памідор. Каб пазбегнуць стрэсавай сітуацыі, Мацвей Ягоравіч шмыгануў за дзверы і паспяшаўся да інструктара. Казёл якраз сядзеў за сталом і сваім сінім носам уваткнуўся ў паперы.

— Выкладвайце, што ў вас, — прабасіў Кандрат Пятровіч.

— А ў мяне нічога няма. У кішэнях вецер гуляе.

— А чаго сюды вас чорт прыгнаў?

— Не чорт, а Вяпрук.

— Значыць, ёсць нейкае пытанне?

— Ёсць, саколік, ёсць. Мая жонка пакінула гэты свет. Можа, далі б машыну завезці нябожчыцу на могілкі...

— А я тут прычым? Мая хата з краю... Я ж не гаспадар! Ідзіце да генеральнага...

Асёл уважліва выслухаў дзеда і хітра ўсміхнуўся:

— А ты са сваёй бядой звяртаўся да майго першага намесніка Свістуна?

— А як жа.

— Ну і што?

— Паслаў мяне... І куды вы думаеце? Аж да свайго намесніка Вепрука.

— Ну і што?

— А той адправіў у-у-у... кабінет Душагуба.

— Ну і што?

— А Душагуб сказаў: "Пайшоў бы ты... да інструктара Казла".

— Ну і што?

— А Казёл развёў рукамі і параіў звярнуцца да вас. Маўляў вы — Бог, Цар і воінскі начальнік. Усё можаце.

— Ну Казёл, ну Казёл! Рогі табе збіваць трэба! І тут жа паклікаў Свістуна і загадаў яму:

— Мікіта Гаўрылавіч, запішы, каб не забыў. Заўтра выдзелі аўтамабіль Мацвею Ягоравічу.

— Будзе зроблена, Васіль Макаравіч!

— І яшчэ. Завязі вянок набожчыцы і грошы на жалобны стол. Закажы помнік на магілу. Ну, ці ўсё Мацвей Ягоравіч? Нічога не забыў?

— Усё, галубчык, усё. І за гэта вам вялікі дзякуй.

— Ну ты, дзеду, даў пылу, як заяц кабыле. Вялікі дзякуй... А што за яго купіш? Нічагусенькі. Дзякуй не пакладзеш ні ў кішэню, ні на ашчадную кніжку. Зрабілі табе добрую справу — і жыві пакуль...

Мікола ПАДАБЕД,
г. п. Бялынічы

Мікола ВЯРШЫНІН

Браніслаў Спрынчан

Ён — чалавек старой закваскі,
Не пазбаўляецца таго.
І часу нашага развязкі
Не вельмі ціснуць на яго.

Ляцяць мінулага пункціры,
Ды што было — таго не стрэць.
Пара мяняць арыенціры,
Душою каб не застарэць.

Георгій Марчук

Драматург усім вядомы —
Ён у творчасці, як дома.
Меў нямала важных спраў,
Выдавецтвам кіраваў,
Многа кніг павыдаваў.

Колькі п'ес, увагі вартых!
Мемуары ёсць і жарты.
Ведаюць яго тэатры.
Піша ён заўжды з азартам,
Хоць спакойна,
ды — упарта.

Анатоль ЗЭКАЎ

ФІЗІКА І КАМАСУТРА

Пачынаецца дождж веснавы.
Ну а ты ўсё марнееш над кнігамі.

Колькі ж ты яшчэ будзеш сядзець
Над сваімі законамі фізікі?

Адарвіся на момант ад кніг.
Ёсць яшчэ і законы кахання.

Хведар Гурыновіч



Зеляніна пакрыла лугі.
На бярозках успыхнулі
лісцікі.
А ў цябе пад вачамі кругі
Ад законаў, зазубраных
з фізікі.
Адарвіся на момант
ад кніг,
Зразумей, і без іх шмат
цікавага,
Бо жыццё праляціць —
нібы міг.
Ты яго й не заўважыш
за справамі.
Кінь ты фізіку, кінь,
не ўцячэ.
Будзь разумнай,
але будзь і мудраю.
Ёсць законы й кахання яшчэ,
І завуць іх здавён
Камасутраю.
Рассмакуеш — і ўжо адарваць
Стане справай наўрад
ці магчымаю.
Праўда, фізіку потым чытаць
Не прымусіш цябе і ляйчынаю.

Пятро РАДЗЕЧКА

ЛЮБЛЮ МІНЧАНАК МАЛАДЫХ

Люблю мінчанак маладых,
Ад іхніх ног займае дых.

Віктар Шніп

Я ў Маладзечна жыў
бы вечна,
Няхай паэтам бы й не стаў,
Калі б знайшоў там
і сардэчна
Якую дзеўку пакахаў.

А ў Мінску?!! —
Во дзе ўжо халява!!!
Як не лавіць нам тут
мышэй?
Ідуць, бы павы
пасля кавы
І ў кожнай ногі —
ад вушэй!..

Глядзець —
адно замілаванне!
Аж маладзееш
неўпрыкмет —
Сядай, пішы апавяданне,
Калі яшчэ ты не паэт...

Шаржы А. КАРПОВІЧА

Міхась МІРАНОВІЧ

Міранізмы

ЖОНКА ЦІ ЛІНЕЙКА?

— Хачу, Пятрусь,
Павесці цябе ў сваты я,
Чым не дзяўчына —
Мар'іна Надзейка?
— Але ў яе ж
І ногі крываватыя!..
— Табе патрэбна жонка,
Ці лінейка?!.

ПА КРУГУ

— Чаму ты п'еш? —
Спыталіся у мужа.
— Мая Улляна
Лае мяне дужа.
— Чаго ты сварышся? —
Пытаемся ва Ўлляны.
— Таму, што муж
Штодня прыходзіць п'яны.

ПЛАЧ БЫЛОГА ХАЛАСЦЯКА

— Нашто было
Жаніцца ідыёту?!
Чаму я ўсё
Раней не зразумеў:
Нашто выконваць тое,
Як работу,
Што халастым бы
За пацеху меў?!.

НЯЎДАЛАЯ РЫБАЛКА

Неяк раз
На рэчцы Лера
Падчапіла
Кавалера.
Той сарваўся,
З перапуду
Паламаўшы
Дзеўцы вуду.

ПУСЦІ-ПАВАЛЮСЯ

— Нядбалага я мужа
Маю, Люся:
Дзяржы — стаю,
А пусціш — павалюся.
І, каб яму, паганцу,
Праваліцца —
На іншую
Ўсё хоча паваліцца!..

ЦВЯРОЗА ПАРАЗВАЖАЕМ

У п'янстве, братка,
Страшная пагроза:
І менш жывем,
Ды і нябог раджаем...
Над тым падумаць
Варта нам цвяроза:
Прыходзь з паўлітрай —
І паразважаем...

ДЗЕСЯЦЬ СОТАК

На дачы ты
Працуеш у ахвотку,
Да сэрца менш
Палітыку прымаеш.
І прымеш іншым разам
Менш на сотку,
Таму, што ўласных
Дзесяць сотак маеш.

СЯРЭДНЕВЯКОЎЕ

Далёкі век
Сюжэт наступны навявае,
Карціна даўняя
Ва ўяве паўстае:
...Муж пояс вернасці
На жонку надзявае,
А рыцар ейны
Ўжо адмычку дастае...

Барыс КАВАЛЕРЧЫК

СЛОВЫ НА ПАПЕРЫ

Сяброўства з кнігай — самае бескарыслівае.

Нярэдка галоўнай нашай слабасцю аказваецца сіла прывычкі.

Школу жыцця інстытутам не заменіш.

Чым болей людзей падзяляе тваю думку, тым яна робіцца больш важкай.

Чым меней заўважаеш свае памылкі, тым больш робіш глупства.

Калі ўдаецца заняць месца пад сонцам, дык іншаму хочацца загараць і на рабоце.

Мова дрыбінскіх катрушнікаў

Штучная мова — рэч не унікальная. Яна, у адрозненне ад звычайнай, натуральнай, служыць для зносін, скажам, міжнародных (эсперанта, інтерлінгва) або для вузкага кола людзей (спецыяльная мова). Адна з распаўсюджаных, якую з поспехам асвойвае зараз і пішучая братва — гэта феня, зладзейскі жаргон.
У Беларусі, бадай, самай моцнай і багатай штучнай мовай быў катрушніцкі лемезень — мова дрыбінскіх хадзебшчыкаў-шапавалаў (ад слова катрушка — шапка). Дрыбінскія катрушнікі групамі хадзілі па свеце, валілі шапкі (катрушкі), нахірніцы (рукавіцы) і, вядома ж, славутыя дрыбінскія валёнкі — шкорні. Тым і зараблялі на пражыццё.

Чаму менавіта дрыбінцы "захапілі" манаполію на прафесійную мову і саму прафесію? Пэўна, тутэйшыя пясчаныя малаўрадлівыя землі штурхалі людзей на пабочны заробак. Кожны дбайны гаспадар трымаў на сваім падвор'і цэлы статак авечак (мерхляў). Гэта непераборлівая жывёліна карміла, апранала, абувала, ды яшчэ неблагі грашовы заробак забяспечвала. Таму катрушнікі трымалі сваё майстэрства ў строгім сакрэце, для чаго ўласную мову стварылі.

З мовай дрыбінскіх катрушнікаў мне ўпершыню давялося сутыкнуцца ў юнацкія гады, калі вучыўся ў СПТВ. У групе было некалькі дрыбінцаў. Трымаліся асабняком і часта між сабой аб нечым цірылі, або зюкалі па-свойму. Па наіўнасці, я пачаў дапытвацца, з якой яны краіны прыехалі? "З Дрыбінграда", — кажа адзін. Другі тут жа да яго звяртаецца: маўляў, "свечы мікрэц нікора не скумае, аддзякні з яго хаўбоў" (Гэты хлапец нічога не разумее, пазыч у яго грошай). І зноў да мяне: "Дзекан пленных (дзесяць рублёў) — і праз месяц ты катрушнік". Я сапраўды, па-іхнему не скумаў, хаўбоў аддзякнуў — да сяго часу доўг аддаюць.

Лемезень — гэта не жаргон Элачкі-людаедкі. У ім багацейшы дыяпазон слоў, які дазваляе весці ўпаўне лагічную гаворку на любую тэму. І дрыбінскі феномен — з'ява не унікальная. Уладзімір Даль у сваім славутым "Толковом словаре" шырока апавядае пра штучныя мовы. Мова хадзебшчыкаў, карабейнікаў, шапавалаў, тарабарская мова, якой і сёння фарсіць гуллівая моладзь. Тую ж феню мы асвоілі не горш лагернага старажыла, аперыруем такімі слоўкамі, якіх у афіцыйным слоўніку і не знойдзеш.

Наконт тарабаршчыны Даль анекдатычны прыклад прыводзіць. Двое братоў у прысутнасці бацькі вырашылі пасакрэтнічаць. Каб заблытаць сэнс гутаркі, прыбаўлялі да кожнага слова літару "хер": "Хер-брат, хер-пойдем. — Хер-куда? — Хер-в кабак". І тут бацька: "А хер-кнут?" Вядомы з гістарычных раманаў выраз "Сарынь на кічку!" належыць волжскім піратам. Такую каманду яны падавалі бурлакам, і тыя, не маючы пры сабе ніякай зброі, пакорна прапускалі бандытаў на баржу, дзе весяліліся іх гаспадары.

Даль коратка апавядае пра мову ўладзімірскіх карабейнікаў — афеню. Недарэчы зараз высвятляць, ці мае яна штосьці агульнае з феняй, а вось з дрыбінскім лемезнем кропак сутыкнення даволі многа. Нярэдка тыя ж і словы: хірка — рука, стоды — багаты, агонь — дуляс, дзекан — дзесяць, дзякаць — даваць, пазычаць... Ёсць і нязначныя адрозненні. У дрыбінцаў дзверы — рыпні, ва ўладзімірцаў — скрипни, працаваць — тут максаць, там — мастырить, рукавіца — нахірніца і нахирега... Граматыка, як правіла, мясцовая. У лемезня — беларуская, уходнемагілёўскі дыялект, які надта багата і дакладна прадстаўлены ў слоўніках Георгія Юрчанкі. Дарэчы, Георгій Фёдаравіч, як мовазнаўца, можа зацікавіцца, якім чынам дрыбінцы і ўладзіміраўцы адну мову змаксалі. Тут багацейшы матэрыял для навукоўцаў.

Узгадаў я дрыбінскую мову, калі, скалясіўшы паўсвета, працаваў ужо ў тутэйшай рэдакцыі. Было гэта яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя. Крыху падкаваўшыся, накшталт той самай Элачкі, вырашыў пагутарыць з бывалымі катрушнікамі на іх мове. Патрыярх гэтай справы Мікалай Шугоўскі сустрэў пытаннем:

— Бальва цірыць па-катрушніцку?

— Не, — адказваю, — па-вашаму я ўсяго два словы скумаю — "аддзякні хаўбоў".

— Хаўбоў у мяне самога няскень (няма), а да трэпеза (да стала) пахлім, пагаўрыдзім, бо ты, бачу, па-нашаму сапраўды ні макея не скумаеш.

Пахлілі, значыць, мы з ім да трэпеза і тут, крыху кірнуўшы, я сёе-тое пачаў скумаць, ніколькі не здзіўляючыся блізкай роднасці двух слоў — кірыць і цірыць (піць і гаварыць).

Яшчэ да вайны, юнаком, Мікалай Іванавіч абышоў амаль усю Беларусь. На Смаленшчыне бываў, на Браншчыне. Збяруцца кампаніяй, закінуць прычындалы за плечы, брынду ў рукі і пахлілі. Мову з цягам часу ён падзабыў, але лішняя кучараўка (чарка) крыху прасвятліла ягоную памяць, і дзед, задумённа пагладжваючы верэю (бараду), загаўрыдзіў:

— Апынуліся мы ў хор'і (вёсцы), скажам, недзе на Віцебшчыне. Крычым: "Каму валенкі валіць?!." Аб'яўляецца жбан (мужык). І пахлілі ў хаз (і пайшлі ў хату). Куж — гардзей на трэпез (гаспадар бутэльку на стол). Жбаха прытаганіць акрэсы з акрушай (жонка прынясе сала з хлебам), тартасы і мохмар'яў (каўбасы і агуркоў), яўрышню скурляіць (яешню сасмажыць) — і кірым да кімкі (і п'ём да ночы)... Выхлеўшы з-пад трэпеза, пачынаем мажджэрнічаць (вылезшы з-пад стала, пачынаем працаваць)...

— Дапусцім, добра накірыўшысь, мань схаліў шкорні (я сапсаваў валенкі)?

— Наскрабень ухляваць у бакрушнае хор'е! Ці плавушыць хаўбы, бо куж адчукае (Трэба ўцякаць у другую вёску, ці плаціць грошы, бо гаспадар адлупцуе).

Чытач, пэўна, ужо і сам скумае, навошта служыць катрушніку прафесійная мова. Але цірым далей.

— Ну вось, скажам, я, ваш чаляднік, драпёлы мікрэц, уздумаў на вечарынку, або да мясцовай дзяўчыны схадзіць.

— Хлі, калі воліш, на кугралку, ці для шыхты (Тут пераклад яўна залішні).

Дарэчы, калі якая дзеўка, няхай сабе і дрыбінская, выходзіла за катрушніцкага сына ці за катрушніка замуж, уся яе радня, кажуць, горкімі слязьмі плакала.

— Вяртаецеся вы, нарэшце, у хорт (дамоў). Што жбаха кажа?

— Ці сайка хаўбоў замаксалі (Ці многа грошай зарабілі?) Мікра, — ціру, — расчуквальнікі ад'яперылі (Мала, — разбойнікі адабралі)...

Штучная мова, што з пакалення ў пакаленне перадавалася дрыбінскімі хадзебшчыкамі, сёння амаль цалкам страціла свой сэнс і практычнае прызначэнне. Разам з прафесіяй. Старыя людзі яшчэ ўплятаюць у гаворку нейкае слаўцо, а моладзь ужо не цікавіцца ні рамантычнай мовай сваіх продкаў, ні іх самабытным рамяством. Хаця што такое "хаўбы", скумае і першакласнік.

А можа, калі і адрозніцца катрушніцкі лемезень? Добры абутак цяпер не ўсім па кішэні. Мікалай Іванавіч успрыняў мае разважанні з суровай задумённасцю і журботна прамовіў:

— Мерхляў, нарухі няскень! (Авечак, воўны няма!). Але чым чорт не жартуе — можа, і пахлім...

Тым часам у Дрыбінскім гісторыка-этнаграфічным музеі не на жарт задаліся мэтай ажывіць народны промысел у яго першароднасці і нават вярнуць да жыцця амаль забыты лемезень. Пры музеі стварылі клуб шапавальства, у якім займаюцца добраахвотнікі з мясцовай сярэдняй школы і былыя прафесійныя катрушнікі — у якасці выкладчыкаў. Узначальвае клуб супрацоўніца музея Ніна Радзевіч.

— Хлопцы зацікаўлена знаёмяцца з гісторыяй шапавальства, заўзята вывучаюць лемезень, а нашы ветэраны, старыя хадзебшчыкі, ахвотна даюць жывыя ўрокі гэтага няхітрага і ў нечым нават паэтычнага рамяства. Дарэчы, нам пашчасціла раздабыць слоўнік прафесійнай шапавальскай гаворкі, што яшчэ да рэвалюцыі сабраў мясцовы этнограф Яфім Раманаў і які змяшчае больш за паўтысячы слоў. Гэта адна з багацейшых прафесійных моў. Роўных ёй на Беларусі няма. І мы вучымся гаўрыдзіць пакатрушніцку, а заадно шкорні, катрушкі ды нахірніцы максаем. Шкада, няма ніякай літаратуры на мове катрушнікаў — усё б лягчэй вучоба давалася.

Ніна Мікалаеўна прывяла нас у хаз (хату) Цыганковых — тыповую шапавальскую сям'ю. Тыднем раней да іх прыязджалі дзве карэспандэнткі з Польшчы, якія ўнікліва выпытвалі ўсялякія тонкасці быту шапавалаў і іх рамяства. Так што Георгій Цімафеевіч і ягоная лухтавіна (палавіна) Алімпіяда Іосіфаўна ўжо ведалі, як абыходзіцца з журналісцкай браціяй, і куж адразу ўзяў, як кажуць, мерхля за рогі.

— Дзе я толькі ні пабываў! Усю Беларусь абышоў, часцяком на Смаленшчыну хліў. Адтуль вось і жбаху сабе узяў — Алімпіяду. А жыццё пасляваеннае ў драпёлага мікраца (маладога хлапца) было не салодкае. Вось і падаўся ў катрушнікі. Два гады ў майстра падсобнікам хадзіў — з чацвёртай ламехі (капейкі) — і толькі потым сталі заробак пароўну дзяліць. А я ж усё ўмеў — і снаваць, і таптаць, і валяць... І наруху брындай разбіваў. Брында — гэта такая доўгая палка (друкан) з нацягнутай струной з кішкі мерхля — лабузка называецца. Гэтакі гіганцкі смычок. Словам, шапавальская прылада — паходная ваўначоска. Яна нас і карміла, і весяліла і немаведама яшчэ што магла. Аднойчы ў Оршы на кірмаш трапілі. Падыходзяць нейкія мікрацы і пытаюцца: маўляў, што гэта ў цябе, за інструмант такі? І пачаў я на гэтай струне брынкаць. Паўкірмаша збегліся каб паглядзець. Цэлую давільню ўстроілі, бо музыкі такой яны з роду не сіпалі і не слыхцілі (не бачылі і не чулі). А як сталі разыходзіцца, многія заклянтошылі: "Ай, грошы з'яперылі, кішэні абчысцілі мазурыкі!"... Добра што да нас тыя кастусі (злодзеі) не дабраліся. Хаця ў мяне і яперыць было нечага — яшчэ не намажджэрыў.

Невыпадкова людзі вядуць гаворку аб адраджэнні катрушніцкай справы. Але нават на Дрыбіншчыне, на радзіме патомных катрушнікаў, усур'ёз аб гэтым думаюць толькі асобныя энтузіясты. Таму і вітаюць ініцыятыву мясцовага музея, пры якім створаны Клуб шапавальства.

— Трэба навучыць моладзь, пакуль жывуць старыя майстры, — гаворыць дырэктар музея Алена Рабкавец. — У нас багатая калекцыя, нават чавускія калегі зайздросцяць. Калісьці іх раён быў у складзе Дрыбінскага, ёсць прафесійныя шапавалы. Але так глабальна і ўсеахвотна гэта справа пастаўлена толькі ў нас, на Дрыбіншчыне. Праўда, у музеі пакуль не ўсё як след афармлена — нядаўна перайшлі ў новае памяшканне. І хаця тут шырока прадстаўлены іншыя рамёствы, — бандарства, ганчарства, лозапляценне, ткацтва і вышыўка, усё ж шапавальству аддалі прыярытэт. Гэта наш канёк. Ды і ўсё ёсць, акрамя галоўнага — грошай. Думаем абсталяваць сапраўдную майстэрню, дзе можна будзе паглядзець увесь працэс работы, як гэта было паказана на Дажынках у Бабруйску. Вось навучым моладзь валёнкі максаць, а тым часам і заводзік у Дрыбіне збудуюць. А там можа хто верш ці аповесць на лемезні пра дрыбінскіх катрушнікаў напіша.

Прыгожая, мілагучная, паэтычная і даволі вобразная мова — лемезень. Лабузка — струна, кучараўка — чарка, верэя — барада, мамура — сякера, бадуха — іголка, сіворка — зіма, сіворны — халодны, шусень — восень, волат — конь і вытворнае — валатоўнік — канакрад. Мань — я, пэўна ад слова маніць. На тое і лемезень служыць.

Міхаіл УЛАСЕНКА

На здымку: аўтар сярод катрушнікаў.

ВІНШУЕМ

з **70**-годдзем **Катлярова** Генадзя Іванавіча, беларускага літаратара.

з **65**-годдзем **Зубрыцкага** Эдуарда Іосіфавіча, беларускага паэта.

з **60**-годдзем **Жука** Алеся (Аляксандра Аляксандравіча), беларускага пісьменніка.

з **50**-годдзем **Сільнову** Людку (Людмілу Данілаўну), беларускую паэтку.

Юбілейны каляндар

(у красавіку споўнілася б)

450 гадоў **Сапегу** Льву Іванавічу, грамадскаму і дзяржаўнаму дзеячу Вялікага княства Літоўскага.

410 гадоў **Філіповічу** Афанасію, беларускаму пісьменніку-публіцысту, палітычнаму і царкоўнаму дзеячу.

145 гадоў **Багдановічу** Адаму Ягоравічу, беларускаму этнографу, гісторыку культуры, фалькларысту і мовазнаўцу. Бацьку класіка беларускай літаратуры, вялікага нацыянальнага паэта **Максіма Багдановіча**.

120 гадоў **Дзеркачу** Анатолю (Зіміёнку Анатолю Рыгоравічу), беларускаму паэту, сатырыку і гумарысту.

110 гадоў **Дзяржынскаму** Уладыславу (Чаржынскаму Уладыславу Вікенцьевічу), беларускаму крытыку і літаратуразнаўцу.

105 гадоў **Нікановічу** Міколу (Мікалаю Уладзіміравічу), беларускаму празаіку і перакладчыку.

95 гадоў **Прокшу** Леаніду Януаравічу, беларускаму пісьменніку.

Як зацікавіць беларускай кнігай

Прапаганда твораў беларускіх пісьменнікаў стала асноўнай тэмай семінара бібліятэкараў, які прайшоў у дзіцячай бібліятэцы № 2 г. Мінска. Што сёння чытаюць дзеці і падлеткі, які попыт на беларускую кнігу і што трэба зрабіць, каб зацікавіць ёй падрастаючае пакаленне, выклікаць сапраўдны інтарэс да айчыннай літаратуры — на гэтыя і іншыя пытанні спрабавалі знайсці адказы сталічныя бібліятэкары.

З цікавасцю праслухалі яны выступленне загадчыка кафедры беларускай літаратуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта, кандыдата філалагічных навук Пятра Васючэнкі. Ён распавёў пра сённяшні стан нацыянальнага прыгожага пісьменства, ахарактарызаваў тэндэнцыі яго развіцця ў розных жанрах, засяродзіў увагу прысутных на паасобных, найбольш адметных творах нашых пісьменнікаў, адказаў на пытанні.

Рэдактар аддзела часопіса "Полымя" Анатоль Зэкаў пазнаёміў удзельнікаў семінара з рэдакцыйнымі планамі старэйшага літаратурнамастацкага выдання рэспублікі, якое ў снежні адзначыць сваё 85-годдзе. Працуючы ў розных літаратурных жанрах, ён у нейкай ступені пастараўся праілюстраваць аналітычнае выступленне Пятра Васючэнкі ўласнай творчасцю: вершамі, байкамі, празаічнымі гісторыямі, літаратурнымі пародыямі, творамі для дзяцей.

Анатоль ЗАРЭЦКІ

«ЛіМ» — выданне, у добрым сэнсе, кансерватыўнае. Але сёння мы прапануем чытачам новую, радыкальную рубрыку.

Ad disputandum — гэта значыць «у парадку абмеркавання». Пад гэтай рубрыкай мяркуем уздымаць самыя вострыя, самыя набалелыя і — чамусьці — замоўчаныя пытанні, якія тычацца айчыннай культуры.

Ad disputandum — гэта дыяметральныя пункты гледжання на ўсё тое, аб чым у сённяшняй Беларусі па нейкіх невядомых нам прычынах не прынята гаварыць услых.

Беларускае кіно: ёсць ці няма?

Было! Ёсць? Будзе?!

Пагадзіцеся, казаць адназначна пра тое, што беларускага кіно не існуе як такога, нельга. Бясспрэчна, зараз Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" перажывае не самыя лепшыя часы, фільмаў здымаецца раз-два і ўсё. Але...

Беларускае кіно **БЫЛО**. У яго маюцца традыцыі, закладзеныя яшчэ ў савецкія часы. Многія тагачасныя аўтарытэтныя спецыялізаваныя выданні па кінематографе называюць "Беларусьфільм" у ліку буйнейшых кінастудый СССР.

Наша традыцыйная тэма — Вялікая Айчынная вайна. "Канстанцін Заслонаў" (1949), "Дзяўчынка шукае бацьку" (1959), "Знак бяды" (1987), "У жніўні 44-га" (1999) — вось толькі невялічкі спіс знаёмых усім кінакарцін, якія распавялі пра цяжар барацьбы з фашысцкай навалай.

Узгадайце, колькі цікавых казак знята на "Беларусьфільме". Сярод іх — "Прыгоды Бураціна", "Пра Чырвоную Шапачку" і інш.

Беларускае кіно **ЁСЦЬ**, хоць гэта можна сцвярджаць з нацяжкай. Сёння гэта паштучны прадукт. Паштучны таму, што яго насамрэч няшмат. "Сын за бацьку", "Анастасія Слуцкая", "У жніўні 44-га..." Ёсць і яшчэ назвы, можа, меней прыкметныя. Але ж яны ёсць!

"Анастасія Слуцкая" выклікала вялікі рэзананс у грамадстве. Нарэшце СМІ атрымалі кіно для дасканалага абмеркавання. "Куды пайшлі грошы? Ці так трэба было здымаць? Што атрымалася? Навошта ўвогуле нам гэты фільм?" — нават такія пытанні засведчылі, што ўвага з боку грамадства да нашага кіно існуе.

У адным з інтэрв'ю "ЛіМу" дырэктар УП "Кінавідэапракат" Мінгарвыканкама Васіль Коктыш распавёў пра фестываль "Арт-хаус па-беларуску", падчас якога дэманстраваліся работы студэнтаў Акадэміі мастацтваў. Значыць, усё ж такі здымаюць!

Існуюць у сучасным беларускім кінематографе і фільмы на зусім непапулярную тэматыку перасэнсавання жыцця краіны ў перыяд фашысцкай акупацыі і стварэння вобраза партызана. Маю на ўвазе фільм "Акупацыя. Містэрыі" (рэж. Андрэй Кудзіненка), у якім, дарэчы, заняты такія папулярныя акцёры, як Анатоль Кот і Святлана Зелянкоўская. Ёсць у ім моманты, якія могуць пакрыўдзіць пачуцці былых партызан і насамрэч адмоўна адбіцца на выхаванні маладога пакалення. Зазначу, што на той час рэспубліка святкавала 60-годдзе з дня вызвалення ад фашысцкіх захопнікаў, а таму ўзгадваць негатыўныя бакі акупацыі напярэдадні святой для краіны даты было неэтычна і непатрыятычна. Хоць фільм у рэспубліканскім пракаце не дэманстраваўся, яго ўключылі ў конкурсную праграму на 26-м Маскоўскім міжнародным кінафестывалі...

Факт застаецца фактам — фільм беларускі, які нягледзячы на неадназначную ацэнку, трывала асеў у прыватных відэакалекцыях. Неаднойчы ў Інтэрнеце бачыў шэраг станоўчых рэцэнзій, не на яго ідэйны змест, а на ігру акцёраў, рэжысёрскую манеру аповеда і інш. Зусім забароненай стужку таксама не назавеш, бо яна значыцца ў фільмаграфіі кінастудыі на яе афіцыйным сайце ў Інтэрнеце www.belarusfilm.by.

Можна падысці да пытання існавання беларускага кіно з іншага боку. Памятаеце, як ліхаманкава пачалі вышукваць радыёстанцыі беларускіх спевакоў пасля ўвядзення 75 працэнтаў беларускай музыкі ў эфіры? Тады беларускімі сталі нашы суайчыннікі, якія доўгі час працуюць на расійскай сцэне. Тое ж самае можна сказаць і пра кіно. Нашы акцёры, іншы кінавытворчы персанал задзейнічаны ў расійскіх серыялах, поўнаметражных карцінах, некаторыя праекты здымаюцца на базе "Беларусьфільма". Таксама атрымліваецца не зусім расійскае кіно?!

Перспектывы ў беларускага кіно маюцца, і для іх рэалізацыі зроблены першыя крокі насустрач. У існаванні айчыннага cinema ёсць зацікаўленасць з боку кіраўніка краіны. Створаны Дэпартамент па кінематаграфіі пры Міністэрстве культуры краіны, праводзяцца разнастайныя конкурсы. Кінастудыя не зачынена як непрыбытковае прадпрыемства. Наадварот, пастаўлена задача аднаўлення лепшых традыцый, напрацаваных яшчэ ў савецкія часы.

Многія памятаюць сярэдзіну 90-х, калі ў Расіі сітуацыя з кіно лічылася амаль што невырашальнай. Але выцягнулі. З'явіліся сцэнарысты, прадзюсеры пачалі ўкладаць грошы. Беларускае кіно **БУДЗЕ**, калі мы прыслухаемся да патрабаванняў часу, навучымся лепшаму ў іншых, але захаваўшы сваю нацыянальную адметнасць. Як у фільмах таго ж Эміля Кустурыцы.

Сяргей ДУБОВІК



Праблемы архаічнай свядомасці

Беларускага кіно няма. Ёсць добрая, моцная школа кінематографа, ёсць яе класікі, ёсць вядомы за межамі краіны брэнд — нацыянальная кінастудыя, і галоўнае, ёсць таленавітыя творцы. Але ж кіно беларускага — няма.

Пры ўсім гэтым, з усіх галінаў культуры кінамастацтву дзяржава надае, бадай што, больш за ўсё ўвагі. Дапамога прыйшла на "Беларусьфільм" яшчэ год пяць таму, на вытворчасць фільмаў выдзяляюцца вялікія грошы, але ж за ўвесь гэты перыяд толькі адзін айчынны блокбастэр — "Анастасія Слуцкая" — прымусіў пісаць аб сабе ўсе рэспубліканскія газеты.

Меры прымаюцца пастаянна. Начальнікі кінастудыі змяняюцца адзін за адным, але беларускіх стужак, якія б атрымалі шырокую вядомасць хоць бы ў краіне, не прыбаўляецца. Гэта калі не казаць пра замежжа: не тое, каб у Берліне, Венецыі ці Кане, але нават на сякіх-такіх маленькіх кінафорумах Цэнтральнай Еўропы беларусьфільмаўскія работы не прадстаўленыя.

Калі на апошнім кінафестывалі "Лістапад" журналіст спытаў у аднаго з арганізатараў, чаму на агульным моцным фоне мінскага кінафоруму выставілі такія слабыя беларускія стужкі, той вінавата адказаў: "А больш нічога беларускага не было".

Я асабіста ведаю тры добрыя постсавецкія беларускія стужкі — "Свежаніна з салютам" (1999), "Колер кахання" (2005) і "Акупацыя. Містэрыі" (2003). Першую, выдатную *нацыянальную* камедыю, квінтэсенцыю беларускага *народнага* гумару, я пабачыў зусім выпадкова: з нейкіх невядомых мне прычын адзін з шэдэўраў нацыянальнага кінематографа ніколі нідзе не рэкламаваўся. 25-хвілінны "Колер кахання" — дыпломная стужка Аляксандра Канановіча — нават дэманстравалася на экране кінатэатра "Цэнтральны". Праўда, адзін раз. Ну а працу Андрэя Кудзіненкі, па словах крытыкаў, першую беларускую поўнаметражную ігравую стужку сусветнай якасці, на беларускіх экранах пабачыць нельга: таму, што "Акупацыя. Містэрыі" з'яўляецца альтэрнатыўным поглядам на тыя падзеі, на якія погляд [мастацтва] ужо нібыта *выстаяўся*. Пры гэтым, чыноўнікі ад культуры нярэдка выраз "альтэрнатыўны погляд" безапеляцыйна прыроўніваюць да "варожы".

Частка выразу "беларускае кіно" азначае "нацыянальнае кіно". Перш за ўсё, гэта тычыцца мовы. Людзі ў Беларусі зараз вылечваюцца ад хваробы білінгвізму. Хоць самі пакуль не могуць размаўляць на матчынай, але цягнуцца да ўсяго беларускага. Першымі гэта зразумелі найбуйнейшыя міжнародныя кампаніі, якія пачалі размяшчаць сваю рэкламу па-беларуску і атрымалі ад гэтага каласальны эканамічны эфект. У век рынку кіно таксама трэба ўмець прадаваць — чаму ж тады не скарыстаць станоўчы вопыт рэкламшчыкаў? Аднак многія нашы кіношнікі яшчэ мысляць савецкімі катэгорыямі: маўляў, усё тое, што па-руску, будзе лепш успрымацца як беларусамі, так і ўсходнімі суседзямі, бо наконт расійскага рынку маюцца нейкія спадзяванні. Трэба сказаць, спадзяванні неапраўданыя: калі стужка нецікавая беларусам, то чаму інтарэс да яе павінны выказваць расіяне?

Беларускае кіно задыхнулася ў стандартным наборы тэм, сюжэтаў і вобразаў. Ніхто не адмаўляе ў гераізме людзям, што аддана ваявалі ў свой час за Радзіму. Але пра гэта знята такая безліч стужак, што не паўтарацца, здаецца, немагчыма — а любы паўтор надакучвае людзям, якія галасуюць у кінатэатрах грашыма — яўна не "за" беларускія фільмы.

Слова "кінавытворцы" даказвае сваю дакладнасць, калі разумееш, што гэтыя самыя людзі, нібы кіраўнікі заводаў, працуюць згодна спушчанаму зверху плану. І тут, як і ў часы застою, галоўным паказчыкам становіцца не якасць, а колькасць.

Беларускае кіно нагадвае мастацтва 80-гадовай даўніны, калі творцы, якія прыйшлі з эпохі нямога кіно, не ведалі яшчэ ўсіх магчымасцей гуку і гралі па-старому — з дапамогай мімікі, жэстаў, пераігрывання.

Зараз патрэбна кіно, блізкае да рэальнасці, але далёкае ад заганаў сацрэалізму. Далоў старых ідалаў! Героі, якія, падаецца, маглі б стаць усенароднымі ўлюбёнцамі за савецкім часам, з'яўляюцца сёння часткай гісторыі. Безумоўна, той, якую неабходна памятаць і шанаваць, але найперш усё ж такі — *гісторыі*.

Сучасны беларус жадае бачыць у кіно сябе — чалавека сталага, адукаванага, да пэўнай меры хітрага, які дбае пра свае ўласныя інтарэсы і разумее больш, чым гаворыць. Сучаснае кіно робяць, альбо спрабуюць рабіць, людзі, многія з якіх не ў стане ці не жадаюць асэнсоўваць беспаваротныя змены ў рэчаіснасці. Між тым, з моманту, калі трэба было гэта зрабіць, хутка міне 20 год. За гэты час на свет паспела з'явіцца цэлае пакаленне, прадстаўнікі якога пачуваюцца касмапалітамі, грамадзянамі Сусвету, і часта не могуць нават даўмецца, з якой прычыны іх спрабуюць штучна загнаць у рамкі культуры, вобразу жыцця і мыслення, звычак і праблем мінулага...

Заганяе іх у тыя рамкі беларускае мастацтва, і найперш — кіно. Гэта — асноўная прычына, з якой пераборлівы беларускі глядач бягом бяжыць ад "нацыянальнага" кінамастацтва — хутчэй за ўсё, да стужак, што створаны ва ўмовах блізкай яму еўрапейскай ментальнасці. Для выпраўлення сітуацыі бачацца толькі два выхады: альбо тым, хто робіць кіно, трэба карэнным чынам мяняць вобраз мыслення, альбо ўсвядоміць сваю некампетэнтнасць і запрасіць на сваё месца маладых.

Мікалай АНІШЧАНКА

Фота С. Дубовіка

Саюз пісьменнікаў Беларусі выказвае шчырае спачуванне пісьменніку Васілю Юр'евічу Ткачову з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці БАЦЬКІ.

РВУ "Літаратура і Мастацтва" выказвае шчырае спачуванне пісьменніку Васілю Юр'евічу Ткачову з прычыны смерці БАЦЬКІ.



Лера СОМ. *Нарадзілася ў 1966 годзе ў Полацку. Скончыла мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута і філалагічны факультэт БДУ (завочна). З 1989 года працуе настаўніцай у СШ № 5 Полацка. Выступае як бард з выкананнем песень на ўласныя вершы. Выдала два альбомы: "Genius loci" (2000) і "Зялёная душа" (2004). Выйшлі ў свет зборнікі вершаў "Блюз каралеўскае кухні", "Адзінокая зорка", "Там, на небе", "Свабода Слова Зіма".* Не так даўно з'явілася на паліцах кнігарняў паэтычная кніжка **"КАРАЛЕВА ПРЫЙДЗЕ НОЧЧУ",** вершы пра каханне.

"У паэзіі няма лёгкай дарогі. Свету трэба было б ведаць, што адзіны спосаб дасягнуць Парнаса — гэта ўзляцець да яго. Тым не менш людзі зноў і зноў стараюцца ўскараскацца на гэтую гару і альбо гінуць у прорве, размахваючы сцягамі, на якіх накрэслена "Excelsior!" — альбо, нечага дасягнуўшы, спускаюцца ўніз з тоўстымі тамамі і змучанымі тварамі. Старая памылковая думка непахісная."

Джэрард ХОПКІНС

Лера Сом — хар**а**ктарная паэтычная натура, да якіх у сучаснай паэзіі можна аднесці хіба што А. Чобата, Ю. Пацюпу ды С. Адамовіча... У іх творчасці адчуваецца пэўная літаратурная скіраванасць (у тым ліку і грамадзянская), што высноўваецца з іх жыццёвага вопыту, настойлівасць і ўпартасць у адстойванні ўласных ідэалаў. Адсюль вернасць прыпцыпу нязменнага ўласнага мастацкага погляду на свет. Жывучы ў правінцыі, гэтага дамагацца няпроста. Бо найчасцей ты застаешся там самнасам са сваімі духоўнымі і жыццёвымі праблемамі (зрэшты, сёння ўжо гэты перыферыйны фактар адносны, а вось прыпамінаючы свой даволі зацягнуты вопыт колішняй вясковай "літаратурнай аўтаноміі", дык было менавіта так)... Там рэдка ёсць на каго абаперціся, цяжка знайсці падтрымку збоку, немагчыма давесці сваю літаратурную творчую пазіцыю да сталічнага *бамонду* (праз каго?)... І найчасцей у такіх выпадках правінцыйныя літаратары натуральна, як кажуць, "закісаюць", а некаторыя і ўвогуле "чарсцвеюць" душой і занепадаюць духам... Нярэдка пачуццё абыякавасці, адчуванне ўласнай незапатрабаванасці паступова прыводзіць іх да нервовых зрываў, крыўдаў, азлобленасці, творчай інерцыі а ў рэшце рэшт і да традыцыйнай аднастайнай версіфікацыі, а то і ўвогуле графаманіі...

Аднак, да прыкладу, уявім, што асабіста вам пашанцавала — і вы, не змогшы з нейкіх жыццёвых прычын вырвацца з правінцыйнага нерата ў сталіцу, усё ж як творца спраўдзіліся і змаглі стаць адметнымі літаратурнымі постацямі, нераўнуючы, скажам, як А. Пысін, У. Калеснік, У. Карпюк, Д. Бічэль, М. Купрэеў, Н. Мацяш, В. Гадулька, А. Каско, Ф. Сіўко ды вышэй згаданыя, то ўсё адно, нават пачуваючы сябе, як рыба ў вадзе, з усімі сваімі комплексамі, звычкамі і жаданнямі, ці зможаце вы "прапісаць" на ўласную "свабодную (правінцыйную!) літжылплошчу" і беспраблемна ўладкаваць там свайго патэнцыяльнага беларускамоўнага чытача? Пытанне не так рытарычнае, як прагматычнае (для чалавека з тонкай паэтычнай матэрыяй), але больш чым надзённае (можна сказаць, нават злабадзённае) для жыццёвай планіды сучаснага літаратара з перыферыі.

Маркотны мой вершнік,
Навошта цябе пасылала
Па славу?
Мой першы,
Вяртайся дамоў да сутоння,
Прадонне чакання
Ёсць бездань адчаю...
Вяртайся!.. Страчаю...
Вяртайся!... Пачую —
Маўчу я.

Бяда аўтара, калі ён не можа зрабіць чытача сваім суразмоўцам і хаўруснікам, які суперажываў бы яго ўзрушэнні і пакуты... Што дзеля таго трэба? — быць праўдзівым, сумленным, шчырым, самаахвярным дзеля недасяжнай ісціны і пэўнай ідэі, гэта значыць штодня ўздымацца духам да вяршынь Паэзіі як самага высокага мастацтва. Думкі і пачуцці, словы і вобразы павінны **знайсціся** ў адзін і той жа час, у адным месцы, дзеля адзінай мэты — стварэння мастацкага цуда... Як, скажам, у гэтым выпадку:

Ты знік, а роспачы — няма.
Туга — яна была заўсёды.
Пачатак дзіўнай асалоды:
Ты знік, а роспачы — няма.
Няхай жыццё —
не пернік з мёдам,
Сустрэнемся — скажу сама:
— Ты знік, а роспачы няма,
Туга — яна была заўсёды.

Мне памятаецца наша першае знаёмства. На самым пачатку 90-х, будучы з тэлевізійнай групай у Наваполацку, мы здымалі сюжэт з маладым тады полацкім бардам Лерай Сом. Шмат было гаворана, спалена цыгарэт і нерваў... Лера выконвала пад гітару свае вершаваныя тэксты. Мне імпанавала яе непасрэднасць і неправінцыйная незалежнасць у думках, паводзінах, эмоцыях і літаратурных прыхільнасцях... Маладая, прыгожая, самасная, з прыхаванай нервовай няўрымслівасцю... Нам з рэжысёрам спадабаўся запісаны матэрыял, і ў хуткім часе ён з'явіўся на экранах. Пасля пачаліся яркія выступленні Л. Сом на імпрэзах у Доме літаратара і шырокі розгалас пра яе ў колах творчай моладзі. Сёння, чытаючы яе "Блюз Каралеўскай кухні", я шкадую, што сам у свой час не пабыў там, бо:

Самая лепшая ў свеце кава —
У Каралевы.
Самая лепшая ў свеце кава —
Для каралевы.
Быць прынятым на гэтай
Маленькай кухні —
Найвышэйшы гонар і асалода...
Каралеўская кава
На бэжавай кухні,
Каралеўская кава —
Яна для абраных,
Каралеўская кава —
У Каралевы.
Самыя лепшыя ў свеце вершы —
У Каралевы.
Самыя лепшыя ў свеце вершы —
Для каралевы.
Прысвяціць Каралеве санет
ці паэму —
Найвышэйшы гонар і асалода...
Каралеўскія вершы
На бэжавай кухні,
Каралеўскія вершы
Пад лепшую каву —
Гэта ўсё для абраных...

Цяпер, я думаю, вы зразумелі, чаму я шкадую, што ні разу не быў *там*.

Аднак, у ЛеГАЛа гэта не можа стаць індульгенцыяй ад справядлівай (маецца на ўвазе суб'ектыўнай) крытыкі. Дык вось, на маю думку, менавіта **бардаўскі фармат** вершаваных тэкстаў Л. Сом пазбаўляе іх неабходнай паэтычнай волі і духоўнай гармоніі. Бо Паэзія з прычыны вялікага боскага **дару** — паэтычнага таленту — усё ж з**дар**аецца ў слове, а не *дзеецца* словам. Бардаўскі тэкст гэта, часцей за ўсё, водгук на нешта (уласную праблему ці грамадскую з'яву) — рэха, аўтарскі адгалосак. Паэзія — гэта таемны шэпт альбо роспачны стогн — толькі спадзяванне на ўвагу...

Хоць, шчыра прызнаем, што некаторыя бардаўскія тэксты Л. Сом маюць права на паэтычнае *званне* і на кніжнае існаванне. (Яшчэ гадоў дзесяць таму вялася палеміка вакол вершаваных тэкстаў У. Высоцкага — паэзія ці не? А сёння ўжо і сама тая палеміка страціла сваю актуальнасць. Без голасу, гітары і жывой неардынарнай асобы самога аўтара нават тэксты бардаўскага мэтра **як Паэзія** аказаліся няжыццяздольнымі.)

У паэтычных радках Л. Сом даволі шмат празаізмаў (зноў жа, гэта прызнак надзённай і актуальнай бардаўскай тэматыкі): *"Начная праца — <u>сродак</u>// забыць, што так дарма пражыты цэлы дзень"*). Нярэдкія лагічныя, граматычныя і стылістычныя памылкі: *"І кожны <u>ходзіць на сваім баку...</u>", "Я <u>зачыняю замкі</u>...", "Шыбуеш пешшу, //Шукаеш багоў... //Каханне першы // <u>З падраных тых ланцугоў</u>..."*

Не магу не спыніцца і на яшчэ адным — *антыпаэтычным* — моманце, пра які я ўпамінаў пішучы пра А. Хадановіча, і, дарэчы, дапусціў прыкрую памылку ў напісанні лаянкі (рускага мацернага слова ў беларускамоўнай транскрыпцыі), выносячы яго на шырокае чытацкае асуджэнне — на аўтарскай вульгарнасці, а ў нашым выпадку, можна сказаць, і цынічнасці жанчыны (дата нараджэння пастаўлена пад фотавыявай Леры Сом). Не так даўно "ЛіМ" ужо звяртаўся да "парнаграфічных" намёкаў у вершах аднаго з паэтаў, і вось сёння я змушаны завярнуць увагу на гэта зноў... Прывяду адзін верш цалкам, каб пазбегнуць далейшай недамоўленасці:

<u>Калі жанчына разнімае ногі,</u>
Абхоплівае талію каханка,
Яго сцябло яе знаходзіць кветку,
пухнатую ці голеную гладка,
Што думае яна у гэты момант?..
"<u>Нішто памеры</u>",
"Прыкупіць бы бульбы",
"Надвор'е — клас,
я файна загарэла",
"<u>Наступны раз</u>
<u>не забываць пракладку</u>",
"Я сыну не сказала пра капусту",
"Хачу на мора",
"Хоць бы заплацілі"...
Ці думае яна:
"Ах, ён кахае, мяне кахае, я яго хачу,
хадзі хутчэй, хутчэй хадзі сюды"...
<u>Я думала пра ўсё гэта з усімі.</u>
Я ні пра што не думаю з табой.

Не хацелася б каментаваць гэтыя радкі Л. Сом, але не паказаць на іх было немагчыма, каб хоць падаць аўтару сігнал засцярогі ад сустрэчы з падобным у наступных яе кніжках (і ўвогуле на ўсе будучыя *крытычныя* часы яе творчасці), як, дарэчы, і з гэткай этычнай глухатою:

"...хочацца нетаропка кахацца,
звяраючы рытм з цыкадамі
і прыбоем,
лавіць адну за адной
хвалі чаканай асалоды,
задыхнуцца ад апошняй,
сумеснай,
і адразу заснуць на тваім плячы,
<u>плюнуўшы на ўсе гігіенічныя працэдуры</u>."

Агулам вымалёўваўся жывы і эмацыйна-трапяткі эратычны эцюд, каб не апошняе, няведама для чаго і для каго дапісанае, гэткае гідкае аўтарскае ўдакладненне... Я думаю, гэта ад празмерных амбіцый паэткі паказацца арыгінальнай і смелай — *па-мастацку эмансіпіраванай.* Як у таго У. Маякоўскага: *"Нате вам!.."* Прабачце, але нам якраз не трэба. Няхай бы гэта заставалася на бэжавай кухні.

Шкада, што пра адораную, цікавую паэтку даводзіцца пісаць і ў такім вось не пасуючым мне (і ёй) стылі. Ці не з гэтай прадчувальнай прычыны ў адным з вершаў, як мажлівы зварот да будучага рэцэнзента ці крытыка, яна папярэджвае:

Не пішы пра мяне нічога,
Бо нічога і не было...

І ўсё ж напрыканцы, прыпомніўшы свайго любімага І. Зыедоніса (*"Хочется белого-белого — // Лебедей"*), узнікае жаданне адстаронiцца ад усяго выпадковага і вульгарнага, каб яшчэ раз засведчыць асноўнае — пераважную прысутнасць светлых лірычных вершаў у гэтай кніжцы арыгінальнай паэткі. Яны складаюць аснову і папярэдніх зборнікаў Л. Сом.

Стрыманасць пачуццяў, чысціня мовы і свабода паэтычнага стылю — залог яе будучых літаратурных удач. Пра гэта яна ведае і сама, на гэта і настроена:

А за тое, што ты
Даў імя мне — зіма,
Даравала даўно,
Без абвесткі прычын.
У апошнюю ноч
Я з'яўлюся сама,
І прысутнасць сваю
Не азмрочу нічым.

Што ж, будзем чакаць. Чаканае здараецца. Ад выпадковага ж засцеражомся.

ЛеГАЛ

(legal@lim.by)

Самотнае рэха

У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылася прэзентацыя пасмяротнай кнігі "Голас" паэта з вёскі Федзькавічы Васіля Гадулькі. Гэта быў вечар-апавяданне пра тужлівы лёс творцы, пра яго трагічнае жыццё, якое прайшло ў адзіноце і безвыходнасці, пра талент, які напаўняў яго жыццё асаблівым сэнсам, але быў заўважаны толькі пасля смерці.

У гэтай прэзентацыі было штосьці нетыповае для падобных мерапрыемстваў. Напэўна тое, што на такіх вечарынах звычайна кажуць пра вынікі жыцця і творчасці аўтара, пра тое, што дасягнута. Тут жа было адкрыццё пакуль малавядомага паэта.

"Вершы Васіля Гадулькі з'яўляюцца прыкладам добрай класікі, чыстага, стылёва выверанага пісьма. У іх закладзена мудрасць, услаўленне чысціні чалавечай душы. На жаль, сёння такі час, калі паэзія такога кшталту не ў пашане, і толькі вузкае кола чытачоў можа яе ацаніць. Але, я думаю, Васіль Гадулька застанецца ў беларускай літаратуры, увойдзе ў яе класічныя аналы, як увайшлі калісьці П. Трус, У. Дубоўка, У. Жылка... Гэта паэт такога ж узроўню", — так бачыць ролю Васіля Гадулькі ў літаратурным працэсе Л. Галубовіч, укладальнік кнігі "Голас", што пабачыла свет у РВУ "Літаратура і Мастацтва " пры спонсарскай дапамозе фірмы "БелПІ" (Л. Дайнека з сынамі).

Прэзентацыя праходзіла ў танальнасці лёгкага смутку, і ўсё нагадвала пра тое, што жыццё аўтара ніколі не было вольным ад трагедыі. Л. Галубовіч распавёў, што ўпершыню пачуў пра Гадульку ў 1986 годзе ад паэта Васіля Сахарчука: "Ён таксама паўнапраўны герой гэтай сённяшняй вечарыны, бо клапаціўся пра літаратурную будучыню свайго старэйшага сябра больш, чым пра сваю. Ён змусіў Гадульку падрыхтаваць той самы рукапіс твораў, з якіх сёння і складзены зборнік "Голас". Жыццё В. Сахарчука таксама скончылася заўчасна. Гэта яшчэ адно абарванае звяно ў ланцугу трагедый вакол лёсу Васіля Гадулькі".

Адзін з лепшых твораў паэта, "Вянок санетаў" прысвечаны безадказнаму пачуццю. Паэтка Галіна Самойла , якая прыехала з Гродна, аспавяла пра яе знаёмства і эпісталярны дыялог з Васілём Гадулькам: "Мы пазнаёміліся на літаратурным семінары ў "Іслачы", мне адразу запалі ў душу яго вершы, у іх было такое тонкае і пранікнённае адчуванне прыроды, апісанне краявідаў. Пасля мы пачалі весці перапіску. У нас была даволі вялікая розніца ва ўзросце — дзевятнаццаць гадоў. Сёння мне падаецца, што я не ўсё разумела тады ў яго лістах. Ён адрасаваў іх не тагачаснай 25-гадовай дзяўчыне, а мне цяперашняй".

Разам з ціхімі лірычнымі разважаннямі ў зале гучалі і ўзрушаныя словы. Рускамоўны беларускі паэт Юры Сапажкоў паставіў В. Гадульку ў адзін рад з нацыянальнымі класікамі і выказаў суб'ектыўнае меркаванне, што ўзораў такога таленту ў сучаснай беларускай літаратуры пакуль няма.

А вось пісьменнік Алесь Наварыч зрабіў цікавыя лінгвістычныя высновы...

Выданне кнігі вершаў Васіля Гадулькі нібыта прымусіла голас паэта, які не было каму слухаць пры жыцці, загучаць цяпер, калі самога аўтара ўжо няма, — як самотнае рэха, што данеслася да нас праз гады.

Саша ДОРСКАЯ

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Леанід ГАЛУБОВІЧ
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Валерый ПІНЧУК
(адказны сакратар)
Мікола СТАНКЕВІЧ
(намеснік галоўнага рэдактара)
Ірына ШАЎЛЯКОВА

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-66-71
літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі— 284-44-04
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-66-71
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ"
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79

Індэкс 63856
Наклад 3630
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 25.04.2007 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 2237

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12